Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

№ 28 (28644)

9 ЛЮТАГА 2018 г.

ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

+TV ПРАГРАМА



**Чатыры скліканні — гэта не жарты**

МС



**Жанчына-кіраўнік і жанчына-кіроўца**

МС



**Уладзімір Варанкоў: Рамэа ў... 60**

СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

**40 %**

*складае на сёння ўзровень газіфікацыі насельніцтва сельскай мясцовасці краіны. Гэта ў 2,7 раза больш, чым у 2005 годзе, і ў 1,6 раза вышэй за ўзровень 2011 года. Усяго ў краіне газіфікавана прыродным газам 2,87 млн кватэр, у тым ліку ў сельскай мясцовасці — 422 тысячы. Па стане на 1 студзеня 2018 года ў Беларусі газіфікавана прыродным газам 118 раёнаў (100 %), 113 гарадоў (100 %), 88 пасёлкаў гарадскога, рабочага і курортнага тыпаў з 89 (99 %), 3135 з 23174 сельскіх населеных пунктаў (13,5 %). Працягласць сетак газазабеспячэння складае 59,98 тыс. км, у тым ліку 33,58 тыс. км (56 %) пабудавана ў сельскай мясцовасці.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.02.2018 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9980 ▲ |
| Еўра | 2,4509 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0346 ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0737 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ЗУБРЫНЫ ПЕРАПІС



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У ландшафтным заказніку «Налібоцкі» ўзімку адбываецца ўлік дзікіх жывёл, у тым ліку пагалоўя зубрынага статка. Інжынер-эколаг заказніка Ларыса КУЛАК і егер Сяргей БАЦЯН назіраюць за паводзінамі зуброў на падкормачнай пляцоўцы каля вёскі Белакорац Валожынскага раёна.**

■ Правілы даўгалецця

## «ДАСЯГНУЦЬ МОЖНА АМАЛЬ УСЯГО, КАЛІ ПАСТАВІЦЬ МЭТУ...»

**85-гадовая народная артыстка Беларусі, знакамітая балерына Ніна ДАВЫДЗЕНКА да гэтага часу працуе і кожную раніцу ўстае а палове шостай...**

**Балет увайшоў у жыццё нашай гераіні ў далёкім 1943 годзе. Уявіце сабе: мінулі найцяжэйшыя 41-ы і галодны 42-і гады, 10-гадовая Ніна з мамай толькі-толькі вярнулася ў Маскву пасля эвакуацыі ў Заволжа. У краіне на ўсю моц бушуе вайна, працягваецца блакада Ленінграда... А мама бярэ Ніну за руку і вядзе ў харэаграфічнае вучылішча пры Вялікім тэатры оперы і балета. І пасярод жудаснага ваеннага хаосу маленькая дзяўчынка пачынае вучыцца танцаваць...**

Яна на той момант ніякага ўяўлення не мела пра балет, ніколі яго не бачыла. І гэты даволі выпадковы выбар яе маці, незразумела чым прадыктаваны, але, пагадзіцеся, невытлумачальна цудоўны... Што гэта было? Легкадумнасць, невычэрпнае жыццялюбства, невынішчальная вера ў лепшае, у светлую будучыню, нягледзячы ні на што? Гэта ўжо не мае значэння — важна, што яе парыў душы ў рэшце рэшт стаў Ніниным лёсам.

СТАР. 5

■ Экспертыза

## «ГРАШОВЫ БОК» ДТЗ

### Чаму страхавога ліміту не заўжды хапае для кампенсацыі?

**Якія «падводныя камяні» ёсць у ацэнцы ўрону пасля дарожна-транспартнага здарэння? Чым можа скончыцца аварыя са, здавалася б, мінімальнымі наступствамі? Што чакае чалавека, які вырашыў не скардзіцца на няправільную паркоўку ў ДАІ, а «праўчыць» кіроўцу самастойна? Жыццёвых абставін, якія прыводзяць у ангар аўтатавараэнаўчай экспертызы, вельмі шмат. І здарыцца яны могуць не абавязкова з кіроўцам, але і нават з пешаходам. Кропкі над «і» карэспандэнт «Звязды» расставіў з дапамогай вядучага дзяржаўнага судовага эксперта аддзела аўтатаваразнаўчых экспертыз цэнтральнага апарата Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Руслана ЛІПНІЦКАГА.**

СТАР. 4



# НА ПРЫНЦЫПАХ ДОБРАСУСЕДСТВА

**Не толькі агульная мяжа, але і агульнае нядаўняе гістарычнае мінулае звязвае Беларусь і Латвію. У нашых сілах — не забываць пра гэта і выкарыстаць пакуль не цалкам рэалізаваны патэнцыял двухбаковага супрацоўніцтва нашых краін. Менавіта да гэтага Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заклікаў прэм'ер-міністра Латвіі Марыса Кучынскіса.**

«У нас з Латвіяй добрыя адносіны. Але мяне не пакідае думка пра тое, што яны могуць быць значна лепшыя. Мы шмат магчымасцяў не рэалізуем. І ў гэтым плане ваш візіт у Беларусь вельмі чаканы і значны», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён запэўніў, што, калі Латвія таго захоча, нашы краіны змогуць прасунуцца ў супрацоўніцтве па ўсіх кірунках — транспарце, лагістыцы, палітычных пытаннях, Усходнім партнёрстве, кантактах з Еўрапейскім саюзам.

«Пасля гэтага візіту мы шмат што можам зрабіць: вам толькі трэба пазбавіцца, напэўна, як і іншым, ад пачуцця, што мы ўжо занадта залежныя ад нашай брацкай Расіі і не здольныя рабіць пэўныя крокі без аглядкі. Вы ведаеце, мы прытрымліваемся практыкі і палітыкі нашым суседзям праблем не ствараць, — паведаміў беларускі лідар. — Мы з гэтага і зыходзім у адносінах да Літвы, Латвіі, Эстоніі».

Прэзідэнт згадаў савецкія часы, калі Беларусь і Латвія былі рэспублікамі ў межах адной дзяржавы. «Я як стаўіўся да Латвіі і лічыў яе не чужой мне краінай, так і зараз стаўлюся. Гэта не чужыя нам людзі, мы разам жылі. Больш за тое, мы суседзі і не маем прэтэнзій адзін да аднаго», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларуская эканоміка моцная, але не вынікі — гэта перш за ўсё рэалізацыя выпрацаванай прадукцыі. У нашым выпадку пастаўкі — пераважна — адбываюцца на расійскі рынак. Таму было б неразумна губляць яго. Да таго ж, Беларусь і Расію звязвае, перш за ўсё, еднасць паміж нашымі народамі. І калі і ўзнікаюць пытанні, то, хутчэй, паміж уладамі, а не грамадзянамі, якія традыцыйна ставяцца адзін да аднаго па-брацку. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што «нам трэба шырэй гандляваць, з усім светам, дзе мы патрэбныя».

Падчас сустрэчы асобна была закранута тэма будаўніцтва БелАЭС, якая, па словах Прэзідэнта, можа стаць агульным здабыткам краін рэгіёна. Кіраўнік дзяржавы падзякаваў латвійскаму боку за тое, што ён не крытыкуе Беларусь за будаўніцтва ўласнай атамнай станцыі. Прэзідэнт заклікаў скіраваць увагу ў бок таго, як яе разам надалей выкарыстоўваць. Да таго ж Беларусь зацікаўлена ў бяспецы сваёй атамнай станцыі больш, чым іншыя дзяржавы. «Мы нясём за гэта адказнасць», — запэўніў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы выказаў гатоўнасць Беларусі да эканамічнага (і не толькі) супрацоўніцтва па ўсіх кірунках, якія зацікавяць латвійскі бок. «Але прашу помніць пра адно: што мы ніколі не будзем сябраваць з любой краінай супраць Расіі, як і з іншымі краінамі супраць Латвіі. Мы жадаем, каб тут — у геаграфічным цэнтры Еўропы — былі мір і спакой. У гэтым плане вы можаце на Беларусь разлічваць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Марыс Кучынскіс адзначыў, што яго візіт мусіць надаць паскарэнне развіццю беларуска-латвійскага супрацоўніцтва, магчымасці якога сапраўды выкарыстоўваюцца не ў поўнай меры.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# СПРАЦАВАЛІ ЎДАЛА

**Ролю і значэнне Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта ў эканоміцы краіны неабходна ўзмацняць. Такую задачу кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка паставіў падчас рабочай сустрэчы з кіраўніком спраў Прэзідэнта Віктарам Шэйманам.**

«На гэта трэба арыентавацца. І ролю Кіраўніцтва справамі трэба павышаць. Гэта галоўная задача», — падкрэсліў беларускі лідар. Таксама абмяркоўваліся вынікі работы Кіраўніцтва справамі і падведамных прадпрыемстваў у 2017 годзе і перспектывы на будучы перыяд. Адзначана, што прадпрыемствы, якія ўваходзяць у структуру, паказалі добрую дынаміку, павысілася рэнтабельнасць у сельскагаспадарчым і прамысловым сегментах. Экспарт тавараў і паслуг у цэлым па Кіраўніцтве справамі летась вырас на 21,4 % у параўнанні з 2016-м. Дадатнае сальда знешняга гандлю павялічылася на 24 %.

Кіраўніку дзяржавы таксама далажылі аб планах па асваенні новых кірункаў у дзейнасці Кіраўніцтва справамі. Так, прапрацоўваецца пытанне пашырэння работы ў галіне фармацэўтыкі. Адпаведная тэматыка абмяркоўваецца з партнёрамі ў Індыі і Казахстане. Акрамя таго, разглежана пытанне стварэння прадпрыемства ў сферы электронных латарэй.

Віктар Шэйман далажыў Прэзідэнту аб рэфармаванні сельскагаспадарчага холдынга, які ўваходзіць у структуру Кіраўніцтва справамі, стварэнні таваразправоднай сеткі па пастаўках у расійскія рэгіёны мясной і малочнай прадукцыі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ПХЕНЬЯНЕ НАПЯРЭДАДНІ АДКРЫЦЦЯ АЛІМПІЯДЫ ПРАЙШОЎ НАПАЎЗАСАКРЭЧАНЫ ВАЕННЫ ПАРАД

Ваенны парад, прымеркаваны да 70-годдзя заснавання Карэйскай народнай арміі, адбыўся раніцай 8 лютага на плошчы імя Кім Ір Сена ў Пхеньяне. Замежныя каментатары асабліва адзначаюць той факт, што парад прайшоў напярэдадні адкрыцця зімовых Алімпійскіх гульняў у паўднёвакарэйскім Пхёнчхане.

Як паведамляе Bloomberg, у парадзе прыняло ўдзел каля 13 тысяч ваеннаслужачых і каля 110 адзінак рознай баявой тэхнікі. Такія высновы эксперты зрабілі на падставе спадарожнікавых здымкаў. За падзеямі назіралі 50 тысяч гледачоў.

Характэрна, што сродкі масавай інфармацыі КНДР нічога пра парад не паведамлялі, трансляцыі з яго не вялося, хоць цэнтральнае тэлебачанне краіны ў чацвер пачало сваё вяшчанне раней, чым звычайна, передае ТАСС.

Пакуль невядома, ці былі прадэманстраваны на парадзе ўзоры стратэгічнага ўзбраення, у прыватнасці, міжкантынентальныя балістычныя ракеты.

### СОРАС УКЛАЎ КАЛЯ 500 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ У КАМПАНІЮ ПА ЗРЫВЕ BREXIT



Вядомы амерыканскі мільярдэр Джордж Сорас патраціў больш за 400 тысяч фунтаў стэрлінгаў (прыблізна 550 тысяч долараў) на кампанію па захаванні Вялікабрытаніі ў Еўрасаюзе. Пра гэта паведамляюць The Guardian і Daily Express.

Як стала вядома, бізнесмен перадаў названую суму руху Best for Britain («Найлепшае для Брытаніі»), які выступае супраць Brexit. Арганізацыя (ёй кіруюць былы дыпламат і экс-міністр Марк Мэлах-Браўн і Джына Мілер), якая падала ў суд на ўрад за ініцыяванне выхаду краіны з ЕС, атрымала шасцізначную суму ад Сораса з моманту парламенцкіх выбараў, якія прайшлі ў чэрвені мінулага года.

Факт паступлення сродкаў ад Сораса пацвердзіў лорд Мэлах-Браўн. «Як і мільёны людзей, лічым, што Вялікабрытанія павінна весці за сабой, а не пакідаць Еўропу», — сказаў ён. Па словах кіраўніка руху, Best for Britain працуе з прадстаўнікамі бізнесу, прафсаюзамі, палітыкамі і грамадскімі групамі для таго, каб умацаваць кампанію.

Па словах кіраўніка Best for Britain, уклад Сораса важны, аднак ён з'яўляецца толькі адным з многіх. Раней мільярдэр не выключаў магчымасці таго, што Вялікабрытанія пасля Brexit зноў падасць заяўку на ўступленне ў ЕС.

### МАТЭМАТЫКІ ПРАДРАКЛІ БІТКОЙНУ ВЕЧНУЮ НЕСТАБІЛЬНАСЦЬ

Курсы крыптавалют, верагодна, ніколі не стабілізуюцца, мяркуюць матэматыкі з Пітсбургскага ўніверсітэта, ЗША. Вучоныя паспрабавалі вызначыць каштоўнасць біткойна, выкарыстоўваючы матэматычныя мадэлі, і прыйшлі да высновы, што рынак крыптавалют — класічная «мыльная бурбалка».

На іх думку, такі актыў, як біткойн, не мае каштоўнасці, якую можна вымераць традыцыйнымі метадамі. Яго кошт вызначаецца пакупнікамі, якія часта кіруюцца недакладным меркаваннем.

Як мяркуюць навукоўцы, біткойн можа быць «усяго толькі механізмам перадачы грашовых актываў».

Нагадаем, што біткойн 6 лютага патаннеў да 6 000 долараў, такой адзнакі крыптавалюта апошні раз дасягала ў лістападзе 2017 года, а ўжо 7 лютага курс зноў пачаў расці.

Reuters назвала апошні тыдзень студзеня найгоршым для біткойна з красавіка 2013-га: з 29 студзеня па 2 лютага ён страціў 30 працэнтаў кошту.

## Парламенцкі дзённік

# ДЗЕЙНІЧАЦЬ НА МЕСЦАХ

**Пытанні працаўладкавання сталі галоўнай тэмай абмеркавання на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях. Дэпутаты разам з прадстаўнікамі зацікаўленых міністэрстваў абмеркавалі палажэнні Дэкрэта № 1.**

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ** адзначыла, што скарачэнне занятых у эканоміцы хоць і працягваецца, але запавольваецца, што, назіраецца станоўчая дынаміка. «Мэта Дэкрэта № 1 — гэтую станоўчую дынаміку палепшыць», — падкрэсліла міністр. Па яе словах, пайшоў працэс актывізацыі на рынку працы, стала з'яўляцца больш вакансій.

У межах дзейнасці камісій, якія, паводле дэкрэта, ствараюцца на месцах, будзе праводзіцца і работа па растлумачэнні падатковага заканадаўства, па навучанні прадпрымальніцкай дзейнасці. Пра гэта паведаміла **намеснік міністра па падатках і зборах Святлана ШАЎЧЭНКА**. Таксама яна адзначыла, што летась больш за 19 тысяч чалавек звярнулася ў падатковыя органы па вяртанне збору, у выніку было выплачана каля шэсць мільёнаў беларускіх рублёў.

**Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Баляслаў ПІРШТУК** адзначыў, што ад дэпутатаў патрабуецца больш актыўная пазіцыя ў рэалізацыі дэкрэта ў жыццё. Перш за ўсё неабходна стварыць добрыя ўмовы і больш канкурэнтных рабочых месцаў. На наступным тыдні дэпутаты накіроўваюцца працаваць у сваіх акругах. Баляслаў Пірштук прапанаваў на месцах звярнуць увагу на тое, чаго не хапае, каб эфектыўна запрацавалі нарматыўныя дакументы, у тым ліку Дэкрэт № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва».

Галоўнае ў любым законе — гэта прымяненне на практыцы, лічыць **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Тамара КРАСОЎСКАЯ**. «Калі распрацоўваецца закон, ён заўсёды прэтэндуе на тое, што атрымае сваё працягласць». Таму пры стварэнні новай канцэпцыі дэкрэта ўлічвалі і работу дэпутатаў у акругах з грамадзянамі, і меркаванні саміх жыхароў.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

## Знешняя палітыка

# ДА ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ ПАРТНЁРАЎ

**Беларускія дыпламаты наведаюць Калумбію, Эквадор і ААЭ**

**Візіт намесніка міністра замежных спраў Яўгена Шастакова ў Калумбію і Эквадор адбудзецца з 12 па 16 лютага. Падчас паездкі запланаваны сустрэчы з прадстаўнікамі органаў кіравання і прадпрымальнікамі.**

— Гэтыя краіны — нашы перспектыўныя гандлёва-эканамічныя партнёры ў Лацінаамерыканскім рэгіёне. Беларускі бок ставіць перад сабой задачу нарасціць аб'ёмы і пашырыць наменклатуру паставак на іх рынкі. Цяпер наш экспарт у гэтыя краіны прадстаўлены ў асноўным угнаеннямі, металапрадукцыяй і нафтапрадуктамі, — паведаміў **начальнік упраўлення інфармацыі і лічбавай дыпламатыі — прэс-сакратар МЗС Дзмітрый МІРОНЧЫК.**

Тым часам і ў Абу-Дабі запланавана сустрэча паміж прадстаўнікамі МЗС Беларусі і міністэрства замежных спраў і міжнароднага супрацоўніцтва Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. Кансультацыі па палітычных пытаннях назначаныя на 14 лютага. Беларускую дэлегацыю ўзначаліць намеснік міністра Андрэй Дапкюнас.

На парадку дня — пытанні двухбаковага супрацоўніцтва, партнёрства ў міжнародных арганізацыях і рэгіянальнага ўзаемадзеяння.

Падчас брыфінгу ў МЗС Дзмітрый Міронак агучыў таксама параду суайчыннікам часова ўстрымацца ад паездак на Мальдывы. Улады Мальдыўскай Рэспублікі 5 лютага абвясцілі аб увядзенні надзвычайнага становішча тэрмінам на 15 дзён. Прычынай паслужылі беспарадкі ў сталіцы краіны Мале з-за абвастрэння палітычнага крызісу.

— Рэкамендацыя тлумачыцца яшчэ і тым, што на Мальдывах адсутнічае беларускае дыпламатычнае прадстаўніцтва. Найбольш блізкае пасольства нашай краіны знаходзіцца ў Нью-Дэлі. Ад яго да сталіцы Мальдываў прыкладна 2800 км. Да таго ж беларускае пасольства ў Індыі не акрэдытавана на Мальдывах. І яго магчымасці ўзаемадзеяння з уладамі гэтай краіны вельмі абмежаваныя, — адзначыў Дзмітрый Міронак.

**Марыя ДАДАЛКА**

# КАМПЕТЭНТНЫЯ АДКАЗЫ НА АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ

**Ва ўсіх рэгіёнах краіны 10 лютага пройдуць рэгулярныя прамыя тэлефонныя лініі з уладамі. Некаторыя праблемы кіраўнікі вырашаюць не паклаўшы трубку тэлефона, іншыя бяруць пад уласны кантроль.**

**Традыцыйна тэлефонныя лініі будуць працаваць з 9.00 да 12.00, на званкі адкажуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8-016 221 31 21;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8-021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8-023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ. Тэл. 8-015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Віктар Уладзіміравіч НЕКРАШЭВІЧ. Тэл. 8-022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8-017 500 41 60;

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8-017 222 44 44.

## Напярэдадні падзеі

# СУПРАЦЬСТАЯННЕ НЕ БУДЗЕ ЛЁГКАЕ

### Жаночая тэнісная зборная стартуе ў першым крузе розыгрышу Кубка Федэрацыі

**Здаецца, яшчэ ўчора мы ўсе разам перажывалі за нашых тэнісістак у фінале, а ўжо сёння яны рыхтуюцца пачаць усё спачатку. У саперніках у беларускіх дзяўчат зборная Германіі. Гульні пройдуць на «Чыжоўка-Арэне» 10 і 11 лютага.**



Немкі ўдзельнічаюць у Кубку Федэрацыі з самага першага розыгрышу турніру, гэта значыць з 1963 года. За 55 гадоў яны двойчы выйгравалі галоўны трафей, станавіўшыся чэмпіёнкамі ў 1987 і 1992 гадах. У мінулым сезоне зборная Германіі саступіла на аналагічнай стадыі (1-ы круг) з лікам 0:4 будучым пераможцам, камандзе ЗША. А ў матчы за права застацца ў васьмёрцы наймацнейшых камандаў свету немкі былі лепшыя за зборную Украіны (3:2).

Зараз саперніцы падапечных Эдуарда Дуброва займаюць шостае месца ў сусветным рэйтынгу. Беларусь, нагадаем, знаходзіцца на трэцім радку ў гэтым спісе. Адзначым, што раней каманды адна з адной не сустракаліся.

Пад кіраўніцтвам капітана зборнай Германіі Енса Герлаха згуляюць тры тэнісісткі — Таццяна Марыя, Ганна-Лена Фрыдзам і Ганна-Лена Грэнефельд.

*— Зборная Беларусі — гэта моцны апанент, нягледзячы на маладосць яе лідараў. Нічога дзіўнага ў добрых леташніх выніках беларусак асабіста для мяне не было, бо яны паказвалі пераканаўчы тэніс. Прычым звычайна асабліва добра беларускія дзяўчаты выступаюць у родных сценах,* — распавядае Енс Герлах. — *Зрэшты, мы ў Мінску не для таго, каб проста паціснуць рукі. Аддадзім на корце ўсе сілы і эмоцыі і, спадзяюся, пакажам сваю найлепшую гульню.*

Для нашай зборнай сезон 2017 года стаў найлепшым у гісторыі беларускага каманднага тэніса, дзяўчаты перамаглі моцных саперніц з Швейцарыі і Галандыі, што дазволіла ім дайсці да фіналу, і толькі там яны пацярпелі паражэнне ад амерыканак.

*— Для ўсіх нас гэта быў добры год. Цяпер мы — палепшаная версія леташніх. Хочам паказваць яксны тэніс і дамагацца найлепшага выніку,* — адзначыла напярэдадні матча з немкамі Аляксандра Сасновіч.

Капітан зборнай Беларусі зрабіў стаўку на гульцоў, якія выступалі ў мінулым сезоне, — Аляксандру Сасновіч, Арыну Сабаленку, Веру Лапко і Лідзію Марозаву.

*— У нашай падрыхтоўцы нічога не змянілася. На каго спадзяваліся ў адзіночных і парных паядынках раней, на тых разлічваем і зараз,* — расказвае Дуброў. — *Нямецкі калектыў не слабы, у ім ёсць вопытныя тэнісісткі, якія калісьці размяшчаліся ў топ-50 рэйтынга ВТА. І не трэба памыляцца: яны моцныя, як і раней. Мяркуючы па нашым вопыце ўдзелу ў Кубку Федэрацыі, узровень бакоў прыкладна роўны. Супрацьстаянне не будзе лёгкае, таму што адзіночны рэйтынг не да канца паказвае сілу гульцоў зборнай Германіі. Усё вырашыцца непасрэдна на корце. Гледзячы на трэніроўкі канкурэнтак, адчуваем, што гэта дысцыплінаваная, збалансаваная каманда. Не кажу, што ў нас іншая — як раз у плане самааддачы госці падобныя да нас. У Кубку Федэрацыі яны часам выступаюць лепш, чым у адзіночных турнірах.*

На перадматчавай прэс-канферэнцыі ўдзельнікі не маглі не закрануць тэму Вікторыі Азаранкі, бо яна ўжо вырашыла ўсе судовыя справы і магла б выйсці на корт.

*— Калі яна захоча падтрымаць дзяўчат, хай прыязджае. Аднак браць яе ў склад не быў гатовы. Азаранка паўгода не гуляла, на корце я яе не бачыў. Саша і Арына ўвесь час рухаюцца наперад, паказваюць вынікі. Гэта сведчыць аб мэтанакіраванай падрыхтоўцы. А што зараз адбываецца ў Вікі, я не ведаю,* — адзначыў капітан каманды.

Заўважым, што букмекеры ўпэўнена прадказваюць перамогу зборнай Беларусі, бо за іх гуляе рэйтынг, дамашні стадыён і нядаўні вопыт выступлення ў фінале Кубка Федэрацыі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

## Надвор'е

# А СНЕГ УСЁ ІДЗЕ...

**У выхадныя ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будуць вызначаць атмасферныя франты ад цыклону, які будзе кружыць над Украінай. Чакаецца слабамарознае з ападкамі ў асноўным у выглядзе снегу надвор'е, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Фота БЕЛТА.

Сёння ўдзень будзе воблачнае надвор'е. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе снег, днём па паўднёвым усходзе — мокры снег, месцамі чакаецца наліпанне мокрага снегу. У асобных раёнах прагназуецца слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень ад мінус 4 да плюс 1 градуса. Атмасферны фронт будзе гаспадарыць у нас і ў суботу, калі на большай частцы краіны выпадзе кароткачасовы снег і мокры снег. У асобных раёнах Беларусі чакаюцца туман, слабы галалёд, на дарогах месцамі захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 6 да 0 градусаў, удзень — ад мінус 4 да 1 цяпла.

У нядзелю яшчэ будзе адбівацца ўплыў франтальных раздзелаў, якія паступова сыдуць на паўночна-ўсходнія рэгіёны краіны. Уначы ў многіх раёнах, а ўдзень — пераважна па паўночным усходзе пройдзе невялікі кароткачасовы снег. Месцамі чакаюцца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 7 марозу, удзень будзе ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла.

Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі айчынных спецыялістаў, у панядзелак Беларусь апынецца пад уплывам вобласці павышанага атмасфернага ціску, сфарміраванага ў вільготнай паветранай масе. Ізноў у асобных раёнах краіны — кароткачасовы снег. Месцамі чакаецца туман, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 3—9 градусаў, пры праясненнях паветра месцамі астудзіцца да 12 марозу, тэмпература ўдзень складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

## Абітурыент-2018

# ЦТ ФІНІШУЕ 10 ЛІПЕНЯ

**Пастановай Міністэрства адукацыі зацверджаны графік правядзення ў 2018 годзе цэнтралізаванага тэсціравання.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЦТ распачнецца ў аўторак 12 чэрвеня з выпрабаваннямі па беларускай мове, 14 чэрвеня пройдуць тэсты па рускай мове, 16 чэрвеня — па грамадазнаўстве, 18 чэрвеня — па матэматыцы, 20 чэрвеня — па біялогіі, 22 чэрвеня — па замежных мовах (англійскай, нямецкай, французскай, іспанскай, кітайскай), 24 чэрвеня — па хіміі, 26 чэрвеня — па фізіцы, 28 чэрвеня — па гісторыі Беларусі, 30 чэрвеня — па геаграфіі. Завершыцца ЦТ 2 ліпеня экзаменам па сусветнай гісторыі найноўшага часу. Пункты правядзення ЦТ пачнуць выдаваць абітурыентам сертыфікаты з 10 ліпеня.

Таксама пастановай міністэрства вызначаны графік правядзення цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовыя дні. Пад яго бранiруюцца тры дні — 6, 8 і 10 ліпеня, а месцам правядзення вызначаны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

Тэрміны рэгістрацыі абітурыентаў для праходжання ЦТ у рэзервовыя дні — з 30 чэрвеня па 3 ліпеня. Сертыфікаты тым, хто будзе здаваць у гэты тэрмін, будуць выдавацца з 13 ліпеня.

База даных абітурыентаў фарміруецца з дапамогай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы «Агульнарэспубліканскі банк даных удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання». Абітурыенты размяркоўваюцца па аўдыторыях у пунктах правядзення цэнтралізаванага тэсціравання з выкарыстаннем спісаў абітурыентаў, складзеных метадам выпадковага выбару.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

## Факт

### ПАЛІВА НА АЗС ПАДАРАЖЭЛА НА ДЗВЕ КАПЕЙКІ

**У Беларусі з учарашняга дня змяніліся рознічныя цэны на аўтамабільнае паліва.**

Як растлумачылі прычыны ў канцэрне «Белнафтахім», у сувязі са значным ростам кошту нафты і павелічэннем з 1 лютага ставак акцызаў на нафтапрадукты рознічныя цэны на аўтамабільны бензін і дызельнае паліва з 8 лютага на АЗС краіны павялічваюцца на дзве капейкі, або ў сярэднім на 1,6 працэнта. Кошт бензіну АІ-92-К5-Еўра складае цяпер BYN1,21, АІ-95-К5-Еўра — BYN1,29, АІ-98-К5-Еўра — BYN1,5, ДП — 1,31.

Кошт аўтамабільнага паліва на АЗС Беларусі па-ранейшаму застаецца самым нізкім у Еўропе. З улікам змянення цэн, якое адбылося на беларускіх АЗС, рознічныя цэны на маторнае паліва ў сумежных рэгіёнах Расіі вышэйшыя за беларускія па бензінах на 12 %, па дызельным паліве — на 9 %, на ўкраінскім рынку — на 48—63 %.

### МАРЫХУАНА Ў... ТРОХЛІТРОВІКАХ

**Супрацоўнікі аддзялення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі Першамайскага РУУС сталіцы разам з АМАП ГУУС Мінгарвыканкама па месцы жыхарства па вуліцы Азёрнай затрымалі 43-гадовага непрацуючага мінчаніна, які займаўся вырошчваннем і продажам марыхуаны.**

Было ўстаноўлена, што ён вырошчваў яе на ўласным зямельным участку каля дома, дзе пражываў. Затым высушваў для наступнага спажывання і продажу. Падчас вобыску было знойдзена і канфіскавана больш за 600 грамаў марыхуаны і электронныя вагі. Зламыснік захоўваў наркатычнае рэчыва ў трохлітровых слоіках. Таксама былі канфіскаваны падрыхтаваныя да продажу пачкі ад запалак, запоўненыя марыхуанай. Затрыманаму пагражае пазбаўленне волі на тэрмін ад 8 да 15 гадоў з канфіскацыяй або без канфіскацыі маёмасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

ГИРИЗ ООО «ГИРИЗ»
ГИДРАВЛИКА: гидроцилиндры, насосы, распределители
РВД и комплектующие
Напорные рукава и шланги
Техпластины
Ремонт гидравлических узлов
ДОСТАВКА ПО ВСЕЙ БЕЛАРУСИ
Самые конкурентные цены
В НАЛИЧИИ МНОГО ТЕХНИКИ ПО ЦЕНАМ ВЕСНЫ 2017 ГОДА
Плуги, бороны, прицепы и полуприцепы. Запчасти к ним.
ВОЗМОЖЕН РАСЧЕТ ВСТРЕЧНЫМИ ПОСТАВКАМИ, ДОГОВОРАМИ ПЕРЕВОДА ДОЛГА.
+375 44 765 08 65 г. Заславль, ул. Советская, 122, каб 126
girza.by
УНП 691586696



# «ГРАШОВЫ БОК» ДТЗ

## Эканомія не на карысць

**— Для чаго патрэбна аўтатаваразнаўчая экспертыза?**

— Асноўныя пытанні, на якія мусіць даць адказ эксперт, — гэта высветліць аб'ектыўны кошт транспартнага сродку, вызначыць памер шкоды пры яго пашкоджанні і суму, на якую пацягне аднаўленчы рамонт.

**— ДТЗ, як вядома, адбываюцца розныя. Але знаходзяцца і страхавыя махляры, якія спрабуюць атрымаць грошы за ДТЗ, якога не адбылося....**

— Быў у нас такі выпадак з Mercedes-Benz ML. Аўто было нібыта пашкоджана. Страхавая кампанія выплаціла грошы па памеры заяўленага ўрону, аднак пасля яе спецыялісты вырашылі ўсё ж звярнуцца ў следчыя органы. І, як пасля высветлілася, ні ў якім ДТЗ машына не ўдзельнічала. Таксама мы сутыкаліся з тым, што на спраўны аўтамабіль навешвалі пашкоджаныя часткі з іншай машыны.

Але страхавое махлярства можа выглядаць і па-іншаму. Некаторыя грузаперавозчыкі, накіроўваючы аўто ў Расію, хочуць сэканоміць. Кіраўніцтва кажа кіроўцу, маўляў, едзь купі і страхоўку менавіта там, бо гэта абыдзецца танней. Кіроўца, доўга не думаючы, набывае поліс у якім-небудзь кіёску. Так праходзіць месяц, другі — і кіроўца трапляе ў ДТЗ. Пачынаецца разбор і аказваецца, што... гэты поліс натуральна, ніякіх грошай па страхоўцы кампанія таксама не атрымае. Таму ці варта аўчынка вырабу?

## Як рамонт аказаўся «залатым»

**— У Беларусі ўжо восьмы год дзейнічае магчымасць складання еўрапратакола. Скажам, калі пашкоджанні пры дробным ДТЗ не перавышаюць 400 еўра, то вінаўнік здарэння і пацярпелы могуць абысціся без выкліку ДАІ. Але ці ўсё так добра?**

— Сапраўды, не заўжды відаць усе пашкоджанні пасля ДТЗ, якія можна лёгка зарэгістраваць. Скажам, утварыўся ў нас на дарозе класічны «паравозік» — машына, якая ехала ззаду, тыцнулася ў бампер аўтамабіля наперадзе. Кіроўцы думаюць, што пашкоджаны толькі бампер, крыху падрапаны перад аўто — і ўсё.

А вось у сэрвісным цэнтры высвятляецца, што пашкоджанняў насамрэч значна больш. І ўжо не факт, што яны ўпішуцца ў ліміт па еўрапратаколе.

Паказальная гісторыя здарылася некалькі гадоў таму, праўда, яна не датычыцца еўрапратакола. Муж і жонка — пенсіянеры — ехалі на даволі бюджэтным аўтамабілі, кіроўца замарудзіўся на скрыжаванні і тыцнуўся ў заднюю частку Bentley. Хуткасць была невысокая, пашкоджанні аказаліся на першы погляд невялікія — падрапаны бампер, задняе крыло... Яны падумалі, што ўкладуцца ў страхавы ліміт, які складае 10 тысяч еўра. Хваляваліся не сталі. І на агляд аўтамабіля таксама не прыехалі. А дарма...

Мінула недзе каля года. Раптоўна раздаўся званок у дзверы. Паштальён прынёс заказны ліст. Аказалася, што гэта вестка са страхавой кампаніі. Яна прасіла даплаціць за рамонт таго самага Bentley... прыкладна 13 тысяч еўра. У выпадку адмовы яна абяцала падаць рэгрэсны іск. Пенсіянерам стала кепска. Яны не разумелі дзве рэчы. Па-першае, дзе ўзяць такую процьму грошай? Падругое, чаму, здавалася б, за дробны рамонт трэба плаціць так шмат?

Сам па сабе механізм страхавой выплаты просты. Гаспадар застрахаванага транспартнага сродку пасля ДТЗ законна звяртаецца ў страхавую кампанію аб забеспячэнні выплат, якія вернуць нанесеную яму шкоду. Страхавая кампанія, якая ўзяла раней на сябе абавязацельствы, павінна аплаціць патрэбную суму. Калі ДТЗ адбылося па віне застрахаванай асобы, страхавая кампанія выплачвае шкоду пацярпеламу — тут усё лагічна. Але вось тут і пачынаецца самае цікавае. Здараецца так, што суму, якую кампанія выплачвае, пакрываючы доўг, значна перавышае тую, на якую складзены дагавор з застрахаваным грамадзянінам. Для таго каб вярнуць розніцу, выплачаную звыш страхавой сумы, кампанія і падае рэгрэсны іск менавіта на вінoўніка ДТЗ.

Пасля высветлілася, што той Bentley рамантавалі ў Польшчы. Памянялі там бампер, накладкі, парктронікі, пафарбавалі бакавіну... Але, напрыклад, каб правесці работы над заднім крылом, трэба было выразаць шкло. Прычым назад яго паставіць нельга, патрэбна выключна новае. Вось так і набегла велізарная сума...

## Чым большы знос, тым меншая выплата

**— Якія памылкі допускаюць людзі пры афармленні шкоды за наступствы аварый?**

— Часта вінoўнікі і пацярпелыя ў ДТЗ проста не з'яўляюцца на экспертны агляд. Хаця, здавалася б, гэта павінна быць у іх жа інтарэсах, каб працілеглы бок «не павесіў», як кажуць, «усіх сабак». Даказаць пасля рамонту, адкуль узяліся пашкоджанні — да **вас** ці пасля вас, — **будзе** амаль немагчыма. А так ёсць магчымасць вырашыць усе пытанні, як кажуць, на месцы. Навошта ад яе адмаўляцца?

**— Ці ўплывае знос запчастак на ацэнку шкоды ад ДТЗ?**

— У любым выпадку вы зможаце спагнаць з вінаватага не поўны кошт аднаўленчага рамонту, а толькі суму за вылікам зносу запасных частак. Скажам, у ДТЗ вам разбілі бампер і шкло. І калі паставіць новыя запасныя часткі, то кошт рамонту будзе складаць умоўныя 4000 рублёў. Але калі дэталі ўжо эксплуатаваліся шмат гадоў, то кампенсацыя будзе ўжо меншай. І не пазбаўляйцеся ад пашкоджаных запасных частак пасля рамонту. Хто ведае, можа, вінoўнік ДТЗ будзе незадаволены выстаўленым рахункам і паспрабуе падаць у суд, каб высветліць сапраўдны памер нанесенай шкоды. А так рэчавы доказ дазволіць вам адстаяць ваш пункт гледжання.

Многія аўтамабілі ў Беларусі ездзяць з пратэрмінаваным тэхнічным аглядам. Трапляліся такія і на разбор да нас. І калі, напрыклад, у аварыі цярпела моцна саржавелае крыло, з якім тэхагляд ніяк не мог быць пройдзены, то эксперты не маглі ацаніць у такую мізэрную суму, што пацярпеламу ў ДТЗ фактычна даводзілася аплачваць значную частку выдаткаў па ліквідацыі шкоды са сваёй кішэні.



Фота БЕЛТА.

Ды і сама кампенсацыйная сума розніцца па-рознаму. Напрыклад, возьмем Porsche Cayenne і Volkswagen Touareg — машыны падобныя, але кошты на запчасткі будуць розныя. Таму не заўжды можна спадзявацца на тое, што страхавога ліміту хопіць для кампенсацыі шкоды.

## «Мастацтва» з крымінальным наступствам

**— У зводках навін з зайздроснай рэгулярнасцю трапляюцца матэрыялы пра тое, што кіроўцу вырашылі «адпомсціць» за няправільную паркоўку і нешта зрабіць з яго аўтамабілем. Што чакае ў такім выпадку «народных мсціўцаў»?**

— Скажам, калі незадаволены паркоўкай чалавек вырашыў «разабрацца» з кіроўцам і правёў ключыкам драпіну па корпусе ажно да металу, то прыбраць яе будзе значна цяжэй. Быў у нас выпадак, калі адзін чалавек нападпітку падрапаў гвоздзікам тры машыны. І «намаляваў» ён у выніку на крымінальную адказнасць, якая пачынаецца ад 40 базавых велічынь.

Ці вось згадваецца яшчэ адзін выпадак — жанчынекіроўцу на новым дарагім BMW намазалі на шкло сілікатны клей. І ён упітаўся так, што давялося шкло мяняць. Зноў жа, справа скончылася крымінальным пераследам. Здавалася б, што тут можа пацягнуць на 40 базавых? Хапіла б і адміністрацыйнай адказнасці... Справа ў тым, што шкло ў сучасных аўтамабілях зусім не тое, якое было два-тры дзесяцігоддзі таму. Там ёсць і дадатковыя элементы — напрыклад, вельмі тонкія ніці падагрэву. Іх няўзброеным вокам не відаць, але пры замене шкла сума атрымаецца даволі кругленькая. Так і выйшла ў той гісторыі з BMW.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды сроком на 3 (три) года помещения площадью 92,6 кв. м, принадлежащего УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги»**

| **Лот № 1.** Право заключения договора аренды помещения площадью 92,6 кв. м в здании административно-хозяйственном с инв. № 400/С-92074, 1910 г. п. Число этажей – 1. Составные части и принадлежности: пристройка Б1/б, пристройка В1/б. Адрес: Гродненская обл., г. Гродно, ш. Озерское, 6А | Начальная цена продажи Лота № 1, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Размер арендной платы в месяц, базовых арендных величин |
|---|---|---|---|
| | 351,88 | 35,19 | 27,78 |

Капитальное строение с инв. № 400/С-92074 расположено на земельном участке площадью 0,5508 га с кадастровым номером 440100000002006122. Целевое назначение земельного участка: земельный участок для содержания и обслуживания здания конторы. Право постоянного пользования. На земельном участке расположены иные объекты, не выставляемые на аукцион. Арендатор вправе пользоваться земельным участком в пределах, необходимых для использования и свободного доступа к арендуемому имуществу, без проведения каких-либо строительно-монтажных работ на нем

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот № 1 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор аренды Объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Лота № 1 в течение 3 (трех) банковских дней с назначенной даты проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.
Целевое назначение – размещение складских, производственных, офисных помещений.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.
Цена продажи Лота не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством Республики Беларусь

Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом». Базовая арендная величина равна 15 руб. 20 коп.

Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 составляет 1 000, 00 белорусских рублей

**Аукцион состоится 12.03.2018 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. Прием заявлений с даты публикации извещения в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу Организатора аукциона: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 06.03.2018 в 11.00.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже права заключения договора аренды помещения, принадлежащего УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги», проводимом 12 марта 2018 г.
Все желающие могут ознакомиться со сдаваемым в аренду имуществом. Контактное лицо: Врубель Светлана Анатольевна, тел. 8 (0163) 49-51-46

**Организатор аукциона, адрес: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 3-й этаж, тел.: +375 17 306-00-57; +375 29 550-09-52; + 375 29 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

**Извещение о проведении 28 февраля 2018 года повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, местонахождение продаваемого имущества)** | Капитальное строение с инвентарным № 630/С-38483 (маслосклад), назначение – здание специализированное для органов государственного управления, обороны, государственной безопасности) общая площадь 340,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Молодечно, военный городок № 16 |
| **Начальная цена** | 11 664,00 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 1 166,00 бел. руб. |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион проводится 28 февраля 2018 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 09.02.2018 по 23.02.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36, (017) 327-40-22 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости».

В связи с переходом Первичной профсоюзной организации Минского городского управления Департамента государственной инспекции труда Министерства труда и социальной защиты Республики Беларусь Белорусского профсоюза работников строительства и промышленности строительных материалов в Белорусский профсоюз работников государственных и других учреждений (протокол № 5 от 26.12.2017) **Первичная профсоюзная организация Минского городского управления Департамента государственной инспекции труда Министерства труда и социальной защиты Республики Беларусь Белорусского профсоюза работников строительства и промышленности строительных материалов прекращает деятельность**.

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 (двух) месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220004, г. Минск, пр. Победителей, 23, корп. 3»

УНП 102387433

**26 февраля 2018 г. в 14.00 в ОАО «Торфобрикетный завод Дитва» (Гродненская область, Лидский район, аг. Дитва, ул. Первомайская, 3 состоится повторный аукцион по продаже комплекса зданий (здание пилорамы, здание склада)**

Начальная цена аукциона – 65 600 рублей.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **23 февраля 2018 г. до 17.00**.

**Повторный аукцион состоится** по адресу: Гродненская область, Лидский район, аг. Дитва, ул. Первомайская, 3.

Дополнительная информация по телефону 8 0154 577-650 с 8.30 до 16.30.

УНП 500051993

# «ДАСЯГНУЦЬ МОЖНА АМАЛЬ УСЯГО, КАЛІ ПАСТАВІЦЬ МЭТУ...»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А ў 1952 годзе, пасля заканчэння вучобы Ніна Давыдзенка прыязджае ў Мінск (дарэчы, яе бацькі з Беларусі, і сама яна нарадзілася ў Віцебску, але потым сям'я пераехала ў Расію: спачатку ў Ленінград, потым у Растоў-на-Доне, а ў 1939 годзе ў Маскву) працаваць у Дзяржаўны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета БССР, і з гэтага часу практычна ўсё яе жыццё будзе звязана з гэтым тэатрам. Тут яна танцавала крыху больш за два дзесяцігоддзі, стала вядучай салісткай, станцавала ўсе класічныя балеты, якія ішлі ў тэатры, атрымала званне заслужанай, а потым народнай артысткі Беларусі. А пасля сыходу са сцэны засталася працаваць тут жа педагогам-рэпетытарам... І да гэтага часу, у свае 85 гадоў працуе — выкладае класічны танец у харэаграфічнай гімназіі-каледжы.



## Як жыць ярка?

...У вестыбюлі навучальнай установы нас з фотакарэспандэнтам сустракае мініяцюрная жанчына з жывым, ясным позіркам, які робіцца прамяністым, калі яна ўсміхаецца. Час робіць адзнакі на ўсім жывым і нікога не абыходзіць сваёй увагай, і самыя бліскучыя балерыны рана ці позна сыходзяць са сцэны, але балетнае мінулае адчуваецца ў Ніне Сцяпанаўне дагэтуль — у ідэальна роўнай спіне і прыгожай пластыцы рук, і яшчэ ў чымсьці няўлоўным (можа, ва ўнутранай сабранасці?). Мы пачынаем размаўляць — пра яе жыццё і пра ўсё на свеце. Гаворым пра кафэ-марожаныя ў Маскве пачатку 50-х («Я па 900 грамаў марожанага там з'ядала, калі вучылася, якое яно тады было смачнае!» — успамінае, смеючыся, Ніна Сцяпанаўна), пра змяненне клімату і раставанне снягоў на полюсах, пра інтэрнэт і тэлебачанне, пра навуку і пра Настассю Валачкову, нават пра самагубцаў і вялікі цуд жыцця... Ну і, зразумела, пра балет.

І мне хочацца прывесці зараз фрагменты размовы са сваёй знакамітай суразмоўцай і нейкія моманты, якія я вырашыла абазначыць (можа, залішне смела?) як правілы, магчыма, высновы — як жыць плённа, доўга, ярка — і быць шчаслівым.

Такім чынам...

## Знайсці сваю справу

«Дасягнуць можна амаль усяго, усё можна развіць, нават калі і няма нейкіх асаблівых задаткаў, калі прырода і недадала штосьці — гэта я ведаю дакладна. Але трэба паставіць мэту і пастаянна працаваць над ёй. Я, напрыклад, калісьці паставіла перад сабой мэту стаць не проста балерынай, а вядучай салісткай, танцаваць галоўныя партыі — і дасягнула гэтага.

...І зараз пастаянна кажу сваім вучаніцам, што ў іх павінна быць мэта ў жыцці. Навошта вы прыйшлі ў балет? Да чаго імкняцеся? Чаго хочаце: проста танцаваць у кардэбалеце ці чагосьці большага?»

«Калі я вучылася ў Маскве, шмат хадзіла на пастаноўкі драматычных тэатраў, і цяпер прывіваю гэта сваім вучням. Бо ў балеце трэба не толькі танцаваць — неабходна быць выразным, несці вобраз, быць артыстам. Гэта майстэрства трэба ўбіраць у сябе, наведваючы драматычныя спектаклі. І трэба абавязкова хадзіць у філармонію, каб навучыцца адчуваць усе нюансы музыкі...»

Балет — гэта неверагодна прыгожа, але за кулісамі ёсць тое, чаго не бачаць гледачы — разбітыя ў кроў пазногці на нагах, сцёртыя пальцы, болі ў мышцах... Вельмі хутка зношваюцца суставы, таму балерыны рана сыходзяць на пенсію. «А яшчэ большыя нагрузкі — на нервовую сістэму, — дадае Ніна Сцяпанаўна. — З-за дзікага хвалявання перад выхадам на сцэну, поўнай эмацыянальнай аддачы падчас спектакля... Але з балета яшчэ ніхто не сыходзіў, ніхто не кідаў яго па сваёй волі. Таму што ён зацягвае. Нягледзячы на пот, боль, каласальныя нагрузкі... Ён дорыць нейкі асаблівы ўнутраны стан, гэта цяжка растлумачыць... Дзіўныя, незабыўныя эмоцыі... А пачуццё, калі ты пасля спектакля стаіш на паклоне, непараўнальна ні з чым!»

...Напэўна, гэта датычыцца любой любімай справы, калі займацца ёю з поўнай самааддачай: яна многага патрабуе, але пры гэтым дае яшчэ больш.

## Быць заўсёды ў форме

Нельга ўзяць і навучыцца танцаваць раз і назаўжды. Неабходна пастаянна падтрымліваць форму і ўдасканальваць майстэрства. Ніякае натхненне не дапаможа зрабіць 32 фуэтэ, а вось даведзены да аўтаматызму кожны рух — дапаможа.

«Калі дазволіш сабе расслабіцца, на наступны дзень танцаваць ужо нашмат цяжэй, адчуванні ад мышцаў зусім іншыя, — кажа Ніна Сцяпанаўна. — Значыць — нельга прапусціць ні дня! Даганяць потым вельмі складана, мышцы хутка «распускаюцца», іх трэба ставіць на месца. Таму ў многіх балерын няма дзяцей. Я сама праз тры месяцы пасля нараджэння сына ўжо танцавала «Спячую прыгажуню». Мне было тады 28 гадоў, я хутка ўвайшла ў норму...»

Ніне Давыдзенцы было не займаць працавітасці. На сайце гісторыка і тэатральнага крытыка Дзяніса Марціновіча прыводзіцца ўспамін вядомага даследчыка балета Юліі Чурко: «Нават самыя працаздольныя не маглі ўгнацца за ёй (*Нінай Давыдзенкай.* — ***заўв. аўт.***) у той сапраўды астранамічнай колькасці паўтораў кожнага па, з дапамогай якіх яна дамагалася лёгкасці і чысціні іх выканання. Менавіта яна даўжэй за ўсіх заставалася ў балетнай зале, гэта яна карысталася любой магчымасцю, каб лішні раз зрабіць з партнёрам цяжкую падтрымку, выканаць піруэты, прайсці варыяцыю...»

І цяпер яна працуе, хоць і прызнаецца: «Вельмі стамляюся. Часам бывае: надакучыла ўсё, не хачу! Але ўстаю ранкам, таму што трэба: у мяне ёсць урок, я павінна быць у форме. І ёсць яшчэ нешта... Вось мае дзяўчынкі робяць рух, а я кажу: «Лапатку трымай! Руку пацягні!» — і сама ва ўяўленні ўсё гэта раблю, працуе нешта такое ўнутры, не ведаю, як гэта растлумачыць... Калі рыхтую варыяцыі, якія сама калісьці танцавала, успамінаю нюансы — гэта ўсё ўнутры вельмі моцна пражываецца, на ўзроўні пачуццяў. І, напэўна, дапамагае. Адна мая сяброўка, якая таксама калісьці танцавала ў балеце, увесь час кажа: «Навошта ты працягваеш працаваць? Табе ўсё роўна ніхто помнік не паставіць!» Адказваю: «Я не з-за помніка прыходжу на работу. Проста я ў руху, я патрэбная, у мяне ёсць зносіны з людзьмі, я адчуваю амаль тыя ж хваляванні і пачуцці, як калісьці... І я так люблю гэтыя моманты, калі іграе канцэртмайстар! Падпарадкоўваюся мелодыі, апынаюся ва ўладзе музыкі... Я ўпэўнена: лепш быць танкаскурым чалавекам, і ярка, востра адчуваць прыгажосць мастацтва і жыцця...»



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## Навучыцца атрымліваць асалоду ад працы

«Наша прафесія цяжкая, у ёй вельмі цяжка ўвайсці і застацца. Збоку можна падумаць: і навошта людзі ў яе ідуць, навошта ім гэта трэба? Але для некаторых у гэтым і заключаецца сэнс. Быць у расслабленасці — хіба ж гэта паўнавартаснае жыццё? Вось калі ты працуеш над сабой, пераадольваеш сябе, тады ў момант, калі можаш адпачыць, ты па-сапраўднаму, у поўную моц адчуваеш гэтую асалоду ад расслабленасці, а ўвесь час жыць так — гэта не тое, і задавальненне ад гэтага таксама не тое...»

Заняткі ў харэаграфічнай гімназіі-каледжы пачынаюцца ў 8.30. Ніна Сцяпанаўна падымаецца а палове шостай. «Каб паспець прывесці сябе ў парадак», — тлумачыць.

Ужо шмат гадоў кожны дзень адразу пасля абуджэння яна выконвае цэлы комплекс, распрацаваны самастойна, які складаецца з самамасажу, кропкавага масажу, фізічных практыкаванняў і расцяжкі. Нейкія парады ўзяла з кніг, штосьці пачула ў перадачах, прысвечаных здароўю, па тэлевізары. «Трэба прывесці сябе ў тонус, прымусіць мышцы папрацаваць. Вось гэтая мышца (паказвае на сцягно ззаду) — гэта фактычна наша другое сэрца, яе абавязкова трэба распрацоўваць. На ёй, між іншым, і ўвесь балет выбудаваны... Я прапрацоўваю і кожны пальчык на нагах. А сплю, між іншым, усё жыццё галышом, ніякіх начных кашуль! Гэта я ўзяла ад ёгаў. Потым, калі ўстаю і апранаю халат, абавязкова адчыняю дзверы на балкон і дыхаю па Парфірыю Іванову: «ем паветра» — і так 20 разоў.

...Кармлю кошак і іду ў душ. У ванным пакоі стаіць літровая бутэлька з адмысловым растворам (на літр вады дзве сталовыя лыжкі солі і сталовая лыжка воцату). Пасля душу абліваю сябе ім, бяру жорсткую шчотку і шарую ўсё цела так, каб гарэла. І ніколі не выціраюся! Усё гэта дае бадзёрасць. Я гадоў 50 ужо так раблю. І хварэю на прастуду вельмі рэдка, у тым ліку дзякуючы гэтаму, я думаю».

Сняданак у Ніны Сцяпанаўны мініяцюрны. «Звычайна гэта кава з вяршкамі, варанае яйка і кавалачкі тры белага хлеба, — кажа яна. — Апошнім часам куплю не белы хлеб, а французскі, ён цяпер прадаецца ў нашай булачнай каля дома — там няма цукру. Дазваляю сабе трохі масла. На наступны дзень мой сняданак можа складацца толькі з кубачка кавы і некалькіх лустачак сыру — і ўсё. Ніякіх каш я не ем і ніколі не ела. Часам раблю сама тваражок... У цэлым, стараюся есці менш мяснога і салодкага, хоць вельмі люблю піражныя. Але я не фанатка ў гэтых пытаннях, часам па нядзелях дазваляю сабе піражнае...»

«Усё ем без хлеба, раней наогул не магла дазволіць сабе нічога мучнога. Калі танцавала, увечары, натуральна, нічога не ела, і пасля спектакля таксама. Некаторыя балерыны вячэралі пасля спектакля, а мне толькі вельмі хацелася піць. Усё было падпарадкавана балету...»

## Прымаць любы ўзрост з удзячнасцю

Артысты балета рана сыходзяць на пенсію — у 39 гадоў, праз 20 гадоў працы на сцэне. Многія перажываюць гэта вельмі балюча... «Я пайшла зусім спакойна, таму што падрыхтавала сябе да гэтага, загадзя сябе настройвала, што трэба сысці своечасова, — успамінае Ніна Сцяпанаўна. — Але засталася працаваць у тэатры рэпетытарам: рыхтавала артыстаў для сцэны. Потым 10 гадоў выкладала танец оперным спевакам у кансерваторыі, таму што яны таксама павінны валодаць прыгожай пластыкай. Я жыву на вуліцы Чычэрына, побач з оперным тэатрам. Калі іду на метро, часам сустракаю сваіх былых вучняў. Усе яны ўжо атрымалі званні...»

«Цяпер у мяне выпускны клас у харэаграфічнай гімназіі-каледжы. Рыхтуемся да канцэрта, які пакажам перад японцамі. У нас вучацца не толькі беларусы, але і дзяўчынкі з Расіі — Калінінграда, Масквы, Пецярбурга, а таксама Украіны, Японіі... Японкі, як прыязджаюць, адразу ж пачынаюць вучыць рускую мову, і за пару гадоў добра ёю авалодваюць, таму ніякіх моўных цяжкасцяў няма. Да таго ж, выкладанне харэаграфіі адбываецца напалову на французскай мове, таму што ўсе назвы рухаў — на французскай.

...Цяпер дзяўчынкі больш вольныя і разняволеныя. Мы калісьці па струнцы перад педагогамі хадзілі... І былі больш сканцэнтраваныя на сваёй прафесіі, а ў сучасных дзяцей шмат спакусаў — інтэрнэт, мабільныя тэлефоны... І яшчэ я заўважыла: зараз нярэдка назіраю ў іх завышаную самаацэнку. Яны трапілі сюды і думаюць, што ўжо балерыны, але адна справа паступіць... Каб стаць балерынай, трэба вельмі шмат працаваць...»

***

І гэта, мабыць, галоўныя словы, якім падпарадкоўваецца наша гераіня ўсё сваё доўгае, цяжкае, але такое насычанае і прыгожае жыццё. А без працы не было б ні гэтай прыгажосці, ні здароўя, ні, можа, і даўгалецця...

**Святлана БУСЬКО.**

БЕЛАРУСБАНК

## ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует вкладчиков об изменении процентных ставок по срочным банковским вкладам в иностранной валюте

С 09.03.2018 по ранее открытым срочным банковским вкладам в иностранной валюте устанавливаются:

– **«Классик Безотзывный»** (в долларах США, евро), по которым не начисляется пониженная процентная ставка, проценты в размере 1,5 % годовых.

– **«Классик Безотзывный»** (в российских рублях), по которым не начисляется пониженная процентная ставка, проценты в размере 5,5 % годовых.

– **«Сберегательный»** (в долларах США, евро), по которым не начисляется пониженная процентная ставка, проценты в размере 1 % годовых.

– **«Сберегательный»** (в российских рублях), по которым не начисляется пониженная процентная ставка, проценты в размере 3,5 % годовых.

С 09.03.2018 по действующим срочным банковским вкладам в иностранной валюте, открытым до 09.02.2018, устанавливаются процентные ставки в следующих размерах:

– **«Классик Отзывный до года»** (в долларах США, евро):
на срок 185 дней – 0,4 % годовых.

– **«Классик Безотзывный до года»** (в долларах США, евро):
на срок 6 месяцев – 0,8 % годовых;
на срок 9 месяцев – 0,9 % годовых.

– **«Классик Безотзывный до года»** (в российских рублях):
на срок 6 месяцев – 5 % годовых;
на срок 9 месяцев – 5,2 % годовых.

– **«Классик Отзывный свыше года» на срок 18 месяцев** (в долларах США, евро) – 1,1 % годовых.

– **«Классик Отзывный свыше года» на срок 18 месяцев** (в российских рублях) – 5 % годовых.

– **«Классик Безотзывный свыше года»** (в долларах США, евро):
на срок 30 месяцев – 1,6 % годовых;
на срок 36 месяцев – 1,8 % годовых.

– **«Интернет-депозит-Тренд Отзывный»** (в долларах США, евро):
на срок 3 месяца – 0,8 % годовых;
на срок 6 месяцев – 1 % годовых;
на срок 12 месяцев – 1,5 % годовых;
на срок 18 месяцев – 1,6 % годовых;
на срок 23 месяца – 1,7 % годовых.

- **«Интернет-депозит-Тренд Отзывный»** (в российских рублях):
на срок 12 месяцев – 4 % годовых;
на срок 18 месяцев – 5,1 % годовых;
на срок 23 месяца – 6 % годовых.

– **«Интернет-депозит-Тренд Безотзывный»** (в долларах США, евро):
на срок 3 месяца – 1 % годовых;
на срок 6 месяцев – 1,4 % годовых;
на срок 12 месяцев – 1,8 % годовых;
на срок 18 месяцев – 1,9 % годовых;
на срок 23 месяца – 2 % годовых.

– **«Интернет-депозит-Тренд Безотзывный»** (в российских рублях):
на срок 3 месяца – 4,6 % годовых;
на срок 6 месяцев – 5,1 % годовых;
на срок 12 месяцев – 6 % годовых;
на срок 18 месяцев – 7,1 % годовых;
на срок 23 месяца – 8 % годовых.

*Установленный размер процентов применяется к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность.*

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте www.belarusbank.by и в отделениях «Беларусбанка»**

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Лицензия на осуществление банковской деятельности №1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.
УНП 100325912.

**Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)**


## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Молодечноторг»

Лот № 1. Здание склада № 4, инв. № 630/С-78014. Адрес: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Виленская, д. 201Д/3. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Г. п. – 1963. Этажность – 1. Площадь общая – 533,4 м$^2$. Составные части: блочная пристройка основного назначения, дощатая холодная пристройка, бревенчатый склад, дощатый склад.

**Начальная цена продажи – 33 600,00 бел. рублей, в т. ч. НДС 20 %.
Задаток – 5 000,00 бел. руб. Шаг аукциона 5 %**

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок с кадастровым номером 642000000002000227, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Виленская, 201Д, пл. 1,4113 га. Назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений. Право постоянного пользования. На земельном участке находятся иные объекты, не выставляемые на аукцион. Земельный участок неделимым. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона.
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 6 % (шести процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 13.03.2018 в 11.00 по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Продавец:** ОАО «Молодечноторг», 222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Виленская, д. 201, УНП 600128795, тел. +375 (176) 73 73 14.
**Организатор аукциона**: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11 пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот № 1), принадлежащего ОАО «Молодечноторг», проводимом 13.03.2018 г.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. **Окончание приема заявлений** 07.03.2018 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Павлович Вадим Викторович, тел.: +375 29 114-96-68, +375 29 755-20-92 – пн.–чт. с 8.00 до 17.00, пт с 8.00 до 16.00.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять Лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Организатор аукциона, тел.: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-59 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

МОМО любит тебя

## РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «БУМ ПРИЗОВ В МОМО» В ТОРГОВОМ ЦЕНТРЕ «МОМО»

**Организатор рекламной игры**: Общество с ограниченной ответственностью «Минт филд», УНП 192465627, зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета от 16.02.2016 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192465627

**Юридический адрес Организатора:** 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 12А, пом. 6, каб. 5.

**Наименование рекламной игры:** «Бум призов в МОМО»

Свидетельство № 3191 о государственной регистрации рекламной игры, выданное 28 декабря 2017 года Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

**Территория проведения рекламной игры:** ТЦ «МОМО», расположенный по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Партизанский, 150А.

**Сроки начала и окончания рекламной игры:** с 6 января по 13 февраля 2018 г.

**Количество участников рекламной игры:** 1756 человек.

**Призовой фонд разыгран полностью.**

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры:** +375 44 514 57 75.

**За время проведения рекламной игры обладателями призов стали:**

| № | Номер карточки участника | Фамилия, имя, отчество | Приз | Дата вручения |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 00223 | Шаверняева Марина Владимировна | Сертификат на поездку «Минск-Москва-Минск». Сертификат дает право осуществить поездку на автобусе по маршруту Минск-Москва-Минск. Сертификат предоставляется на поездку 1 человека. Срок действия сертификата: до 01.04.2018 г. | 02.02.2018 |
| 2 | 01476 | Серая Ирина Николаевна | Сертификат на поездку «Минск-Москва-Минск». Сертификат дает право осуществить поездку на автобусе по маршруту Минск-Москва-Минск. Сертификат предоставляется на поездку 1 человека. Срок действия сертификата: до 01.04.2018 г. | 01.02.2018 |
| 3 | 00364 | Шобей Наталья Зигмундовна | Сертификат на поездку «Минск-Москва-Минск». Сертификат дает право осуществить поездку на автобусе по маршруту Минск-Москва-Минск. Сертификат предоставляется на поездку 1 человека. Срок действия сертификата: до 01.04.2018 г. | 01.02.2018 |
| 4 | 00393 | Сушкевич Елена Петровна | Сертификат на поездку «Минск-Москва-Минск». Сертификат дает право осуществить поездку на автобусе по маршруту Минск-Москва-Минск. Сертификат предоставляется на поездку 1 человека. Срок действия сертификата: до 01.04.2018 г. | 28.01.2018 |
| 5 | 00796 | Гурецкая Олеся Сергеевна | Сертификат на поездку «Минск-Москва-Минск». Сертификат дает право осуществить поездку на автобусе по маршруту Минск-Москва-Минск. Сертификат предоставляется на поездку 1 человека. Срок действия сертификата: до 01.04.2018 г. | 01.02.2018 |
| 6 | 01199 | Чабровская Ксения Леонидовна | Сертификат на поездку «Минск-Москва-Минск». Сертификат дает право осуществить поездку на автобусе по маршруту Минск-Москва-Минск. Сертификат предоставляется на поездку 1 человека. Срок действия сертификата: до 01.04.2018 г. | 28.01.2018 |
| 7 | 00303 | Ковбаса Александр Владимирович | Сертификат на поездку «Минск-Москва-Минск». Сертификат дает право осуществить поездку на автобусе по маршруту Минск-Москва-Минск. Сертификат предоставляется на поездку 1 человека. Срок действия сертификата: до 01.04.2018 г. | 02.02.2018 |
| 8 | 01728 | Кадурина Елена Евгеньевна | Сертификат на поездку «Минск-Питер-Минск». Сертификат дает право осуществить поездку на автобусе по маршруту Минск-Санкт-Петербург-Минск. Сертификат предоставляется на поездку 1 человека Срок действия сертификата: до 01.04.2018 г. | 28.01.2018 |
| 9 | 01584 | Никонов Аркадий Геннадьевич | Сертификат на поездку «Минск-Питер-Минск». Сертификат дает право осуществить поездку на автобусе по маршруту Минск-Санкт-Петербург-Минск. Сертификат предоставляется на поездку 1 человека Срок действия сертификата: до 01.04.2018 г. | 01.02.2018 |
| 10 | 00306 | Ковбаса Александр Владимирович | Сертификат на поездку «Минск-Питер-Минск». Сертификат дает право осуществить поездку на автобусе по маршруту Минск-Санкт-Петербург-Минск. Сертификат предоставляется на поездку 1 человека Срок действия сертификата: до 01.04.2018 г. | 06.02.2018 |
| 11 | 00248 | Прокопович Жанна Владимировна | Сотовый телефон Iphone 8 (64Gb) silver и денежное вознаграждение 261,79 рубля | 01.02.2018 |

Свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя Бобрович А. К., регистрационный № 192126844 от 24.08.13 года, **считать недействительным**, в связи с утратой.

**ЗАСО «Промтрансинвест» предлагает принять участие в процедуре закупки № 2018-538070,** размещенной на сайте http://www.icetrade.by, по «Целлюлозно-бумажное производство > Бумага для офиса».

УНП 100357923

Печать **ООО «Фокс-Маркет»** (УНП 191121541) **считать недействительной** в связи с утратой (потерей).

## Благотворительный местный фонд «Открытые сердца»

**212030 г. Могилев, ул. Ленинская д. 27, офис 4. www.prolife-belarus.org
Расчетный счет № BY76AKBB3015 04220 72137000000.
Филиал 700 «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY21700, УНП 790627109.
Телефоны: +375 29 306-22-22, +375 29 812-22-76.
Адрес для корреспонденции: 212026, г. Могилев, ул. Сурганова, 21.
Email: prolife.belarus@gmail.com**

### Отчет об использовании своего имущества за 2017 год.

Количество учредителей благотворительного местного фонда «Открытые сердца» – 1 человек, из них 1 – физические лица.

Единица измерения тыс. руб.

Информация о стоимости имущества благотворительного местного фонда «Открытые сердца» (далее – Фонд):

– остаточная стоимость основных средств на 31.12.2015 г. составляет 0,6 тыс. руб., в том числе:

– видеокамера Панасоник – 0,6 тыс. руб.;

– поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством, – 32,9 тыс. руб.

Общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в Уставе Фонда, составляет 33,6 тыс. руб. В том числе:

– на выплату заработной платы, пособия по уходу за ребенком и хозяйственных расходов – 21,2 тыс. руб.;

– на оплату налогов и обязательных платежей из ФЗП – 3,15 тыс. руб.;

– на оплату поставщикам (буклеты, листовки, аренда и прочее) – 8,65 тыс. руб.;

– прочие платежи (вознаграждения банку и др.) – 0,6 тыс. руб.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществления предпринимательской деятельности.

В. А. Волохович,
директор Фонда.

Могилев, 05.02.2018 г. УНП 790627109

## Извещение о проведении 28 февраля 2018 года повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

| Сведения о предметах торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества | Начальная цена | Сумма задатка |
| 1 | Изолированное помещение с инв. № 500/D-70792555 (наименование – складское помещение № 1; общая площадь 777,4 кв. м), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Карвата, д. 73, корп. 6, пом. 3 | 302 292,00 бел. руб. | 30 229,00 бел. руб. |
| 2 | Изолированное помещение, многофункциональное № 3; с инв. № 500/D-70792556, общая площадь – 593,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Карвата, д. 73, корп. 6, пом. 1 | 250 776,00 бел. руб. | 25 077,00 бел. руб. |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион проводится 28 февраля 2018 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 09.02.2018 по 23.02.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36, (017) 327-40-22 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости».




## ЗЛОДЗЕЙ ЯШЧЭ НА СВАБОДЗЕ

...У тую раніцу, як і заўжды, я шыбаваў да кіёска з прэсай, здалёк бачыў ля акенца дзвюх пажылых жанчын, а побач з імі — вялізную чорную сумку. «Няўжо спартыўная?» — здзівіўся я, але не прыглядаўся — запыніўся побач, чакаў сваёй чаргі ды мімаволі назіраў, як тыя жанчыны выбіралі часопісы.

— Тут шрыфт дужа дробны, — казала старэйшая, — вочы сабе сапсуём.

— А тут крыжаванкі зацяжкія, мы іх не разгадаем, — баялася маладзейшая. — Давай вось гэты часопіс возьмем?.. Рэшта з дзясяткі знойдзецца? — спытала яна ў кіяскёркі.

— А як жа, — адказала тая.

Адна з жанчын дастала з кашалька грошы, хацела працягнуць у акенца, але яе дзясятка чамусьці плаўна паляцела ўніз.

— Эх, старасць не радасць, — згінаючыся, каб падняць, прамовіла жанчына ды так і застыла.

«Можа, радыкуліт?» — падумаў быў я. І тут жа зразумеў, што справа не ў ім, а... у «сумцы», якая пры блізкім разглядзе аказалася чорным сабакам, што спакойна ляжаў на зямлі.

— Э-э, не затрымлівайце чаргу, — нерваваўся тым часам нейкі патэнцыйны пакупнік у мяне за спінай. — Чаго вы там марудзіце?

— Ды грошы ўпалі, — стала апраўдвацца адна з жанчын.

— Вам іх цяжка падняць? — не разумеў мужчына.

— Не... Але тут сабака...

— Дык мне што — з-за яго на працу спазняцца?..

Не ведаю, чым скончылася б гэта перапалка, калі б з боку рынку не данеслася гучнае:

— Рыжык...

Сабака насцярожыўся.

— ...Пушок! Кіс-кіс-кіс-кіс...

Клікалі яўна не сабаку, але — ён, як мне здалося, радасна... усміхнуўся і, размахваючы хвастом, памчаў на голас.

— Грошы! — раптам закрычала адна з пакупніц. — Мае грошы!

І я тут жа ўбачыў, што дзясятка, якая выпала з рук жанчыны, нейкім чынам прыляпіўшыся да ашыйніка, з усіх ног «памчала» да рынку.

— Злодзей! Жулік! — услед яму абуралісяпацярпелыя.

...Не ведаю, як насамрэч звалі гэтага сабаку? Можа, і Жулікам. Ці злодзеем. Але ён, відаць, па-ранейшаму на свабодзе. Так што беражыце грошы.

**Максім Шастакоў,**

*г. Гомель.*

## ДУЛЯ ДЛЯ ДЗЕДА МІХЕДА

Кожны час вылучае сваіх і большых, і меншых разумнікаў, сваіх вялікіх умельцаў. Узяць хоць бы нашы незабытыя пакуль кросны... Гэта ж якая галава патрэбна была, каб іх прыдумаць?! Якія рукі, каб іх зрабіць! А потым — колькі фантазіі і цярпення мецьмайстрыхам, каб на посцілках, абрусах ды ручніках выткаць цудоўныя ўзоры...

Аднак (і на жаль) славіліся мясціны не толькі такімі адмыслоўцамі. Аматараў рабіць рознае паскудства ці проста псаваць настрой хапала таксама.

У нашых ваколіцах быў з такіх дзед Міхед. «Без фігі не да носа», — нехта сказаў пра яго ны гонар. І ён гэта зразумеў па-свойму: папрасіў сваяка, каб той зрабіў яму кіёк якраз з... фігай. Падпорка ў выніку атрымалася знатная: дзед, прымяраючы, толькі радаваўся ды гразіў: «Зараз я вам пакажу!»

І, на жаль, стаў паказваць — удовам, адзінокім жанчынам... Прыйдзе, бывала, у краму, стане спінай да нейкай, за якую заступіцца няма каму, і ледзь не пад нос ёй свой кукіш падсуне. А чалавеку і крыўдна, і не дужа адвернешся, бо ў чарзе...

Карацей, збрыдзеў дзед вяскоўцам, але ж звязвацца з ім ніхто не хацеў: дзедаў сын, казалі, у органах недзе працуе, баяліся людзі — да пары, пакуль не вярнуўся з войска адзін з нашых хлопцаў-салдат і не прывёз з сабою жонку — сапраўдную атаманку. Пачула яна ў краме скаргі жанчын ды пытае: «А чаму вы ўсё церпіце? Чаму старога на месца не паставіце?» — «А як?» — уздыхаюць тыя. — Мы і казалі яму, і прасілі — марна. Як пугай па вадзе: ён сваю дулю ўсё роўна суне» — «Пугай па вадзе? — перапытала прыезджая, — а калі ёй ды па спіне?..»

Хоць і нядаўна гэта маладзіца жыла ў вёсцы, але ўжо ведала, што такое пуга. Вярнулася дадому, выцягнула яе з падстрэшка і разам з суседкамі-ўдовамі выйшла з ёю насустрач крыўдзіцелю.

Той да жанчын набліжаўся смела. Яны да яго — таксама. Сышліся. Дзед худы, па росце — казачцы да пляча... А таму яна смела вырвала ў яго з рук «падпорку» з кукішам, на калене разламала папалам і кінула дзеду пад ногі. Усё, маўляў, болей нікому не падсунеш... А паспрабуеш, — то во, паглядзі, — пугай будзе не па вадзе, а па спіне... За свякроў, за во гэтых жанчын...

Не чакаў дзед такога павароту: спалохаўся, збялеў, аднак атаманцы пярэчыць пабаяўся: паднеў канец палкі з любімым кукішам і панёс дадому.

Пасля гэтай сутычкі пацішэў ён. У краму, у людзі амаль не хадзіў. Можа, апірацца не меў на што? А можа, усё ж такі саромеўся?

**Ніна Бурко,**

*Бярэзінскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж.** Яшчэ раз нагадаем, што «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця...» «Звязда» не проста збірае, а праводзіць конкурс на найлепшую. Далучыцца да яго ўдзельнікаў альбо членаў журы можа кожны, хто мае нешта расказаць альбо возьмецца ацэньваць тое, што апавядаюць іншыя. Для вось гэтага трэба няшмат: чытаць усе падборкі гісторый, нейкім чынам (клічнікам, птушачкай, плюсам) пазначаць найлепшыя — з тым, каб на фінішы года назваць сваю дзясятку, каб потым, разам з маленькім рэдакцыйным журы, вызначыць творы-пераможцы ды назваць іх аўтараў. Па выніках мінулага года імі сталі, напрыклад, **Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны, Кацярына Будзіловіч са Скідзеля, а таксама жыхары сталіцы Валянціна Паліканіна, Любоў Чыгрынава і Іван Гаральчук.** Двое з іх па просьбе чытачоў і рэдакцыі пра сябе ўжо расказалі. Сёння слова трэцяй...

*«З чаго пачаць, — сама ў сябе пытае* **спадарыня Кацярына Будзіловіч** *і сама ж адказвае, — ну, вядома, спачатку. Такім чынам, стаяў цёплы кастрычніцкі дзень, і мая мама вельмі спяшалася да Пакроваў, да родаў выкапаць бульбу. Капала матычкай, з-пад плуга. Сённяшняй моладзі, відаць, цяжка ўявіць жанчыну, якая ў апошнія дні перад родамі стаіць у баразне. Але так было.*

*Дапамагаў маёй маме мой стрыечны брат Рэнік. Ён высыпаў кашы, прыглядваў за мамай (тата загадаў) і, вядома ж, заўважыў, што яна час ад часу сціскае кулачкі. Спытаў: «Цётка, вам, мусіць, кепска?» — «Ды не», — адказала мама, бо не кідаць жа бульбу ў разараных градках...*

*Але ж Рэнік ёй не паверыў — праз людзей выклікаў тату. Ён працаваў брыгадзірам, у яго быў конь, каб умомант прыляцець на поле і ў брычцы ўдвух з Рэнікам за шэсць вёрстаў павезці маму ў Голдава (вёска на Лідчыне), у бальніцу. Мыцца пасля бульбы ўжо не было калі.*

*І доктара на месцы таксама не было — пайшоў дахаты.*

*Маладзенькая медсястра Ганна Іванаўна Гомза (мама ў яе практыцы была першай парадзіхай) загадала ёй раздзецца і залезці на крэсла. Жанчыны могуць уявіць, як гэта «лёгка», а тым больш на апошніх хвілінах цяжарнасці... Карацей, «па дарозе» туды, калі можна гэтак сказаць, маме рэзка забалеў жывот, і я, з'явіўшыся на свет ды павісшы на пупавіне, патрапіла ў тазік, які стаяў пад крэслам.*

*Мама вельмі спалохалася, бо падумала, што я магла забіцца. Але ж вельмі хутка пачула плач...*

*Ну, а далей, —* працягвае спадарыня Кацярына, — *пачалося маё шчаслівае дзяцінства, бо мяне, малую, любілі і песцілі старэйшыя брат і сястра, а найболей — мой татачка, якому на той час было 50...*

*У сваю Ігнаткаўскую пачатковую школу ў няпоўныя сем гадоў мяне браць не хацелі: усё першае паўгоддзе я хадзіла туды незапісанай. Толькі потым, пасля Каляд, мая любімая першая настаўніца (яна ж дырэктар школы Ніна Мікалаеўна Ільюшонак) залічыла мяне ў вучаніцы.*

*Васьмігодка была за два кіламетры ад дома, у вёсцы Сямашкі. Цяпер і на жаль, школы ўжо няма — разабралі, бо няма дзяцей.*

*А ў сярэднюю — я хадзіла ў тое ж Голдава — шэсць кіламетраў туды і шэсць назад. Ніхто нас не вазіў, хадзілі пешкі, балотам, напрасткі, цераз восем равоў і адну маленькую рэчку — Галдаўлянку. Некалькі разоў мне даводзілася ў ёй «купацца» і вяртацца потым дамоў. Мама, помнячы мой паход у «зялёную школу» («Звязда», 11.02.2017 г.), казала: ты, маўляў, спецыяльна «мокнеш», каб не ісці ў звычайную... Што было няпраўдай, хоць бы таму, што ў школе можна было сустрэцца з Валодзькам, маёй самай першай сімпатыяй...*

*Затым пачалося дарослае жыццё, у якім быў Мінск — найлепшы горад зямлі — бібліятэчны факультэт інстытута культуры, вучоба, інтэрнат, маладосць.*

*Як жа хутка ўсё гэта праляцела, і якія ж мы былі шчаслівыя!* — успамінае спадарыня Будзіловіч. — *Хадзілі на «Песняроў», на Пугачову ды іншых зорак эстрады, раз на месяц, са стыпендыі, скідваліся па пяць савецкіх рублёў, на шэсць чалавек у кафэ ці рэстаране заказвалі бутэльку шампанскага, нечага смачнага з ежы і танцавалі да закрыцця... Ну, вядома ж, паралельна вучыліся, здавалі сесіі...*

*Пасля заканчэння інстытута, я выйшла замуж за майго Колечку і не пашкадавала аб тым ні разу! Для жанчыны і сапраўды вельмі важна добра выйсці замуж. Мне пашчасціла, хоць інстытутаў мой муж не канчаў, ён просты шафёр і цудоўны чалавек.*

*Далей было нараджэнне дзяцей, ужо іхнія школьныя ды студэнцкія гады, час страт — самых блізкіх людзей...*

*Вось так праходзіць жыццё — у клопатах і перажываннях, у марах і спадзяваннях, у радасці і горы. Ад яго і ад дрэнных думак мяне заўсёды ратавала праца. Больш за трыццаць гадоў загадваю бібліятэкай у Скідзельскім ліцэі і адсюль ужо толькі на «дзембель». Кажуць, там усё пачнецца спачатку? Будзем спадзявацца».*

А мы ў рэдакцыі — яшчэ і чакаць новых гісторый, новых расказаў пра сябе.

Сустракаемся, як заўжды, па пятніцах.

■ Неасабісты суб'ектыў



# БАБЧЫНА НАВУКА

## Ці патрэбны ў сучасным светаўладкаванні «інстытут бабуль»?

БАБКА Аміля пайшла ў нябыт роўна дваццаць два гады назад, лютаўскай заснежанай ноччу, дачакаўшыся, пакуль развітацца з ёй збярацца ўсе даўно ўжо дарослыя ўнукі. Ціха, бы заснула, сканала ў роднай хаце, дзе пражыла амаль усе свае доўгія гаротныя дзевяноста гадоў. Не нажыла за іх аніякага багацця, не пакінула спадчыннікам ні дарагіх убораў, ні залатых бранзалетаў, ні нават ашчаднай кніжкі. Усе яе каштоўнасці змясціліся ў невялікім «пудэлку» — кардоннай скрыначцы, якую клапатліва хавала на верхняй паліцы шафы за сваімі хусткамі, — пасведчанне аб рэабілітацыі расстралянага ў 1937 годзе мужа, пажаўцелая картачка, на якой яна з ім удваіх, патрапаны каталіцкі малітоўнік, стары парваны на некалькі кавалкаў ружанец... Вельмі любіла гасцінцы, асабліва шакаладныя — «мяккія» — цукеркі, але ад абновак катэгарычна адмаўлялася. У апошнія гады з задавальненнем даношвала маю школьную яшчэ ружовую балоневую куртку. Такой яна і засталася ў памяці назаўсёды — чысценькая, з цікаўнымі жывымі вачыма, у ружовай дзявочай куртцы сядзіць на лавачцы ля плота, углядаецца ў доўгую вуліцу, чакае, калі ты будзеш ісці з аўтобуса...

У кагосьці ў жыцці быў дзіцячы сад, а ў нас была бабка. (Сада проста фізічна не было ў наяўнасці ў радыусе дванаццаці кіламетраў). Бабуля з абавязкамі выхавацеля спраўлялася на «выдатна»: дзіця было апранута, прычасана, пакормлена. Дзіцяці расказваліся дзівосныя, пасля нідзе не прачытаныя, казкі і спяваліся адмысловыя, ва ўласнай імправізацыі калыханкі (напрыклад, пра ката, які «палез бы вышай, ды баіцца мышэй, палез бы далей, ды згубіў сандалі»).

Аяшчэ бабуля вучыла элементарным жыццёвым рэчам. Напрыклад, заплятаць касу. Ля ложкаў у спальні віселі вельмі модныя ў той час дываны з намаляванымі персанажамі казак і махрамі па краях. І мы не супакойваліся, пакуль гэтыя махры ўсе не былі заплеценыя ў даволі зграбныя косы. А ўлетку мы сушылі на паўмеску сена, і бабуля цярпліва вучыла правільна трымаць граблі. Пры гэтым не ленавалася паказаць трыпутнік і расказаць, як ім карыстацца, каб спыніць кроў з парэзанага пальца. Вучыла, што трэба крыкнуць услед бусλу, які лунае ў небе, каб заўтра было добрае надвор'е («Бусел-бусел, вылі ваду, закружыся на пагоду!»). Сама таго, напэўна, не ведаючы, давала практычныя ўрокі жывой беларускай мовы — а яна ж усё жыццё толькі на ёй і гаварыла. Сама ніколі без вельмі важкай прычыны не плакала і нам не раіла. Казала: «Многа ім гонару, што ты плачаш». (Цікава, адкуль яна ўзяла на ўзбраенне гэту формулу: атрымала ў спадчыну ад сваёй бабулі, ці вывела-выпакутавала яе сама, калі стаяла ля турмы на Валадарскага з хатулькам-перадачай для арыштаванага мужа, а конныя міліцыянеры білі яе і гэткіх самых няшчасных шашкамі плазам па галовах, каб разыходзіліся?..)

Бабкі ўжо дваццаць два гады як няма на гэтым свеце, а яе навука помніцца ва ўсіх фарбах і дэталях, дапамагае жыць і выжываць у наш шалёны час. Пэўна, для гэтага бабулі і былі прыдуманыя ў нашым светаўладкаванні, — дапамагаць, падтрымліваць, вучыць, падказваць, раіць... А яшчэ для таго, каб іх унукі адчувалі сябе больш упэўненымі і хоць на каліва шчаслівейшымі.

ТОЛЬКІ вось (папраўце мяне, калі я памыляюся) у нас ужо як мінімум адно пакаленне вырасла без бабуль. Фізічна яны, канешне, прысутнічаюць. Але гэтыя маладыя яшчэ, сямадастаткова, у большасці працуючыя жанчыны занадта занятыя самімі сабой, каб заняцца ўнукамі, якіх яны безумоўна вельмі любяць. Інстытут бабуль — адзін з самых важных у плане выхавання чалавека грамадскіх інстытутаў — сёння фактычна ліквідаваны. Бо купіць унуку цукерку ці кніжку, нейкі час спагадліва паназіраць за яго выбрыкамі («хай пацешыцца дзіця») і панесціся далей па сваіх справах — гэта зусім не тое, што ўнуку ад бабулі патрэбна. Але на іншае неабходны час і засяроджанасць. А ні таго, ні другога вельмі часта ў сучасных бабуль проста не стае.

Можа, таму сярод нашай моладзі так сёння шмат разгубленых няўпэўненых твараў? Можа, вінаватыя не толькі гаджэты ды сацыяльныя сеткі?

НЯДАЎНА назірала, як старэйшая сястра — таксама дама надзвычай дзелавая і занятая — укладвала спаць двухгадовую ўнучку (дзеці ўгаварылі пабыць ноч за нянькү). Малая класіцыя не хацела — не дапамаглі ні традыцыйныя «Спят усталые игрушки», ні прывезеныя прысмакі, ні прагледжаны некалькі разоў «Калабок» на бабуліным смартфоне. І тады наша баба Таня запела старое і наіўнае, ад бабкі Амілі калісьці пачутае: «Ходзіць коця па плоце ў чырвонай капоце»... Малая радасна ўздыхнула: «Мяў!», сцішылася, уважліва слухаючы, і праз колькі хвілін ужо моцна спала.

Дасць Бог, спяе калісьці гэту калыханку сваёй унучцы.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**



Калі завейны час міне,
Усміхнуцца першыя пралескі -
І прыгадаеш ты мяне
Ля нашай хвоі на ўзлеску.

Там нам спяваў птушыны хор,
Шумеў, вітаў гурт сосен гонкіх,
Хмяліў галовы нам чабор
І шчасце зычылі рамонкі...

Цяпер зіма. Снягі. Ільды.
Буран сцяжынкі замятае.
Ці заняце мае сляды
І надпіс «Я цябе кахаю»?

Яўгена ПЯСЕЦКАГА
Фота слова




## Конкурсы

# «ДАРОСЛЫЯ ГУЛЬНІ» БУДУЧЫХ ПРАВАЗНАЎЦАЎ

**Каманда юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта выступіць на міжнародным юрыдычным конкурсе імя Ф. Джэсапа ў Вашынгтоне (ЗША).**

Студэнты Белдзяржуніверсітэта перамаглі ў нацыянальным адборачным этапе. Па рашэнні журы ў Вашынгтон адправіцца таксама каманда Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО», якая заняла другое месца. Усяго ў нацыянальным адборачным этапе выступіла рэкордная колькасць камандаў. За званне нацыянальнага чэмпіёна змагаліся прадстаўнікі 12 ВНУ.

Спаборніцтва праходзіла ў форме гульнявога судовага працэсу, у якім студэнты выступалі ў ролі юрыдычных саветнікаў. Будучыя правазнаўцы прадстаўлялі пазіцыі сваіх кліентаў (дзяржаў) у Міжнародным судзе ААН. Тэмамі гэтага года сталі рэчаіснасць арбітражных рашэнняў, рэжым нераспаўсюджвання ядзернай зброі і ваенныя дзеянні на моры.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.42 | 18.06 | 9.24 |
| Віцебск — | 8.35 | 17.52 | 9.17 |
| Магілёў — | 8.32 | 17.57 | 9.25 |
| Гомель — | 8.24 | 17.58 | 9.34 |
| Гродна — | 8.52 | 18.27 | 9.35 |
| Брэст — | 8.52 | 18.27 | 9.35 |

## Месяц

*Апошняя квадра 7 лютага.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

*Пр.* Івана.
*К.* Апалоніі, Бярнарды, Сабіны, Бярнарда, Кірылы, Раймунда, Эрыка.



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

**9 ЛЮТАГА**

У краіне

**1913** год — у Пецярбургу беларускім навукова-літаратурным гуртком студэнтаў упершыню пастаўлена камедыя Янкі Купалы «Паўлінка».

**1930** год — нарадзіўся (г. Мінск) Валянцін Тарас, беларускі пісьменнік. Працаваў у газеце «Звязда», часопісе «Нёман». Пісаў на беларускай і рускай мовах. Аўтар зборнікаў паэзіі «Мінска вуліцы родныя», «Давер», «Трывожная зямля» і інш. Аўтар сцэнарыяў дакументальных фільмаў «Наш Пімен» (пра П. Панчанку), «Жаўранкі ляцяць на Палессе», «Вяртанне ў першы снег», некалькіх мультыплікацыйных фільмаў. Пераклаў на беларускую мову п'есу Я. Шварца «Дракон», якая пастаўлена ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы. Памёр у 2009 годзе.



**1973** год — нарадзілася (г. Мінск) Святлана Леанідаўна Багінская, беларуская спартсменка (спартыўная гімнастыка), заслужаны майстар спорту СССР. Чэмпіёнка Еўропы сярод дзяўчат (1986). Трохразовая чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў (1988, 1992). Абсалютная чэмпіёнка свету (1989—1990). Чэмпіёнка Еўропы ў мнагабор'і (1986—1987). Неаднаразовая чэмпіёнка СССР.

У свеце

**1887** год — нарадзіўся Васіль Чапаеў, савецкі военачальнік, герой Грамадзянскай вайны. У пачатку восені 1908 года ён быў прызваны ў армію, а з пачаткам Першай сусветнай вайны мабілізаваны на фронт. За адвагу і геразім Чапаеў быў чатыры разы ўзнагароджаны Георгіеўскім крыжам і атрымаў чын падпрапаршчыка. Пасля рэвалюцыі, у красавіку 1919-га, прыняў пад сваё камандаванне 25-ю стралковую дывізію, якая адыграла важную ролю пры правядзенні контрнаступлення Чырвонай арміі супраць калчакаўскіх войскаў. За праяўленую мужнасць Чапаеў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага сцяга. Васіль Іванавіч Чапаеў загінуў 5 верасня 1919 года пры нечаканым нападзе казакоў на горад Лбішчанск, дзе знаходзіўся штаб 25-й дывізіі. Абставіны гібелі камдыва не цалкам ясныя. Паводле дадзеных праведзенага па гарачых слядах расследавання, паранены Чапаеў патануў, спрабуючы пераплыць раку Урал. Гэтая версія была прынятая як афіцыйная і стала шырока вядомай дзякуючы фільму «Чапаеў».

**1895** год — у горадзе Халіёку, што ў амерыканскім штаце Масачусетс, у спартзале Асацыяцыі маладых хрысціян, кіраўнік гэтай арганізацыі па фізпадрыхтоўцы Ўільям Морган прыдумаў новую камандную гульню ў мяч. Морган выраашыў змяшаць элементы баскетбола, бейсбола і гандбола. Ён запазычыў сетку з тэніса і ўстанавіў яе на вышыні прыблізна 196 см ад падлогі, так, каб яна была вышэй галавы чалавека сярэдняга росту. Сутнасць гульні заключалася ў тым, каб перакідваць мяч над сеткай. Колькасць удзельнікаў першы час была неабмежаваная. Саму ж гульню ахрысцілі «mintonette». Паколькі асноўная ідэя гульні заключалася ў тым, каб ударяць рукамі па мячы, прымушаючы яго пералятаць цераз сетку, прафесар Альфрэд Хальстэд прапанаваў перайменаваць «мінтанет» у «валейбол», што ў перакладзе азначае мяч, які лятае.

## УСМІХНЕМСЯ

**Платныя стаматолагі рэкамендуюць курэнне і шакалад.**

— Хто ў вас у сям'і самы пражэрлівы?
— Аўтамабіль.

**Разумееш, што жывеш у добрым раёне, калі бачыш сабак на прагулцы, апранутых лепш за цябе.**

Дзеці — кветкі жыцця :)
Сына пачаставалі яблыкам. Ён моўчкі бярэ і глядзіць на мяне.
Я:
— Што сказаць трэба?
Малы:
— А вы яго памылі?




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 664.
Нумар падпісаны ў 19.30 8 лютага 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

9 лютага 2018 г. № 6 (439)




4 стар.

Не буфетам адзіным



13 стар.

Пра што расказала статыстыка



16 стар.

Руль без права перадачы

АКЦЭНТЫ

Лідзія ЯРМОШЫНА:

## «ХОЧАЦЦА, КАБ МЫ АТРЫМАЛІ РЭАЛЬНАЕ МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ»




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

РАЗМОВА СА СТАРШЫНЁЙ ЦВК ПРА ДЭПУТАТАЎ, БЕЗАЛЬТЭРНАТЫЎНЫЯ АКРУГІ І ЯЎКУ

**ВЫБАРЫ ў мясцовыя Саветы дэпутатаў знаходзяцца зараз на піку актыўнасці. Ідзе перыяд агітацыі — на жаль, ведае пра гэта не так шмат беларусаў. Каб разабрацца ва ўсіх тонкасцях цяперашняй выбарчай кампаніі, наш карэспандэнт пагутарыў са старшынёй Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіяй ЯРМОШЫНАЙ.**

***— У нашай газеце часам з'яўляюцца апытанні, прысвечаныя выбарам у мясцовыя Саветы дэпутатаў, і складваецца ўражанне, што людзі дрэнна арыентуюцца ў гэтым працэсе. Чаму так адбываецца, і як змяніць сітуацыю?***

— У нас грамадзяне часцяком блытаюць мясцовыя Саветы дэпутатаў з мясцовай выканаўчай уладай. Таму і пры апытаннях людзі часта кажуць, што дэпутат не павінен быць карумпаваным, яму неабходна клапаціцца пра народ, а не пра свой кашалёк. Але я адразу хачу падкрэсліць: у нас усе дэпутаты — гэта грамадскія дзеячы, яны апрыёры не могуць быць карумпаваныя ў сілу таго, што не атрымліваюць зарплату і прымаюць толькі калектыўныя, сесійныя рашэнні. Ні адзін з іх не валодае тым асабістым службовым подпісам, які можа размеркаваць матэрыяльныя рэсурсы.

стар. 3

ШТО МОЖА ДЭПУТАТ

## ЧАТЫРЫ СКЛІКАННІ — ГЭТА НЕ ЖАРТЫ

**Разважанні дэпутата пра работу ў Савеце, выязныя сесіі і розныя падыходы да вырашэння праблем**



**Канстанцін ШАРШУНОВІЧ, начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС, чатыры скліканні адпрацаваў у абласным Савеце дэпутатаў. Таму Канстанціна Яўгенавіча, відаць, можна назваць дэпутатам-ветэранам. І яго вопыт, а таксама разважанні, меркаванні могуць стаць цікавымі для тых, хто сёння ідзе на выбары ў мясцовыя Саветы і рыхтуецца прадстаўляць інтарэсы сваіх выбаршчыкаў.**

***— Пачаць размову хацелася б з пытання пра тое, што даў вам асабіста гэты вопыт, чаму навучыў, аб чым прымусіў разважаць? Чатыры скліканні гэта не жарты: удзельнічаць у выбарных кампаніях, працаваць у рознай эканамічнай сітуацыі — як у перыяды стабільнасці, так і эканамічнага крызісу. Усё гэта, несумненна, накладвала адбітак на агульны настрой людзей, іх запыты, прапановы. Чым адрозніваецца выбаршчык сённяшні ад таго, які ішоў на прыём да дэпутата дзясятак і больш гадоў таму?***

— Цяперашнім кандыдатам у дэпутаты хачу нагадаць, што работа ў мясцовых Саветах грамадская, за яе не плацяць, на яе трэба ахвяраваць свой асабісты час альбо адрываць яго ад асноўнай работы. Трэба быць гатовым да таго, што не заўсёды людзі ідуць з абгрунтаванымі скаргамі і рэальнымі просьбамі ды прапановамі... Але ж разам з тым падчас сесій, падрыхтоўкі да іх, стасункаў з калегамі вучышся мысліць больш маштабна, па-дзяржаўнаму, выходзіш за рамкі сваёй работы, сваёй спецыяльнасці ў ацэнцы многіх падзей і з'яў. Ну і, вядома, вучышся слухаць, разумець людзей.

І яшчэ. Не ведаю, ці так супала, ці сапраўды выбаршчыкі пасталелі, павысілася іх прававая культура, бо іх праблемы і пытанні ў апошнія гады значна адрозніваліся ад тых, што былі на пачатку маёй дэпутацкай работы. Напрыклад, раней найбольш пытанняў датычылася забеспячэння жыллём, часам зварот зводзіўся амаль да простага: «Дэпутат, паспрыяй, каб мне далі кватэру». Даводзілася цярпліва тлумачыць, што ёсць гарадская чарга і законны парадак пастаноўкі ў яе. Цяпер такіх зваротаў амаль няма. Я ўдзячны сваім выбаршчыкам, што яны заклапочаныя навядзеннем парадку ў горадзе. Адзначу, што па ініцыятыве і з дапамогай грамадзян, з прыцягненнем іншых службаў удалося ліквідаваць несанкцыянаваныя звалкі будаўнічых адходаў.

стар. 15

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## ПАТЭНЦЫЯЛ — МАГУТНЫ

*Міхаіл Мясніковіч — пра Магілёўскую вобласць*

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ прыняў удзел ва ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным 80-годдзю Магілёўскай вобласці. Спікер верхняй палаты парламента ўручыў старшыні Магілёўскага аблвыканкама Уладзіміру Даманеўскаму Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь працаўнікам Магілёўскай вобласці за значны ўклад ва ўмацаванне беларускай дзяржаўнасці і ў сувязі з 80-годдзем з дня ўтварэння вобласці.**



«Магілёўская вобласць сёння ўпэўнена глядзіць у будучыню. На тэрыторыі рэгіёна рэалізуюцца сур'ёзныя прамысловыя, інавацыйныя праекты. Маштабная мадэрнізацыя працягваецца на «Белшыне». Рэалізуецца праект па вытворчасці новых відаў тканін на прадпрыемстве «Магатэкс». «Магілёўхімвалакно» будуе комплекс па вытворчасці поліэфірнай прадукцыі. І пералік можна прадоўжыць. Гэта сведчыць аб тым, што ў рэгіёне магутны патэнцыял і добрыя перспектывы для развіцця», — заявіў старшыня Савета Рэспублікі.

Таксама Міхаіл Мясніковіч азнаёміўся з ходам капітальнага рамонту Палаца культуры, наведаў корпус Беларуска-Расійскага ўніверсітэта, які будуецца. Будаўнічыя работы на новым корпусе адноўленыя з 1 студзеня гэтага года. Ужо цалкам закрыты яго контур і пачаліся некаторыя апрацоўчыя работы ўнутры дзевяціпавярховага будынка. А з надыходам цяпла пачнецца аздабленне фасада. Вырашаецца таксама пытанне будаўніцтва і падвядзення сюды інжынерных сетак.

Міхаіл Мясніковіч парэкамендаваў кіраўніцтву вобласці і горада звярнуць асаблівую ўвагу на гэты важны сацыяльны аб'ект, па магчымасці паскорыць тут будаўнічыя работы, каб забяспечыць увод яго ў эксплуатацыю ў намечаныя тэрміны. БРУ стане адной з пляцовак правядзення ў Магілёве ў верасні 2018 года V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

## У МІНСК, НА ФОРУМ

*Віцэ-спікер пра імплементацыю Мэт устойлівага развіцця*

**Каля 25 краін пацвердзілі ўдзел у Рэгіянальным форуме нацыянальных каардынатараў па Мэтах устойлівага развіцця (МУР) у Мінску. Пра гэта ў інтэрв'ю тэлеканалу АНТ заявіла намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, нацыянальны каардынатар па дасягненні МУР Мар'яна Шчоткіна.**

Рэгіянальны форум нацыянальных каардынатараў па дасягненні Мэт устойлівага развіцця пройдзе ў Мінску 21—22 лютага гэтага года. Чакаецца, што форум наведае першы намеснік Генеральнага сакратара ААН Аміна Махамед. Сярод дзяржаў, якія выказалі зацікаўленасць ва ўдзеле ў форуме, — Германія. Пытанні па дасягненні МУР і магчымасці партнёрства ў гэтай сферы абмяркоўваліся падчас нядаўняга візіту беларускай дэлегацыі на чале з Мар'янай Шчоткінай у ФРГ.

Беларусь ужо распачала работу па імплементацыі МУР на нацыянальным узроўні. Сфарміравана архітэктура кіравання працэсам па дасягненні 17 мэт Парадку-2030. Вядзецца работа па каардынацыі намаганняў дзяржаўнага сектара, бізнесу, грамадскіх аб'яднанняў, усяго насельніцтва.

## ДА ЛЮДЗЕЙ — З ДУШОЙ

*Сенатар правёў асабістыя прыёмы грамадзян*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў правёў асабістыя прыёмы грамадзян у Чэрыкаўскім і Чавускім раёнах.**

Заяўнікі ўзнімалі пытанні аднаўляльнай энергетыкі, будаўніцтва фотаэлектрычнай станцыі, выкарыстання памяшканняў сацыяльна-дзяржаўнага жылога фонду, вулічнага асвятлення тэрыторыі ў начны час, а таксама пенсійнага забеспячэння. Парламентарыем дадзены адпаведныя тлумачэнні, асобныя пытанні ўзяты на кантроль.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

ВЫБАРЫ-2018: ПЫТАННЕ З НАГОДЫ

# ХТО ЁН — АБРАННІК НАРОДА?

**18 лютага адбудуцца выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Мы пацікавіліся ў нашых чытачоў, якімі якасцямі, на іх думку, павінен валодаць дэпутат мясцовых Саветаў і якія праблемы яму неабходна вырашаць?**

**Мікалай ГЛЕБАЎ, слесар аварыйна-аднаўленчых работ цэха № 9 Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода:**

— Будучы дэпутат мясцовых органаў улады, па-першае, павінен мець самакалоданне. Для мяне гэта значыць — кантроль эмоцый і адсутнасць шкодных звычак. Безумоўна, яму спатрэбіцца камунікабельнасць у спалучэнні з клапатлівасцю і добразычлівасцю. Адказнасць — абавязкова. Дэпутат павінен разумець, што нясе адказнасць не толькі за свае дзеянні, але і за наступствы тых памылак, якія здзейснілі яго папярэднікі. Пры гэтым важна фарміраваць у выбаршчыкаў і калектыўную адказнасць за акругу, бо праблемы на месцах можна вырашаць, толькі аб'яднаўшы намаганні. Хацелася б, каб дэпутат меў досвед кіравання.

Што датычыцца праблем, якія сёння актуальныя для Мазыра, — тут адназначна не хапае агульнадаступнай фізкультурна-аздараўленчай базы. На гэты момант у горадзе пражывае каля 110 тысяч жыхароў, але гарадскі басейн працягл час знаходзіцца на рамонце. У горадзе ёсць гатовыя спартыўныя пляцоўкі, у якія былі ўкладзены немалыя фінансавыя сродкі, але цяпер многія з іх — у аварыйным стане. У дварах густанаселеных раёнаў недастаткова пляцовак для гульнявых відаў спорту. Гэтую праблему трэба вырашыць тым, хто будзе абраны ў мясцовыя Саветы.

**Валянцін ІВАНОЎ, ваенны пенсіянер, жыхар Магілёва:**

— Дэпутат павінен быць у першую чаргу сумленным і простым, каб з ім было лёгка знайсці агульную мову. Людзей часцей за ўсё турбуюць пытанні ЖКГ і стан дарог. Яны хочуць палепшыць якасць свайго жыцця. І дэпутат павінен ім у гэтым дапамагаць. Я не вельмі прывык скардзіцца, у тым ліку і дэпутатам, але аднойчы сутыкнуўся з вельмі непрыемным прыкладам. Як жыхар Чапаеўкі (ёсць у Магілёве такі мікрараён), я паставіў свой подпіс пад калектыўным зваротам да нашага дэпутата з просьбай дапамагчы заасфальтаваць дарогу. Але цэлы год прайшоў упустую — адказу мы так і не дачакаліся. Пытанне вырашылася толькі з цягам часу, калі на гэту праблему звярнулі ўвагу гарадскія ўлады. А вось прыкрасць ад такога стаўлення да сваіх выбаршчыкаў засталася. Калі чалавек бярэ на сябе адказнасць вырашаць людскія пытанні, ён павінен быць паслядоўным і ісці да канца. Інакш проста дыскрэдытуе само званне дэпутата.

**Наталля ЛІПСКАЯ, галоўны бухгалтар будаўнічай кампаніі ААТ «Палессежылбуд», г. Брэст:**

— Чалавек, які прымае рашэнне стаць дэпутатам мясцовага Савета, павінен адпавядаць многім патрабаванням. Бо, скажам, прадстаўніцтва ў абласным Савеце азначае, што з работніка або кіраўніка таго ці іншага калектыву чалавек у пэўным сэнсе ператвараецца ў асобу публічную альбо нават медыйную. Тое ж самае можна сказаць пра раённы Савет нават невялікага раёна. Там дэпутат заўсёды навідавоку ў сваіх выбаршчыкаў. Калі за цябе прагаласавала шмат людзей, гэта абавязвае да бездакорнасці ў паводзінах, да ўмення выстройваць дыялог з любым наведвальнікам, да кампетэнтнасці ў пытаннях заканадаўства, бюджэтнай палітыкі, праблем свайго рэгіёна. Калі такіх ведаў не хапае, цяпер ёсць разнастайныя магчымасці іх атрымаць. Было б толькі жаданне.

Дэпутат павінен быць у курсе праблем сваіх выбаршчыкаў, і калі не ўдаецца іх вырашыць, трэба хоць бы мець смеласць уздымаць гэтыя пытанні, агучваць праблемы, што пазней можа паслужыць штуршком да іх вырашэння. Не павінны забываць народныя абраннікі, што ў іх ёсць такая форма стасункаў з выканаўчай уладай, як дэпутацкі запыт. Наколькі я ведаю, ім актыўна карыстаюцца дэпутаты парламента, а вось мясцовыя абраннікі рабіць гэта часам саромеюцца. А дарэмна.

**Ганна ЮНЧЫЦ, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ:**

— Дзеля парадку залезла ў Google і жахнулася ад свайго няведання ўсіх патрабаванняў выбарчага працэсу, у прыватнасці, таго, што дэпутаты ў мясцовыя Саветы абіраюцца тэрмінам на чатыры гады. Атрымлівaецца, што вось ужо чатыры гады я не маю ўяўлення пра дэпутата, які ўпаўнаважаны прадстаўляць інтарэсы жыхароў маёй акругі, не ведаю, чым ён займаецца, якая яго дзейнасць — кропкавая ці маштабная...

Але калі б мне далі магчымасць «зляпіць» свайго ідэальнага дэпутата, я б надзяліла яго ўменнем слухаць і выбіраць рацыянальнае. Мне хацелася б бачыць упартасць і жаданне не столькі спадабацца народу, колькі зрабіць лепшай сваю акругу. Кажуць, аб добрых справах не заўсёды варта крычаць. Дык вось, я лічу, што варта! Каб людзі не страчвалі веру ў сваіх абраннікаў і не думалі, што навокал нічога не робіцца.

Няхай дэпутат вырашае як дробныя праблемы, пачынаючы з пандусаў і ўстановак дзіцячых пляцовак, так і больш маштабныя, такія, як ушчыльненне кварталаў жылымі дамамі або знос цалкам прыдатных для эксплуатацыі памяшканняў.

А я хачу быць упэўненай, што работа ідзе, і мы не стаім на месцы. Тады наступны раз, магчыма, не давядзецца казаць пра нейкія «ідэальныя вобразы», бо пабачу будучы рэальныя.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

# БАЛАНС ІНТАРЭСАЎ

## Канкурэнцыя паміж гандлёвымі сеткамі ў сельскай мясцовасці абвастраецца?

**Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Праўленне Белкаапсаюза напярэдадні наведалі Пастаўскі раён і правялі сумеснае пасяджэнне. На парадку дня былі пытанні эфектыўнасці абслугоўвання сельскага насельніцтва і канкурэнтаздольнасці арганізацый спажыўкааперацыі.**

Падчас наведвання гандлёвых кропак **старшыня праўлення Белкаапсаюза Валерый ІВАНОЎ** адзначыў, што для насельніцтва вельмі важныя тыя формы і традыцыйны асартымент тавараў, якія прапануе кампанія ў сваёй гандлёвай сетцы. «Мы выпрацоўваем натуральныя прадукты харчавання з адсутнасцю хімічных дабавак. Па цэнах таксама не саступаем сваім канкурэнтам. Я лічу: больш за 200 такіх буйных гандлёвых кропак па краіне — гэта не ўсё, на што мы здольныя», — адзначыў Валерый Іваноў. Паводле яго слоў, за апошнія гады рэзка змяніўся фармат гандлю ў крамах. «Мы адаптуемся пад патрэбы пакупніка як інтэр'ерам, так і якасцю. Увесь асартымент нашых буйных крамаў прысутнічае ў любым гандлёвым пункце ў сельскай мясцовасці. Нягледзячы на тое, што часта ўтрыманне гандлёвых пунктаў у некаторых сельскіх раёнах стратнае, знаходзім спосаб кампенсаваць гэты момант. У нас ёсць і такая форма работы, як выязны гандаль і гандаль па замове», — дадаў Валерый Іваноў. Пры гэтым, кажучы пра канкурэнцыю з іншымі, прыватнымі гандлёвымі сеткамі, якія паспелі ўжо ўкараніцца ў краіне, Валерый Іваноў адзначыў, што наяўнасць іншых гульцоў на рынку падганяе Белкаапсаюз да больш эфектыўных формаў работы.

У сваю чаргу прыватныя буйныя гандлёвыя сеткі настроены на развіццё партнёрскіх адносін з Белкаапсаюзам. Прадстаўнікоў бізнесу таксама запрасілі прыняць удзел у сумесным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. Па словах **аперацыйнага дырэктара гандлёвай сеткі «Еўраопт» Уладлена АТРОШКІНА**, яго кампанія разлічвае менавіта на партнёрства. «Мы перайшлі да прапрацоўкі канкрэтных кірункаў. Зможам супрацоўнічаць у рэгіёнах, дзе Белкаапсаюзу з аб'ектыўных прычын нязручна працаваць», — сказаў Уладлен Атрошкін. Гэта задача перад гандлёвай сеткай «Еўраопт» стаіць ужо ў 2018 годзе.

«Нам патрэбна не канкурэнцыя, а партнёрства, — выказаў сваё меркаванне **старшыня савета дырэктараў кампаніі «Тытунь-інвест» Павел ТАПУЗІДЗІС**. Яго кампанія ўжо рэалізуе праект па комплексным гандлёвым абслугоўванні насельніцтва ў сельскай мясцовасці ў Шклоўскім раёне сумесна з Белкаапсаюзам.

Падчас сумеснага пасяджэння **старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** падкрэсліў, што ў гандлёвым абслугоўванні сельскага насельніцтва намячаецца сур'ёзная канкурэнцыя. «Пры гэтым шматлікія сеткавікі пры арганізацыі гандлёвага абслугоўвання ў рэгіёнах арыентуюцца на раённыя цэнтры, дзе ўзровень даходаў насельніцтва вышэйшы», — дадаў ён. Кіраўнік Савета Рэспублікі падкрэсліў, што не варта забываць і пра жыхароў хутароў і аддаленых вёсак. Гэтыя пытанні павінны вырашацца ў тым ліку Саветамі дэпутатаў, выканкамамі.

«Неабходна шукаць магчымасці, каб спажыўкааперацыя больш гандлявала беларускімі прадуктамі, — заўважыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ.** — Яна павінна стаць пасярэднікам паміж вытворцам сельскагаспадарчай прадукцыі і рынкам. Трэба наладжваць цэхі перапрацоўкі, ствараць новыя працоўныя месцы, зніжаць сабекошт прадукцыі».

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# «ХОЧАЦЦА, КАБ МЫ АТРЫМАЛІ РЭАЛЬНАЕ МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Чаму не ведаюць пра дэпутатаў? Па-першае, таму, што з імі рэдка сутыкаюцца. Яны мала рэкламуюць сваю дзейнасць, што цалкам натуральна для грамадскіх дзеячаў. Па-другое, грамадзяне нават не ведаюць, чым займаюцца гэтыя людзі і якія ў іх паўнамоцтвы. Я не ўпэўненая, ці правільна раблю, калі ўвесь час падкрэсліваю, што яны грамадскія дзеячы. Можа, народ пачынае думаць: навошта хадзіць на выбары, што з іх узяць? З другога боку, падтрымліваць у насельніцтва ўпэўненасць у тым, што дэпутат мае тую рэальную выканаўчую ўладу, якой грамадзяне ў думках іх надзяляюць, я таксама не магу. Таму думаю, што тут патрэбна праўдзівая інфармацыя — проста як трэба як мага больш. І гэта, перш за ўсё, аповед простай мовай аб дзейнасці Саветаў — фармальны матэрыял у газеце ніхто чытаць не будзе, таму што гэта сумна. Трэба расказваць простымі словамі, што робіць дэпутат.

***— На любых выбарах кожны кандыдат агучвае канкрэтныя заявы — што ён зробіць, калі людзі аддадуць за яго свой голас. На жаль, рэалізацыя звычайна кульгае. Ці трэба неяк кантраляваць выкананне перадвыбарных абяцанняў?***

— Я не лічу гэта неабходным. Больш за тое, я думаю, што гэта перш за ўсё грамадская ўлада, дэпутаты працуюць у рамках закона аб мясцовым самакіраванні. Часцяком тое, што яны рэкламуюць, — гэта толькі намеры. Можа быць, яны нават не ведаюць, ці справяцца з гэтым. Як і ўсе грамадзяне, дэпутаты сутыкаюцца з праблемай выканання намераў. Чаму? Таму што не заўсёды эканоміка дазваляе іх выканаць. Напрыклад, калі дэпутат абяцае пабудаваць дарогу, ён жа ўсё роўна яе не пабудуе — можа толькі звярнуцца да мясцовых улад з адпаведнай просьбай.

Лепш за ўсё работа дэпутата відаць у вёсцы, таму што там мясцовае самакіраванне і ўлада прадстаўлена ў адной асобе — старшыні сельскага Савета. Гэта людзі, якія і прымаюць рашэнні, і выконваюць іх. Што датычыцца горада і раёна, то існуе падзел. У дэпутата ёсць просьбы, а вось ці зможа іх рэалізаваць выканаўчая ўлада?.. Таму я думаю, што у нас і так ёсць праблема пошуку кандыдатаў у дэпутаты і адпужваць іх справаздачамі не варта. Яны і так робяць карысць для насельніцтва, а мы яшчэ спрабуем прывязаць нейкую адказнасць. Не варта ставіцца да дэпутатаў мясцовых Саветаў занадта строга — прад'яўляць прэтэнзіі трэба не асобнаму прадстаўніку дэпутацкага корпуса, а выканаўчаму органу горада, раёна або рэгіёна.

***— Адмову ў рэгістрацыі на выбарах атрымалі 311 чалавек. Па якіх прычынах гэта адбылося?***

— Магу сказаць, што шэраг кандыдатаў у дэпутаты аспрэчылі гэтыя рашэнні. У тым жа Мінску было пададзена 25 скаргаў — і пяць з іх былі задаволены. У нас гэтая лічба ўвесь час мяняецца: хто-небудзь з кандыдатаў здымаецца — напрыклад, так званыя дублёры. Гэта людзі, якія ідуць, скажам так, у звязцы з асноўным кандыдатам. Яны сыходзяць, каб не перашкаджаць асноўнаму кандыдату, што натуральна, гэта сусветная практыка.

У асноўным усе адмовы былі абгрунтаванымі, хоць, можа быць, не абышлося без фармалізму. Напрыклад, частая прычына адмовы — памылкі ў запаўненні дэкларацыі аб даходах і маёмасці. У камісіі ёсць права зарэгістраваць кандыдата, нягледзячы на гэтыя недахопы, але можна і адмовіць, — звычайна выбіраецца другі шлях.

> У нас усе дэпутаты — гэта грамадскія дзеячы. Ні адзін з іх не валодае тым асабістым службовым подпісам, які можа размеркаваць матэрыяльныя рэсурсы.

Яшчэ адна прычына для адмовы — гэта памылкі пры запаўненні падпісных лістоў. Тут у прыклад можна прывесці адмову па фармальных падставах кандыдату па Барысаўскім раённым Савеце. Ён — інвалід-калясачнік, сам не змог падаць дакументы. Гэта зрабіў кіраўнік яго ініцыятыўнай групы — і чалавек дапусціў памылку ў напісанні акругі. Камісіі трэба было звярнуць на гэта ўвагу, ведаючы, што гэта за кандыдат, але яна не звярнула. Мы прапанавалі вярнуцца да разгляду гэтага пытання зноў — а аказалася, што названая асоба нават не сабрала неабходную колькасць подпісаў: трэба было 75, а ў яго было менш за 70. Памылкі былі дапушчаныя ў сувязі з несправтыкаванасцю групы. Хацела б сказаць, што гэты кандыдат пазней даслаў падзячны ліст у ЦВК, у якім адзначыў наш нефармальны падыход да яго праблемы і паабяцаў улічыць памылкі ў будучай кампаніі.

Рэгістрацыя і вылучэнне — гэта своеасаблівае чысцілішча. Любы чалавек, паступаючы на працу, праходзіць праз нейкія выпрабаванні. Па сутнасці, гэта першы экзамен для кандыдатаў, — і калі чалавек не можа яго здаць, то камісія мае права лічыць яго непадрыхтаваным.

***— Колькасць кандыдатаў у дэпутаты, маладзейшых за 30 гадоў, на цяперашніх выбарах — крыху больш за 5 %. Чаму моладзь неахвотна ідзе ў палітыку?***

— Перш за ўсё моладзь лічыць выбары справай старэйшага пакалення. Ды і ў цэлым маладыя людзі наогул пасіўныя ў гэтым плане па ўсім свеце, не толькі ў Беларусі. Яны часта не галасуюць, таму і не вылучаюцца, дыстанцуюцца ад гэтага працэсу. Моладзь лічыць выбары фармалізаваным і бюракратычным дзействам, для якога яны не саспелі.

Яшчэ адна прычына: моладзь проста не бачыць кандыдатаў, блізкіх па ўзросце. У сваю чаргу маладыя кандыдаты думаюць: навошта ім ісці ў гэта зборышча старых? Атрымліваецца замкнёнае кола. Уласцівасць усякай маладосці — пратэставаць супраць фармальных спосабаў існавання.

***— Калі казаць пра безальтэрнатыўныя акругі, то па абласных Саветах дэпутатаў у Гродзенскай вобласці іх — 40, а ў той жа Магілёўскай вобласці — ніводнай. З чым вы звязваеце такую карэляцыю?***

— Усё абсалютна звязана з работай мясцовых улад. Палітыка магілёўскіх абласных улад адназначна накіравана на тое, каб усе выбары праходзілі на альтэрнатыўнай аснове. Яны не чакаюць ініцыятывы партый, яны самі прымаюць меры да таго, каб падбіраць і спрыяць вылучэнню неабходнай колькасці кандыдатаў, каб іх было не менш за два на выбарчую акругу. Дарэчы, ніхто не скардзіцца, што ім так ужо цяжка ад гэтага, — я маю на ўвазе тых самых работнікаў мясцовых выканкамаў.

Што датычыцца Гродзенскай вобласці, то там кажуць: мы ж нікому не перашкаджаем, яны самі не вылучаюцца. Справа ў тым, што калі пусціць усё на самацёк, то мы можам наогул не атрымаць кандыдатаў, таму што гэты пост не з'яўляецца зайздросным, ён не дае даходаў і прэферэнцый. Так што ўсё залежыць ад рэгіянальнай палітыкі: там, дзе падбіраюць людзей, дзе з імі гавораць, будзе і альтэрнатыва. Дарэчы, па той жа Гродзенскай вобласці так не ўсюды: у самім Гродне акругі альтэрнатыўныя, функцыянуюць партыі.

***— Мінімальны бар'ер яўкі выбаршчыкаў на мясцовых выбарах не ўстаноўлены. Ня́даўна вы выказалі здагадку, што рэальны паказчык складзе больш за 60 %. Як змяняецца ўзровень яўкі, калі параўнаць з папярэднімі выбарчымі кампаніямі?***

— У асноўным яна на ранейшым узроўні. Паказчык на мясцовых выбарах, вядома, ніжэйшы, чым на прэзідэнцкіх. Але ж сапраўды ў гэтым выпадку бар'ера няма наогул, выбары адбудуцца пры любой яўцы, нават калі прагаласуюць толькі члены выбарчых камісій. Але ж мы не можам даводзіць сітуацыю да абсурду. Зноў скажу, што гэта «заслуга» мясцовых улад. Мяне не заўсёды задавальняе, калі яны заўзята працуюць на яўку выбаршчыкаў. Чаму? Таму што грамадзяне скардзяцца. Многія лічаць, што ўдзел у выбарах з'яўляецца свабодным рашэннем, таму людзі супраць таго, каб на іх ціснулі і рэкамендавалі наведаць выбарчы ўчастак па месцы працы ці вучобы.

> Калі пусціць усё на самацёк, то мы можам наогул не атрымаць кандыдатаў, таму што гэты пост не з'яўляецца зайздросным, ён не дае даходаў і прэферэнцый.

Я лічу, што няма нічога дрэннага ў тым, каб кіраўнік арганізацыі перагаварыў з падначаленымі і папрасіў іх паўдзельнічаць у галасаванні. Больш за тое, калі мне скардзяцца студэнты бюджэтнай формы, я ўвесь час ім кажу: хлопцы і дзяўчаты, а вам цяжка гэта зрабіць? Можна ж прагаласаваць як хочаце, але няма нічога ненатуральнага ў тым, каб паслухаць выкладчыка і прыняць удзел у выбарах.

Мая пазіцыя такая: з людзьмі трэба працаваць, ім трэба тлумачыць і настойліва прапаноўваць прыйсці на выбарчы ўчастак. Але ніякіх пагроз быць не павінна — гэта ўжо парушэнне канстытуцыйных правоў грамадзян. Няхай просьба назойлівая, але яна павінна быць у рамках закона.

***— У леташнім інтэрв'ю вы казалі, што ў прынцыпе не супраць таго, каб скасаваць сельскія Саветы і выбіраць кіраўнікоў пасёлкаў і маленькіх гарадоў прамым галасаваннем грамадзян. Якая ваша пазіцыя зараз?***

— Яна абсалютна не змянялася. Чаму? Таму што я хачу, каб у нашых маленькіх тэрытарыяльных адзінках мы атрымалі рэальнае мясцовае самакіраванне замест часам дэкаратыўных органаў. Калі выбары ў сельскі Савет праходзяць на безальтэрнатыўнай аснове і пры гэтым ні абраныя дэпутаты, ні грамадзяне не праяўляюць да гэтага цікавасць, то тады і орган працуе фармальна.

Існуе і функцыянуе толькі выканаўчая ўлада, якая прадстаўлена адным чалавекам — старшынёй сельскага Савета, які адначасова з'яўляецца і старшынёй сельвыканкама. Дык давайце гэтую рэальную ўладу будзем абіраць усім насельніцтвам. І тады ў нас, па-першае, конкурс будзе, а па-другое, гэта будзе рэальнае мясцовае самакіраванне, пра якое будзе ведаць насельніцтва.

***— Як змяняюцца ўчасткі для галасавання ў дачыненні да людзей з абмежаванымі магчымасцямі? Якія тут існуюць праблемы і як яны вырашаюцца?***

— Сапраўды, праблемы ёсць. На жаль, у нас далёка не ўсе ўчасткі маюць безбар'ернае асяроддзе. Гэта звязана з тым, што ўчасткі для галасавання размяшчаюцца і могуць размяшчацца толькі ў бюджэтных установах — і ўсё залежыць ад іх колькасці на пэўнай тэрыторыі. Часта на вялікі мікрараён гэта ўсяго адна школа, у якой могуць быць два-тры ўчасткі — і не факт, што яны будуць на першым паверсе.

Больш за тое, у нас ёсць перыяд датэрміновага галасавання, якое ажыццяўляецца не на першым паверсе ў холе школы, а на другім паверсе ў кабінеце завуча, напрыклад. Гэта звязана з тым, што ідзе навучальны працэс, камісія не павінна перашкаджаць дзецям. Вядома, у такім выпадку трапіць на ўчастак людзям з абмежаванымі магчымасцямі вельмі складана. Дарэчы, праблемы з рэгістрацыяй інваліда-калясачніка ў Барысаўскім раённым Савеце дэпутатаў паўсталі перш за ўсё таму, што камісія размяшчаецца на трэцім паверсе будынка, мужчына проста не змог туды падняцца. Я лічу, што наяўнасць безбар'ернага асяроддзя — гэта норма для ўсіх участкаў, але, на жаль, не ўсе ўваходныя месцы абсталяваны пандусамі.

Тым не менш робіцца многае. Цэнтральная камісія трымае гэта пытанне на кантролі. Больш за тое, да нас далучыўся БРСМ: валанцёры падчас галасавання будуць дапамагаць людзям з абмежаванымі магчымасцямі дабірацца і заходзіць. Вядома, яны будуць рабіць гэта толькі ў тым выпадку, калі названыя асобы не выберуць такі спосаб, як галасаванне дома.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

**(Працяг тэмы на стар. 4, 13–14)**



Фота БЕЛТА.

## ПЫТАННІ БЯСПЕКІ — НА ПАРАДКУ ДНЯ

**На гэтым тыдні органы ўнутраных спраў абследуюць участкі для галасавання ў мэтах гарантавання грамадскай бяспекі. Паводле рашэння міністра ўнутраных спраў, падчас датэрміновага галасавання і ў асноўны дзень выбараў прадугледжаны дадатковыя меры па ахове грамадскага парадку.**

— З 12 лютага будзе арганізавана кругласутачная работа аператыўна-сітуацыйных штабоў на розных узроўнях з мэтай эфектыўнага кіравання сіламі і сродкамі, задзейнічанымі ў забеспячэнні правапарадку. Асабовы склад пераводзіцца на ўзмоцнены варыянт нясення службы, — паведаміў **начальнік аддзела ўпраўлення аховы правапарадку ГУАПП МУС Уладзімір СТАНІЛЕВІЧ.**

Супрацоўнікі тэрытарыяльных органаў унутраных спраў будуць садзейнічаць выбарчым камісіям у падтрыманні парадку на ўчастках. Акрамя таго, памяшканні для галасавання возьмуць пад кругласутачную ахову.

ДАІ таксама будзе працаваць ва ўзмоцненым рэжыме. Супрацоўнікі аўтаінспекцыі папярэджваюць кіроўцаў, якія вырашаць прыехаць на выбарчыя ўчасткі на ўласным аўто, — дзесьці з'явіцца рэгуліроўшчык ці зменіцца рух з-за часовых дарожных знакаў.

Забяспечаны і супрацьпажарны маніторынг выбарчых участкаў, адпрацаваны схемы эвакуацыі, праведзены інструктажы.

У выпадку дрэннага самаадчування выбаршчыкаў на дапамогу прыйдзе дзяжурны медык. Пад увагай санітарных службаў таксама і месцы правядзення галасавання, і пункты харчавання выбаршчыкаў. Падрыхтаваны ўмовы для волевыяўлення пацыентаў на бальнічных выбарчых участках.

**Марыя ДАДАЛКА.**

ШТО КАЖУЦЬ...

# Партыйныя лідары пра выбары

**Камуністы робяць стаўку на моладзь, партыя працы — на рэгіёны, а лібералы стукаюць у дзверы выбаршчыкаў. Як партыі, што вылучылі самую вялікую колькасць прэтэндэнтаў на дэпутацкія партфелі, рыхтуюцца да мясцовых выбараў?**

**Георгій АТАМАНАЎ, першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта КПБ, другі сакратар ЦК КПБ:**

— Агітацыйны этап праходзіць згодна з нормамі і правіламі. Хацелася б, каб людзі больш актыўна рэагавалі на пікеты, улёткі, якія змяшчаюць праграмныя палажэнні. Важна, каб беларусы праявілі сваю грамадзянскую пазіцыю, прыйшлі і зрабілі свой выбар. Мы правялі з зарэгістраванымі кандыдатамі інструктыўныя заняткі, апублікавалі на сайце і ў газеце зварот да выбаршчыкаў і партыйную платформу. Прасілі сваіх прадстаўнікоў цікавіцца праблемамі выбаршчыкаў у акругах, дзе яны вылучаюцца. Рашэнне гэтых пытанняў знойдзе ўвасабленне ў праграмных выступленнях патэнцыйных дэпутатаў, затым у дакументах, якія будуць прымацца імі ў выпадку абрання.

Сярод нашых кандыдатаў прадстаўнікі розных прафесій і ўзростаў. Практычна кожны пяты кандыдат — ва ўзросце да 31 года. Сёлета мы вельмі стараліся далучыць моладзь да ўдзелу ў выбарах. Мэта простая — за імі будучыня. Маладыя людзі павінны пераймаць вопыт ветэранаў. І мы хочам, каб яны вучыліся працаваць і на выбарчых кампаніях, і падчас іншых палітычных мерапрыемстваў.

**Алег ГАЙДУКЕВІЧ, першы намеснік старшыні і кіраўнік выбарчага штаба Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі:**

— Я ўпэўнены: калі партыя не прымае ўдзел у выбарах — яна не існуе. Партыі для гэтага і створаны, каб удзельнічаць у выбарах, перамагаць і рэалізоўваць сваю праграму. Сёлета мы засяродзіліся на вылучэнні кандыдатаў у гарадскія і абласныя Саветы дэпутатаў. У Мінску вылучылі прэтэндэнтаў у кожнай акрузе — гэта 57 чалавек. Зарэгістравана з іх 49. Усяго вылучылі ад партыі 267 кандыдатаў (зарэгістравана 228 — **Аўт.**). Тыя, каго не ўключылі ў спіс, зрабілі памылкі ў дэкларацыях. Некаторыя знішчы мы абскардзілі і дзесьці нават даказалі, што не было значных памылак.

Асноўнае на сёлетніх мясцовых выбарах, на наш погляд, — гэта абыход кватэр, раздача ўлётак, размовы з выбаршчыкамі. Пікеты ў зімовы час неэфектыўныя — холадна, людзі спяшаюцца дадому.

Сёння прэтэндэнты ад нашай партыі прадстаўляюць магутную палітычную сілу, кожны кандыдат заўсёды змога на яе абаперціся. Мы прадстаўлены і ў парламенце, і ў Савеце Рэспублікі.

Мы стараліся вылучаць на выбары людзей справы. Выбаршчыкі не вераць у пустыя абяцанні. Яны ацэньваюць жыццёвы шлях, які прайшоў чалавек, узровень якога дасягнуў. Сярод нашых кандыдатаў — бізнесмены, дырэктары прадпрыемстваў, урачы, настаўнікі, рабочыя. У Мінску вельмі многа прэтэндэнтаў — прадпрымальнікаў сярэдняга і малога бізнесу. Менавіта яны ствараюць працоўныя месцы. Як бы людзі ні ставіліся да таго ці іншага кандыдата, галоўнае — прыйсці на ўчастак і зрабіць свой асэнсаваны выбар.

**Васіль ЗАДНЯПРАНЫ, старшыня Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці:**

— Падчас гэтай кампаніі, на жаль, у нас амаль палова акруговых камісій зарэгістравала па адным кандыдаце. Там, дзе ўнесены ў спіс па два і больш прэтэндэнтаў, кампанія ідзе значна цікавей. Нашы кандыдаты вельмі актыўна ўключыліся ў барацьбу. Яны друкуюць больш улётак сваіх праграмных заяў, заказваюць дадатковыя партыйныя сцягі для пікетаў.

На працягу кампаніі і ў выбаршчыкаў з'яўляецца цікавасць. Яны звяртаюцца да нас, тэлефануюць у цэнтральны апарат, просяць ахарактарызаваць кандыдатаў. Размаўляюць з самімі прэтэндэнтамі, просяць расказаць пра намеры па рабоце ў пэўных рэгіёнах.

Асноўнае палажэнне праграм нашых кандыдатаў — галоўная ўвага выбаршчыку. Калі чалавек працаўладкаваны, мае добры сацыяльны пакет, ён стараецца больш плённа выкарыстоўваць свае магчымасці на карысць сям'і, павышаць прафесійныя навыкі і падтрымліваць улады, якая забяспечвае такі ўзровень жыцця.

Кандыдаты ад нашай партыі больш прадстаўлены ў рэгіёнах. У сталіцы — толькі 18 чалавек (усяго зарэгістравана 177 членаў партыі — **Аўт.**). Сярод прэтэндэнтаў, членаў нашай партыі, людзі разнастайных прафесій — дырэктары школ, прадпрыемстваў, бізнесмены. Увогуле людзі, якія вядомыя ў тым рэгіёне, дзе яны балатуюцца.

**Марыя ДАДАЛКА.**

АСАБЛІВЫ ДЗЕНЬ

## ЯК НА СВЯТА

**Помню, у гады майго дзяцінства выбары дэпутатаў усіх узроўняў былі сапраўдным святам. Жанчыны даставалі з шафаў новыя строі, павязвалі на галаву квяцістыя хусткі. Калі выбарчы ўчастак знаходзіўся ў суседняй вёсцы, то збіраліся сем'ямі, наймалі вазніцу і ехалі галасаваць — з песнямі, жартамі. Вядома, часам бралі з сабой і нас, малых. На выбарчых участках гучала музыка, працаваў выязны гандаль. Найбольшую ж увагу прыцягваў буфет з печывам ды цукеркамі, куды пасля выканання свайго грамадзянскага абавязку заходзілі ўсе дарослыя — зразумела ж, з намі, дзецьмі. Назад усе вярталіся задаволеныя... Многія з тых традыцый захаваліся і сёння. У прыватнасці, на Міншчыне зрабілі ўсё магчымае, каб стварыць для людзей у дзень выбараў атмасферу свята. У кожным раёне і горадзе цэнтральнага рэгіёна падрыхтавана цікавая і насычаная праграма.**

— У Жодзіне не адмаўляюцца ад добрай традыцыі, — расказвае **Сяргей КОНАН, першы намеснік старшыні Жодзінскага гарвыканкама.** — Гандлёвыя прадпрыемствы і аб'екты грамадскага харчавання будуць прапаноўваць сваю прадукцыю на выбарчых участках. Ды справа ж не ў гэтым! Мы імкнёмся, каб людзі не толькі прагаласавалі, але і адпачылі, паслухалі музыку. А дзеці паласаваліся марожаным, печывам, сокам. Усё ж да тэмы выбараў трэба прыцягваць і малых грамадзян. Выбары — палітычны працэс, але для дзяцей гэта — гульня. І праз гульню трэба прывучаць іх да думкі, што неабходна займаць пэўную пазіцыю ў грамадстве, што выбары даюць такую магчымасць.

На кожным выбарчым участку Смалявіцкага раёна таксама будзе створана святочная атмасфера, зразумела, не абыдзецца без выступленняў найлепшых калектываў. У прыватнасці, парадуюць людзей народны духавы аркестр раённага Дома культуры, народны ансамбль песні «Смалянначка», народны фальклорны ансамбль «Жывіца», народны ансамбль песні «Пліса», народны ансамбль настаўнікаў Смалявіцкай дзіцячай школы мастацтваў «Ад шчырага сэрца» і іншыя. Для дзяцей і дарослых пройдуць спартыўныя мерапрыемствы. «А каб святочную атмасферу змог адчуць кожны, будзе арганізаваны падвоз грамадзян на выбары — для гэтага выдзелены транспарт», — паведаміў **старшыня Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Павел ГРАФУТКА.** У гэты ж дзень на Цэнтральнай плошчы пройдзе свята Масленіцы. Жыхары горада і раёна змогуць паласавацца блінамі, прыгатаванымі па розных рэцэптах, а таксама паўдзельнічаць у гульнях, конкурсах, спаборніцтвах.

У Стаўбцоўскім раёне, паводле слоў **Аркадзя КАЗЯКОЎСКАГА, старшыні раённага Савета дэпутатаў,** прадугледжаны канцэртная праграма і выязны гандаль там, дзе няма стацыянарных крам. У сельскай мясцовасці будзе наладжаны падвоз выбаршчыкаў на ўчасткі. Маладыя людзі, якія ўпершыню прымуць удзел у галасаванні, атрымаюць бясплатныя абанементы на наведванне фізкультурна-аздараўленчага комплексу.




Фота Святланы КІСЛАЙ.

## А Ў РУДНІ — «ЛАСУНАК»

**Каб выбаршчыкі не проста прыйшлі прагаласаваць на ўчасткі, але і адчулі атмасферу свята, у рэгіёнах стараюцца рэалізаваць цікавыя, крэатыўныя ідэі. Напрыклад, у Гарадоцкім раёне ў дні галасавання арганізуюць мерапрыемствы масленічнага тыдня.**

Скажам, у сераду, 14 лютага, адсвяткуюць масленічны «Ласунак». Па традыцыі з гэтага дня, акрамя бліноў, гаспадыні гатуюць іншыя смачныя стравы. А яшчэ ў сераду зяцям разам са сваімі жонкамі трэба хадзіць у госці да цешчы на бліны...

У гэты дзень падчас датэрміновага галасавання, у прыватнасці, у вёсцы Рудня адбудзецца ласуначнае свята. Там арганізуюць выязны гандаль як вядомы вытворца мясной прадукцыі «Ганна», так і індывідуальныя прадпрымальнікі. Жыхары населенага пункта пачаступяць землякоў масленічнымі блінамі па сваім рэцэпце з рознай начынкай. Перад імі выступяць самадзейныя артысты.

— І ў кожным сельвыканкаме вызначылі канкрэтныя дні, час і праграму правядзення масленічных мерапрыемстваў. Работнікі гандлю абяцаюць багаты выбар прадукцыі, а работнікі культуры створаць добры настрой... Усяго ў раёне больш за 17,5 тысячы выбаршчыкаў, 28 участкаў для галасавання, — паведаміла **намеснік старшыні Гарадоцкага райвыканкама па сацыяльных пытаннях Марына ЗДОЛЬНІКАВА.**

Як вядома, у нядзелю, 18 лютага, — галоўны дзень галасавання. І гэта дата супадае з праводзінамі Масленіцы. У гэты дзень нашы продкі традыцыйна накрывалі стол і ладзілі вясёлыя святы. Адпаведная культурная праграма ў раёне ўжо распрацавана.

## НЕ БУФЕТАМ АДЗІНЫМ

**Школу № 30 у Брэсце адкрылі ў 1989 годзе, і з той пары падчас выбарных кампаній яна служыць участкам для галасавання. Апошнім часам ва ўстанове адукацыі размяшчаюцца адразу два выбарчыя ўчасткі. Вось і цяпер участковыя камісіі пад нумарам 110 і 111 33-й выбарчай акругі прыступілі да работы. Галоўным чынам удакладняюцца спісы выбаршчыкаў, складаюцца планы і графікі дзяжурстваў.**

**Старшыня адной з камісій, дырэктар школы Аляксандр ЛЕВАНЧУК** гаворыць, што ў падрыхтоўчай рабоце дробязяў няма. Больш чым за тры дзясяткі гадоў удзелу ў выбарных кампаніях Аляксандр Пятровіч назапасіў багаты вопыт. Ён лічыць, што дзень галасавання павінен быць асаблівы, адметны не толькі работай буфета. Хоць апошняе таксама прадугледжваецца. Як заўсёды, наведвальнікам будзе прапанаваны багаты выбар кандытарскіх і кулінарных вырабаў, фрукты, напоі.

Але ж галоўнай асаблівасцю гэтых участкаў абяцае стаць канцэрт удзельнікаў школьнай самадзейнасці. Рэч у тым, што названая навучальная ўстанова доўгі час была вядомая ў горадзе як школа з эстэтычным ухілам. Гэта значыць, большасць яе вучняў спявалі, танцавалі, займаліся іншымі відамі мастацтваў. І хоць афіцыйна названы статус скасавалі яшчэ ў 2008 годзе, традыцыі і напрацоўкі засталіся. Вось і цяпер вакальныя ансамблі пад кіраўніцтвам Наталлі Карнялюк, Алены Рыжэнкі, Наталлі Панько, танцавальны калектыў Алены Кажалы, а таксама юныя салісты і музыканты рыхтуюцца выступіць 18 лютага.

— Вядома, прыйдуць бацькі, старэйшыя браты і сёстры артыстаў-школьнікаў, сябры і суседзі. Усё гэта нашы выбаршчыкі, — гаворыць Аляксандр Леванчук. — Канцэрт запланаваны з 11 да 12 гадзін, самы актыўны час, паводле шматгадовых назіранняў. Многія жыхары ўжо ведаюць пра традыцыйныя канцэрты і стараюцца запланаваць свой візіт менавіта на гэты час.

На добрую яўку тут спадзяюцца яшчэ і таму, што многія з цяперашніх выбаршчыкаў у свой час скончылі 30-ю школу, якая, дарэчы, носіць імя свайго выпускніка Дзмітрыя Гвішыяні. (Дзмітрый, курсант ваеннага вучылішча, загінуў, ратуючы людзей у палаючым цягніку.) Сюды любяць заходзіць школьныя таварышы Дзмітрыя. Дзень выбараў — яшчэ адна нагода.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## <u>Уладзімір ВАРАНКОЎ:</u>

# «У 60 Я ІГРАЮ РАМЭА!»

**Учора споўнілася пяць гадоў тэлеканалу «Беларусь 3». Адным з яго твараў стаў акцёр Уладзімір Варанкоў, які агучвае мядзведзіка Топу ў «Калыханцы». У гэтай праграме, дарэчы, як жартуе сам Уладзімір Міхайлавіч, ён «30 гадоў пад сталом». За яе і атрымаў «Тэлевяршыню». Зрэшты, гэты год стане юбілейным і для самога акцёра. Пра тэлебачанне, працу з вядомымі кінарэжысёрамі Валерыем Тадароўскім і Васілём Пічулам, здымкі ў кліпе гурта «Ленінград» мы распыталі Уладзіміра ВАРАНКОВА.**

***— Уладзімір Міхайлавіч, сёлета вам споўніцца 60. Час падводзіць вынікі?***

— Канчатковы вынік, на мой погляд, падводзіць рана, бо, на шчасце, я застаюся запатрабаваным артыстам. Свае 60 я раздзяліў бы на тры этапы па 20. Першыя 20 гадоў — гэта станаўленне. Я рос у шматдзетнай сям'і, у мяне чацвёра братоў. Мой бацька прайшоў вайну, пасля працаваў на заводзе, быў, дарэчы, дастаткова жорсткім чалавекам. Выхоўваў нас такім чынам, каб мы імкнуліся ўсяго дасягаць самастойна. Мама шмат гадоў працавала ў першай клінічнай бальніцы. Усе браты, як і бацька, пайшлі на завод. А ў мяне спрацавалі бабуліны гены. Яна ў вёсцы была замест тамады, з лёгкасцю арганізоўвала вяселлі, праводзіла пахаванні. Тата тады казаў: «Гэта цешча вінаватая». Таму, калі заканчваў школу, не стаяла пытанне, куды паступаць. Сказаў — насуперак волі бацькоў, — што пайду ў артысты.

У мяне, дарэчы, не адбылася мутацыя голасу, ад прыроды ён высокі. У лялечным тэатры на фальцэце дзве гадзіны іграў Бураціна. На міжнародных фестывалях паглядзець на мяне прыходзілі замежнікі — не верылі, што артыст можа вадзіць марыянетачную ляльку і размаўляць такім голасам. У пачатку 1980-х кіраўнік французскага тэатра лялек запрасіла мяне цішком у рэстаран і ўгаворвала, каб я застаўся за мяжой папрацаваць хоць бы на год. Але ў той час пра гэта не магло быць і размовы. Я — сакратар камсамольскай арганізацыі, і гэтым усё было сказана. Я тады, дарэчы, атрымаў прыз за найлепшую ролю, а Бураціна стаў сімвалам міжнароднага фестывалю тэатраў лялек.

***— Чаму выбралі тэатр лялек?***

— Калі я паступаў у тэатральна-мастацкі інстытут, гэта быў 1975 год, ішоў першы набор акцёраў тэатра лялек. Курс набіраў народны артыст Беларусі Анатоль Аляксандравіч Ляляўскі, і ён паклікаў мяне. А на «драму», з якой мы вучыліся разам, курс набіраў Барыс Іванавіч Луцэнка. Ён, дарэчы, дагэтуль часта ў мяне пытае, чаму я не прыйшоў да яго ў тэатр імя Горкага. Адказваю: таму што не паклікаў тады мяне на свой курс *(усміхаецца)*. Так пасля заканчэння я трапіў у тэатр лялек. І другі перыяд майго жыцця — калі я 20 гадоў адпрацаваў там. За гэты час з'явілася сям'я, нарадзіўся сын. І ў нейкі час я зразумеў, што ўпіраюся ў столь. У тэатр прыйшоў сын Анатоля Ляляўскага Аляксей, які і дагэтуль працуе там галоўным рэжысёрам. Яму хацелася ўсё зрабіць па-новаму. Можна было змірыцца, але акцёрскія амбіцыі мне не дазволілі, і я вырашыў сыходзіць. У той перыяд у маім жыцці пачало з'яўляцца кіно. Хаця тады не тое каб было забаронена здымацца. Проста ў тэатральных акцёраў была вялікая занятасць — ранішнія і вячэрнія спектаклі, гастролі — калі паехалі, то на месяц. Надыходзілі няпростыя часы перабудовы, трэба было неяк зарабляць. Я пайшоў у «Хрыстафор», тады яму было 10 гадоў, ён быў на піку сваёй папулярнасці.

> **«Тадароўскі доўга на мяне глядзеў і сказаў: „Я шукаю персанаж, і я яго знайшоў. Такога твару бухгалтара, які пракрагуся, я ніколі не бачыў».**

***— Чым вас так прывабіў «Хрыстафор»?***

— У той час можна было пайсці ў любы драматычны тэатр, але там ты залежны ад роляў, ад рэжысёра. У мяне было захапленне капуснікамі. Тады раптам усё стала дазволена, хацелася чагосьці новага. І мы стварылі дурня, я тады першы раз пераапрануўся ў жаночую сукенку. Мы грунтоўна заселі ў Маскве з «Хрыстафорам». Але калі пайшла размова пра канчатковы пераезд тэатра ў расійскую сталіцу, Яўген Крыжаноўскі не рызыкнуў. У яго былі чарговы раман, чарговы шлюб, нарадзілася дзіця... Праўда, і мне аднаму Рэгіна Дубавіцкая прапаноўвала пераехаць, я тады рабіў праграму з Кларай Новікавай. Не пагадзіўся, але гэта быў добры час: з «Аншлагам» паездзілі па Расіі, Казахстане. Я з гонарам кажу, што быў на Байкануры, на свае вочы бачыў запуск ракеты, пабываў у музеі гісторыі касмадрома...

***— А ўрэшце трапілі на тэлебачанне...***

— Ужо ў той перыяд, калі працаваў у лялечным тэатры, Ніна Шоба арганізоўвала «Калыханку», яны запрасілі туды вядучых акцёраў тэатра лялек — Валянціну Пражэеву і Уладзіміра Грамовіча. А нас, моладзь, падцягвалі ў якасці дублёраў. Некалькі першых гадоў я быў дублёрам. І вось ужо 30 гадоў агучваю мядзведзіка Топу. Было чатыры лялькі Топы — і ўсе рабіліся пад мяне. Прыходзілі ў «Калыханку» і новыя персанажы. Але Топа і Буслік, якога зноў вярнулі, — старажылы, на перадачы ледзь не з 3 дня яе арганізацыі. Вось так і атрымалася: спачатку было як хобі — для душы, а з часам ператварылася ў сапраўдную прафесію. Нават калі я сышоў з лялечнага тэатра, гэта маё захапленне засталося.



Фота БЕЛТА.

***— З чаго для вас пачыналася кіно?***

— Мяне ўбачыў маскоўскі рэжысёр, і мяне ўдала прадалі. Знакавая роля, калі мне сказалі, што для кіно я падыходжу, у карціне Валерыя Тадароўскага «Палюбоўнік». Мяне выклікала памочніца рэжысёра Таццяна Талькова. Тадароўскі доўга на мяне глядзеў і сказаў: «Я шукаю персанаж, і я яго знайшоў. Такога твару бухгалтара, які пракрауся, я ніколі не бачыў». На здымачнай пляцоўцы мне сказалі, што нічога асаблівага рабіць не трэба. «Сцэна будзе адбывацца на вашым фоне, вы толькі ў думках шукайце, як выкруціцца». Потым мне Алег Янкоўскі, які выконваў у фільме галоўную ролю, сказаў: «Вось ты думаеш усялякую лухту, а ўсе ходзяць і захапляюцца, як ён сыграў!» Так я зразумеў, што можна падмануць кіно.

Потым быў Васіль Пічул, вядомы па фільме «Маленькая Вера». Ён прыехаў да нас здымаць «Заставу Жыліна». Паклікаў мяне і сказаў: хачу, каб ты сыграў капітана НКУС. Капітан там не зусім звычайны. Гэта тып чалавека, які безліч разоў паступае ў тэатральны інстытут, а яго не бяруць. І ён прыйшоў сюды, і тут у яго тэатр. «Рабі што хочаш. Дазваляю нават рукапрыкладства ў сцэне допыту», — сказаў мне Пічул. Мы адыгралі, ён ледзь не ўпаў з крэсла. Я думаў, што зараз вылаецца... А ён сказаў, што не будзе нават рабіць другі дубль, бо больш я так не сыграю. І было пасля шмат карцін. Я сутыкнуўся з тым, што ў нашым кіно могуць павесіць шаблон камедыйнага артыста і глыбей ніхто не капае. А расійскія рэжысёры прыязджаюць — яны не ведаюць, хто ты, і можаш атрымаць нечаканую прапанову.

***— У вас увогуле разнастайнае акцёрскае амплуа — ад мядзведзіка Топы да разбітнога ваеннага ў кліпе гурта «Ленінград» «Бомба»...***

— Гэта працяг «дыягназу», вынесенага Валерыем Тадароўскім. Як мне расказалі, калі фотаздымкі акцёраў глядзеў Сяргей Шнураў, у мяне не было канкурэнтаў. Мой ён паглядзеў і адразу выбраў. Потым пабачыў мяне ўжывую, моўчкі кіўнуў — і я пайшоў пераапранацца, нават не ведаючы, якую ролю трэба сыграць. Кліп здымалі ў Палацы прафсаюзаў у Мінску, спатрэбіліся ўсяго суткі. Сяргей Шнураў паўдня быў з намі, адпісалі песню. Ён, дарэчы, вельмі адукаваны чалавек пры ўсёй сваёй знешняй неадпаведнасці. І побач з ім або сядзі ціхенька і слухай, або думай, што адказаць. Сустрэліся пасля выпадкова ў студыі «Панарама» ў Піцеры, я здымаўся ў крымінальным серыяле «Гончая». Ён павітаўся са мной, добра паразмаўлялі.

Прадзюсарская кампанія, якая робіць кліпы для «Ленінграда», шмат у Мінску здымае. Гэта больш танна. Расійскія акцёры, калі браць добрых, патрабуюць вялікія ганарары. А мы танненькія, харошанькія і таленавітыя.

***— Пасля 60 вы пачняце чацвёрты этап. Які́м ён будзе?***

— Ведаеце, зараз не тое што «Хрыстафор» састарэў, час іншы. Не тое што гумар не той, прыйшло новае пакаленне, і яно ўсё бачыць па-свойму. За што я сябе люблю, дык гэта за тое, што дагэтуль магу заставацца дзіцем *(усміхаецца)*. Гэта ў пашпарце мне 60, а на справе можна нуль прыбраць. Калі, дарэчы, выкрадаю на выхадныя ўнучку, сын кажа, за мяне баіцца больш, чым за яе. Спадзяюся, што ўдаецца захоўваць у душы падораныя прыродай і бацькамі наіўнасць і шчырасць. Таму і маё творчае жыццё працягваецца. Я цяпер разумею, што магу трапіць у любую афёру ў добрым сэнсе. Вось зараз удзельнічаю ў рэпетыцыях Сучаснага мастацкага тэатра. У 60 я іграю Рамэа! Рэжысёр Уладзімір Ушакоў кажа: я разумею, што нас за гэта не пахваляць, але ўявім, што героі Шэкспіра засталіся жыць. Там чатыры пакаленні: чатыры Рамэа, чатыры Джульеты. Прэм'ера прызначана на 13 лютага. Рэпетыцыі ідуць не ў тэатры, а ў асобнай арт-прасторы, дзе сустракаюцца такія ж апантаныя, якія хочуць чагосьці новага, зборная акцёраў з розных тэатраў. Я зразумеў, што такіх, як я, вар'ятаў у кожным тэатры хапае.

> **«Расійскія акцёры, калі браць добрых, патрабуюць вялікія ганарары. А мы — танненькія, харошанькія і таленавітыя».**

Працягваецца і мая праца на тэлебачанні. Вось зараз — пяцігоддзе тэлеканала «Беларусь 3». Вяртаюся на зямлю, бяру мядзведзіка Топу і прадстаўляю канал. Я з'яўляюся яго тварам, паколькі ў 2016 годзе ўзнагароджаны «Тэлевяршыняй» па выніках галасавання гледачоў. Здавалася б, 30 гадоў пад сталом, цябе не бачаць і не ведаюць. Гэта не так, мяне ведаюць усе. Напэўна, калі б застаўся ў адным тэатры, атрымаў бы званні, працаваў бы сабе спакойна. Але гэта не для мяне, мне было б сумна. Галоўнае ж — не ўзнагароды. Сын аднойчы ў мой камп'ютар залез і здзівіўся: у цябе столькі фільмаў! Так, я здымаўся з многімі расійскімі зоркамі. Напрыклад, у Дзмітрыя Баршчэўскага ў «Цяжкім пяску», там цалкам «зорны» склад. У мяне там вельмі добрая роля, я сыграў фатографа. Запрашалі тады, чарговы раз, дарэчы, застацца ў Маскве, я быў вельмі запатрабаваны.

***— А што не атрымалася ў жыцці?***

— Так, у гэтага вясёлкавага малюнка ёсць і цёмны бок. Я страціў сям'ю. Мы засталіся з жонкай Юляй сябрамі, але яна ў 1999 годзе паехала ў Амерыку. І для яе ўдарам было не столькі тое, што я не паехаў, а што сын вырашыў застацца са мной. Я зразумеў, што новай сям'і не будзе, бо ёсць сын і ўнучка Мар'яна, ёй ужо 10. Юля часта прыязджае ў Беларусь. Дарэчы, калі сын ажаніўся, яго цешча падарыла яму машыну. Я сказаў Юлі: вось так трэба жыццё пачынаць, тады ніхто нікуды не з'едзе *(усміхаецца)*.

Некалькі разоў можна было перайначыць жыццё. Барыс Іванавіч Луцэнка запрашаў у рускі тэатр на канкрэтную ролю. Тады ішоў знакаміты спектакль «Кабала святош» паводле Булгакава. Філатаў іграў Мальера і трагічна загінуў. Луцэнка мне казаў, што гэта мая роля, можна было рэзка змяніць лёс. А я адмовіўся. Былі магчымасці застацца ў Маскве некалькі разоў, калі клікалі... Але я ні аб чым не шкадую.

***— Як звычайна адпачываеце?***

— Я вельмі лёгкі на пад'ём. Прыходжу, стаміўшыся пасля навагодніх ёлак, а сын кажа: а паехалі куды-небудзь. І 16 студзеня мы паляцелі ў Егіпет. Я, праўда, хацеў паехаць з унучкай. А Каця, мая нявестка, кажа: толькі з намі. Ну, кажу Мар'яне, што рабіць, трэба іх браць. Мы тыдзень правялі ў Егіпце. Што зарабілі на Новы год, на тое і адпачылі. Ці вось на выхадных з сябрам сабраліся і паехалі ў Вільнюс да нашага таварыша ў госці. Змена абстаноўкі для мяне вельмі важная.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Аўторак, 13 лютага

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.05** Зона Х. (16+).
**9.10, 22.15 Серыял «След». (16+).**
**10.55, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Двайная суцэльная». (16+).**
**13.10** Дзіцячы доктар.
**13.45** Дзень з вялікім горадзе.
**14.45, 15.25 Серыял «Паміж намі, дзяўчынкамі». (12+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Алімпійскі дзённік. Пхёнчхан-2018.
**23.45** Сфера інтарэсаў.
**0.45** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 19.30** Тэлебарометр.
**9.05, 19.35 Серыял «Сляпая». (16+).**
**10.20, 17.35 Серыял «Ганна-дэтэктыў». (16+).**
**12.20, 21.30, 22.05** «Арол і рэшка. Юбілейны». (16+).
**13.15, 20.35** «Паненка-сялянка». (16+).
**14.20** «Бітва салонаў». (16+).
**15.20 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме». (16+).**
**16.15, 0.45** Нічога сабе ньюз. (12+).
**16.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.05** «Багіня шопінгу». (16+).
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА.1/8 фіналу. Першы матч. «Базэль» (Швейцарыя) — «Манчэстэр Сіці» (Англія).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 20.15** «Беларуская кухня». Грыбны суп.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.35 «Ганна Герман». Маст. фільм. 1-я серыя (12+).**
**9.20, 17.55** «Каралі эпізоду». Зіновій Герт (12+).
**10.05** «Камертон». Кампазітар Вячаслаў Кузняцоў.
**10.30, 16.30 «Удалечыні ад Радзімы». Маст. фільм (12+).**
**12.20, 23.10** «Легенды музыкі». Ганна Герман (12+).
**12.45** «Славянскі базар у Віцебску — 2006».
**13.40** «Наперад у мінулае».
**14.05** «Старажытнае слова. Лёс Міхаіла Баброўскага». Дак. фільм (12+).
**14.30, 22.20** «Выззваліцелі. Танкісты». Дак. серыял (12+).
**15.15, 21.05 «Месца сустрэчы змяніць нельга». Маст. фільм. (12+).**
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.40** «Калыханка» (0+).

### Беларусь 5

**7.30** Алімпійскія гульні. Пхёнчхан-2018. Дзённік.
**7.55** Алімпійскія гульні. Пхёнчхан-2018. Гарнальныя спорт. Хуткасны спуск. Мужчыны. Слалам. Мужчыны.
**10.25** Алімпійскія гульні. Пхёнчхан-2018. Сноўборд. Хафпайп. Жанчыны. Фінал.
**11.30** Алімпійскія гульні. Пхёнчхан-2018. Лыжны спорт. Індывідуальны спрынт. Мужчыны. Жанчыны.
**12.50** Алімпійскія гульні. Пхёнчхан-2018. Шорт-трэк. Лыжны спорт. Канькабежны спорт.
**16.00** Тэніс. Турнір WTA. Доха.
**19.05** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**19.35, 0.40** Алімпійскія гульні. Пхёнчхан-2018. Вынікі дня.
**19.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/16 фіналу. 1-ы матч. «Црвена Звезда» (Сербія) — ЦСКА (Расія). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**22.00** Спорт-кадр.
**22.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. 1-ы матч. «Ювентус» (Італія) — «Тотэнхэм» (Англія). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Наша жыццё».
**10.00** «Жыць здорава!» (12+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10, 19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Спартклуб» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**20.00** «Час».
**21.10 Серыял «Чужая дачка» (16+).**
**23.10 Серыял «Медсястра» (12+).**
**1.10** «Начныя навіны».

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 17.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**8.50, 21.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40, 20.15** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30, 21.55** «Глядзець усім!» (16+).
**11.50, 17.50 «Важняк. Гульня навылёт». Серыял (16+).**
**13.50, 23.25 «NEXT-3». Серыял (16+).**
**15.40** «Легенды СССР» (16+).
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**1.00 «Салдаты-12». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00** «Любімыя акцёры». Яўген Лявонаў (16+).
**6.30** «Добрай раніцы, свет!» (16+).
**7.35, 13.15 Серыял «Кураж» (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.00** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00, 2.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара» (16+).**
**19.20 Серыял «Порах і шрот» (16+).**
**22.10 Маст. фільм «Ад турмы і ад торбы» (16+).**
**0.00** «Навіны ў поўнач».
**0.10 Маст. фільм «Крызіс веры» (16+).**
**3.00 Серыял «Спрут» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 22.30, 23.10 Серыял «Лабірынты». (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу .
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.40 Серыял «Сямейны дэтэктыў». (12+).**
**22.10** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**1.00** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.50, 8.10 Серыял «Мухтар. Новы след». (16+).**
**8.50 Серыял «Сужэнцы». (16+).**
**9.40, 23.05** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «Паедзем, паядзім!» (0+).
**14.20 Серыял «Хвост». (16+).**
**16.35, 19.40 Серыял «Неўскі. Праверка на трываласць». (16+).**
**21.20 Серыял «Інспектар Купер. Нябачны вораг». (16+).**
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Бальзакаўскі ўзрост, або Усе мужыкі — сво...» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.55, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (6+).
**7.15, 23.10 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.05 Серыял «Дама пад вэлюмам».**
**9.00, 20.00 Серыял «Дэтэктыўнае агенцтва «Месяцавае святло» (16+).**
**10.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**11.00 Драма «Боні і Клайд» (16+).**
**13.00 Серыял «Палюбоўнікі пустыні» (16+).**
**14.30 Камедыя «Паласаты рэйс» (12+).**
**16.00** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**16.05** «Мультпарад».
**16.30** «Сад і агарод».
**17.30 Серыял «Горад прышэльцаў» (16+).**
**19.00 Серыял «Абаронца» (16+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**21.15 Камедыя «Адзін шанц на дваіх» (12+).**



## Ні рыба ні мяса... ні закраса

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» — віктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**мачу́лішча** — месца, дзе мочаць лён ці каноплі;
**каме́ль** — ніжняя частка дрэва, якая прылягае да кораня;
**пабла́жлівы** — нястрогі, велікадушны;
**дасціпны** — трапны, знаходлівы;
**вартасць** — каштоўнасць, цана;
**закра́са** — прыправа ў ежу;
**рот ніколі не закрываецца** — пра таго, хто любіць шмат і доўга гаварыць (беларуская сінонімы: *язык без касцей, язык па-за вушамі ходзіць;* рускі адпаведнік: *слабый на язык, рот не закрывается);*
**ні рыба ні мяса** — пра пасрэднага чалавека, які нічым не вызначаецца (беларусы яшчэ скажуць: *ні тое, ні сёе, не бог ведае які, ні два ні паўтара;* руская: *так себе, с серединки на половинку).*

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### ВТБ

**6.00, 15.10** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20, 4.20** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**7.40, 4.35** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.00, 4.55** М/ф «Джынглікі». (0+)
**8.30, 3.30** «Ералаш». (6+)
**9.20, 19.00** Серыял «Маладзёжка. Дарослае жыццё». (12+).
**10.25** Камедыя «Маё вялікае грэчаскае вяселле». (12+).
**12.10** Скетч-шоу «Студэнты». (16+).
**13.10, 20.00** «Супермамачка». (16+).
**14.10, 2.40** Серыял «Як я стаў рускім». (16+).
**16.50, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50, 22.45** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.00** Камедыя «Больш, чым сябар». (12+).
**0.00** Серыял «Карабель». (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**1.50** Серыял «Метад Лаўровай». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Легенды сусветнага кіно». Алег Яфрэмаў.
**7.05** «Пешшу...» Масква пісьменніцкая.
**7.35, 20.05** «Правілы жыцця».
**8.10, 22.20** «Ціхі Дон». Серыял.
**8.55** «Вясёлы жанр невясёлага часу». Дак. серыял.
**9.40, 19.30** Галоўная роля.
**10.15, 17.45** «Назіральнік».
**11.10, 0.40** ХХ стагоддзе. «Акуна Матата. Страчанае пакаленне». 2000 год.
**11.55** «Геній».
**12.55** «Саці. Нясумная класіка...»
**13.35, 20.45** «Раскрыццё тайн Вавілона». Дак. фільм.
**14.30** «Прастора круга».
**15.10** «Сяргей Дарэнскі. Урокі майстэрства». Дак. фільм.
**16.00** «Пятае вымярэнне».
**16.30** «2 Верні 2».
**17.20, 23.10** «Заўтра не памрэ ніколі». Дак. серыял.
**18.45** «Чыстая перамога. Бітва за Эльбрус».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**21.40** Штучны адбор.
**0.00** «Тым часам».
**2.35** «Сусветныя скарбы».

### Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Юрый Грымаў. 1997 год (16+).
**6.40, 8.35, 9.40, 14.15, 15.40, 17.00, 17.35, 19.05, 20.25, 21.40, 23.00, 23.35, 5.15** Музычная настальгія (12+).
**7.20** «Вас запрашае Міхаіл Жванецкі». 1987 год (12+).
**9.00** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Таленты і іх прыхільнікі». 1993 год (16+).
**9.50** Маст. фільм «Пункт вяртання» (16+).
**12.00** Маст. фільм «Выхаванне жорсткасці ў жанчын і сабак» (16+).
**15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**16.00, 22.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**17.30** «Сядзі і глядзі» (16+).
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «500 дзён, якія не ўзрушылі свет». 2006 год (16+).
**19.20** Маст. фільм «Міраж». 1-я серыя (16+).
**23.20** «Час пік» з Андрэем Разбашам. 1995 год (16+).
**0.00** «Вакол смеху». «Спорт. Які лік?» 1980 год (12+).
**1.30** «Зямля — Паветра». Дэцл. 2003 год (16+).
**3.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**4.00** Маст. фільм «Я цябе ненавіджу» (16+).
**5.40** Маст. фільм «Лімонны торт» (16+).

### EuroSport 1

**3.00, 17.30, 22.00** Пхёнчхан-2018. «Алімпійскія гульні»-экстра.
**3.30, 22.30** Пхёнчхан-2018. «У пагоні за гісторыяй».
**3.40, 7.00, 10.30** Пхёнчхан-2018. Сноўборд.
**5.30, 9.00, 11.00, 18.30, 23.30, 2.30** Пхёнчхан-2018. Горныя лыжы.
**10.15, 13.15** Пхёнчхан-2018. Алімпійскія навіны.
**11.30, 14.00, 18.00, 22.40** Пхёнчхан-2018. Лыжныя гонкі.
**12.45, 15.45, 19.00, 23.00, 0.30** Пхёнчхан-2018. Шорт-трэк.
**13.30, 16.45, 19.30, 0.00** Пхёнчхан-2018. Санны спорт.
**20.00, 1.00** Пхёнчхан-2018. Экстрым.
**20.30, 1.30** Пхёнчхан-2018. Хакей.
**21.00, 2.00** Пхёнчхан-2018. Лыжныя віды.

### Кінакамедыя

**1.05** Камедыя «Кахае не кахае». (16+).
**3.05** Камедыя «Кур'ер». (16+).
**4.55** Камедыя «Лос-Анджэлеская гісторыя». (16+).
**6.40** Камедыя «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі». (12+).
**8.35** Камедыя «Ягуар». (16+).
**10.35** Камедыя «Касякі». (16+).
**12.10** Меладрама «Дапамажыце стаць бацькам». (16+).
**14.00** Камедыя «Сутэнёр». (16+).
**15.45** Камедыя «Шалёныя суседзі». (16+).
**17.30** Камедыя «Гэты няёмкі момант». (16+).
**19.30** Камедыя «Паліцэйская гісторыя». (12+).
**21.25** Камедыя «Паліцэйская гісторыя-2». (12+).
**23.50** Камедыя «Увесь гэты джэм». (12+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.25** «Доктар І...» (16+).
**8.55, 19.00, 2.25** «Асколкі». Серыял (16+).
**10.40, 4.05** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.15, 18.00** «Сакрэты экстрасэнсаў» (16+).
**13.05, 16.55** «Варажбітка» (12+).
**14.05** «Паралельны свет» (12+).
**15.00** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.35** «Простыя складанасці» (12+).
**16.05** «Натуральны адбор» (12+).
**20.50** «Адзін дзень, адна ноч». Серыял (12+).
**21.50** «Нераскрытыя тайны» (12+).
**22.45, 5.30** «Гісторыі выратавання» (16+).
**23.15** «Нябёсы, якія абрынуліся». Серыял (16+).
**0.00** «Стартап». Серыял (16+).

### ТБ1000

**6.10, 17.40** Іржа і костка (18+).
**8.35** Пераправа (16+).
**11.05** Найлепшае ўва мне (12+).
**13.25** Сэрцаед (16+).
**15.35** Барвовыя рэкі (16+).
**20.10** Выбар (16+).
**22.20** Экстрасэнс (16+).
**0.25** Найноўшы запавет (18+).
**2.35** Кірмаш ганарыстасці (12+).
**4.55** Загадкавая гісторыя Бенджаміна Батана (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Апошні забой. (16+).
**8.05** Зязюля. (16+).
**10.10** Клінч. (16+).
**12.10** Не баліць галава ў дзятла. (6+).
**13.45** Дом. (16+).
**16.20, 4.20** Грамадзянка Кацярына. Серыі 1—2-я. (12+).
**18.20** Кампенсацыя. (16+).
**20.20** Каханне ў горадзе анёлаў. (16+).
**22.10** Івановы. (12+).
**0.15** Знаходка. (18+).
**2.20** Білет на Vegas. (16+).

### National Geographic

**6.00** Інжынерныя ідэі. (12+).
**6.50, 10.55** Сапраўдны суперкар. (12+).
**7.40, 16.25, 20.25** Аўта-SOS. (12+).
**8.30** Зона 51: сакрэтныя файлы ЦРУ. (16+).
**9.15** Цуды інжынерыі. (12+).
**10.10** Шаша праз пекла. (12+).
**11.40** Пачатак. (16+).
**12.30** Займальная навука. (12+).
**13.15** Чалавек супраць YouTube. (16+).
**14.50** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха. (16+).
**15.35, 19.35, 0.15, 2.40** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**17.10** Тайны Гроба Гасподняга. (16+).
**18.00, 22.00, 1.05, 4.20** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**18.45** Зона 51: сакрэтныя файлы ЦРУ. (16+).
**22.45** Джон Ф. Кенэдзі: апошнія гадзіны. (12+).
**23.30, 5.10** Паранармальнае. (16+).
**1.50** Выкраданне месяцавага камення. (12+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары.
**9.00, 15.00, 21.00, 6.20** Як гэта ўстроена?
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на склады.
**11.00** Мотабітва.
**14.00, 7.10** Выжыць любой цаной.
**18.00** Тэсла: рассакрэчаныя архівы.
**19.00, 5.30** У пагоні за класікай.
**20.00, 1.00** Залатая ліхаманка.
**0.00** Каралі грузавікоў.
**2.55** Хаос у дзеянні: кадры відавочцаў.

## Тэлесеткі

## ПЕРАМЕНА МЕСЦАЎ СКЛАДНІКАЎ

**Да фіналу нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне» застаўся роўна тыдзень, і на сённяшні дзень спрэчныя моманты з яго ўдзельнікамі нібыта вырашаны.**

Так, расіянка Сафія Лапіна адмовілася падпісваць кантракт з арганізатарамі і такім чынам выбыла з конкурснай гонкі — фіналістаў засталося ўсяго 10. Яшчэ два ўдзельнікі, каб не парушаць правілы адбору, паводле рэкамендацыі Белтэлерадыёкампаніі ўнеслі змяненні ў свае заяўкі: гурт Shuma — у тэкст песні, Alekseev — у мелодыю.

З улікам змяненняў, якія адбыліся ў складзе канкурсантаў, 16 лютага ў гала-канцэрце ў прамым эфіры фіналісты выступяць у наступным парадку: 1. Adagio. 2. Alekseev. 3. Shuma. 4. Napoli. 5. Анастасія Малашкевіч. 6. Гюнеш. 7. Радыёхваля. 8. Alen Hit. 9. Lexy Weaver. 10. Кірыл Гуд. Пераможца нацыянальнага адбору будзе абраны сумесным галасаваннем журы і гледачоў па звыклай схеме 50х50.

**• Тым часам**

Ужо вядома, што прадстаўнік Беларусі на «Еўрабачанні-2018» выступіць 8 мая ў першым паўфінале разам з артыстамі з Азербайджана, Албаніі, Арменіі, Аўстрыі, Балгарыі, Бельгіі, Грэцыі, Ізраіля, Ірландыі, Ісландыі, Кіпра, Літвы, Македоніі, Фінляндыі, Харватыі, Чэхіі, Швейцарыі і Эстоніі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

ТЭНДЭНЦЫІ

# ...А МОЛАДЗІ СТАЛА БОЛЬШ

## Пра палітычную культуру, электаральную актыўнасць і псіхалагізм выбараў

**ЧАСАМ статыстыка можа расказаць нам больш, чым самы красамоўны аратар. Адна справа, калі гэта датычыцца эканамічных паказчыкаў. Іншая — тэндэнцый у грамадстве. Менавіта іх і вывучаюць сацыёлагі з дапамогай апытанняў, афармленых у выглядзе графікаў і лічбаў, хоць па факце даследуюць пануючае меркаванне людзей. У тым ліку і электарату падчас перадвыбарчай кампаніі. Пра гэты бок выбараў і агульны палітычны фон краіны «МС» расказаў Давід РОТМАН, дырэктар Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў, доктар сацыялагічных навук, прафесар.**

Падчас прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў на выхадзе з участкаў сацыёлагі традыцыйна праводзяць апытанні, хто за каго аддаў свой голас — гэта называецца экзітпол. У выпадку мясцовых выбараў складана дакладна сказаць, як яго праводзіць. «Калі б у нас выбары праводзіліся па партыйнай сістэме, то можна было б ладзіць экзітполы. Тады б высвятлялася, колькі галасоў аддадзена за тую ці іншую партыю. У нас жа выбары мажарытарныя (за каго прагаласавала большасць), і, атрымліваецца, апытанне трэба праводзіць побач з кожным участкам, бо галасуюць жа за пэўнага кандыдата», — тлумачыць сацыёлаг.

Якое з гэтага выйсце? Праводзіць «мабільныя» экзітполы. Гэты спосаб Цэнтр ужо апрабаваў падчас мінулых парламенцкіх выбараў. Так, пэўныя блокі акруг адбіраюцца па спецыяльным разліку, унутры блока абіраюцца выпадковыя ўчасткі, і затым інтэрв'юеры стаяць не ў адным месцы з раніцы да вечара, а на аўтамабілі па вызначаным маршруце перасоўваюцца і працуюць па гадзіне на кожным выбарчым участку. «Гэта сістэма працуе, у прынцыпе. Праўда, пакуль попыту на такога плана даследаванні няма», — канстатуе Давід Ротман.

> На жаль, з просьбамі правесці экзітпол ні адна беларуская палітычная партыя не звярнулася.

«У нас партыйная сістэма пакуль не вельмі эфектыўна функцыянуе, таму што большасць нашых грамадзян яшчэ не адаптавалася да такой сістэмы. Зараз гэта праблема абмяркоўваецца, і, спадзяюся, у хуткім часе мы пяройдзем да змешанай сістэмы выбараў (мажарытарнай і прапарцыянальнай). Але на сёння рэйтынг партый вельмі нізкі, — адзначае сацыёлаг. — Хоць часта яны самі вінаватыя ў сваіх няўдачах».

Што датычыцца электаральнай актыўнасці, то, як паказваюць сацыялагічныя даследаванні, яна найбольш высокая падчас прэзідэнцкай кампаніі, ніжэйшая — на парламенцкіх і самая невысокая — падчас выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў. «Па нашым прагнозе, яўка складзе не меней за 55 %. Гэты паказчык залежыць ад важнасці, якую надаюць людзі выбарам. Падчас прэзідэнцкіх людзі, на іх думку, абіраюць таго, хто за ўсю краіну адказвае. А тут — асобныя кандыдаты... І хоць ёсць заявы, што сёлетняя кампанія досыць пасіўная, усё адно вылучана нямала кандыдатаў, працуюць пікеты. У любым выпадку кандыдатам варта імкнуцца часцей бачыцца з насельніцтвам, праводзіць сустрэчы, каб звярнуць на сябе ўвагу», — раіць дырэктар Цэнтра.



Канкурэнцыя ў акругах ёсць, таму варта сябе праяўляць. Толькі тады людзі пачнуць думаць і выбіраць, а не аддаваць свой голас выпадкова. «Тут усё нескладана: трэба не ленавацца, а актыўна працаваць, — мяркуе Давід Ротман. — Кандыдаты ў дэпутаты, якія ідуць «у народ», павінны ведаць аб праблемах і патрэбах людзей у іх акрузе. А для гэтага трэба з імі бачыцца, сустракацца, размаўляць. Пакуль гэтага не будзе, стаўленне да выбараў у мясцовыя Саветы застанецца нейтральным, калі не негатыўным. «Шэрасць» мясцовых выбараў шмат у чым тлумачыцца не самым яркім праяўленнем кандыдатаў. Ім варта не абмяжоўвацца выступленнем у СМІ і ўдзелам у пікетах».

Сярод галоўных каштоўнасцей чалавека — не толькі ў Беларусі, але і шмат у якіх іншых краінах — на першым месцы аказваецца сям'я, на другім — праца, на трэцім — сацыяльны капітал (сябры, знаёмыя). Таму часцей за ўсё да дэпутатаў звяртаюцца з асабістымі праблемамі. Але калі гэтыя тры асноўныя патрэбы — сям'я, праца, сябры — не закрытыя, то на астатнія, накшталт палітыкі, рэлігіі, культуры, увагі звяртаецца ўсё менш. «Галоўнае, каб ствараліся ўмовы для поўнай рэалізацыі першасных каштоўнасцяў. Інакш пра якую электаральную актыўнасць можна казаць?» — задае рытарычнае пытанне Давід Ротман.

> Варта павышаць палітычную культуру і саміх кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў. Праводзіць для іх спецыяльныя семінары, на якіх вучылі б правільна гаварыць і нават апранацца.

І трэба пачынаць з таго, каб працаваць менавіта з моладдзю. «Дарэчы, у сёлетняй кампаніі маладых людзей удзельнічае значна больш, чым у мінулыя разы. Думаю, што паступова пачало прыходзіць разуменне, што, калі станеш дэпутатам, ёсць шанц штосьці змяніць да лепшага. Амаладжэнне заўважна і ў парламенце, і сярод кадраў дзяржаўных органаў. Але вельмі гэтым захапляцца не варта, бо таксама важна, каб рашэнні прымалі і людзі з досведам. А ён набываецца тады, калі чалавек паступова дасягае прафесійных вышынь, а не ў адзін момант», — лічыць вучоны.

На жаль, згубілася традыцыя выхоўваць сабе спадкаемца, які б змог працягнуць справу вопытнага палітыка і пераняць яго досвед. «Нам сапраўды гэтага не хапае. Бо хочам мы таго ці не, але на наша месца прыйдзе маладая змена. І ўжо ад яе рашэнняў і памылак (якія можна папярэдзіць, калі правільна выхаваць моладзь) будзе залежаць наша жыццё, — адзначае Давід Ротман. — Але чаму мы пра гэта не дбаем сёння? Можна было б праводзіць майстар-класы, сустрэчы з вядомымі грамадскімі і палітычнымі дзеячамі. Ніколі не позна пачаць гэта рабіць. Бо палітычная кампанія адбываецца раз на некалькі гадоў, а палітычнае жыццё не спыняецца ніколі».

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

НА ДУМКУ ПАЛІТОЛАГА

# Час актывізавацца... прайшоў?

**На мінулых выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў, якія праходзілі ў сакавіку 2014 года, толькі 3,4% кандыдатаў былі вылучаныя ад палітычных партый. Больш за ўсё — ад камуністаў, ліберал-дэмакратаў і партыі «Справядлівы свет».**

Сёлета 12 партый вылучылі сваіх кандыдатаў. Беларуская аграрная партыя і Беларуская партыя «Зялёных» — толькі па два ад кожнай. Апазіцыйныя партыі БНФ, Грамада і АГП праявілі сябе крыху актыўней — вылучылі 23, 54 і 71 кандыдата адпаведна. У лідарах, як заўсёды, аказаліся найбольш буйныя партыі — Камуністычная партыя Беларусі, Ліберальна-дэмакратычная партыя і Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці — 409, 228 і 177 кандыдатаў адпаведна. Але разам з тым на 18 111 выбарчых акруг зарэгістравана толькі 22 278 кандыдатаў (21 227 з якіх, дарэчы, беспартыйныя). Гэта значыць, у большасці акруг выбары будуць безальтэрнатыўнымі. А партыйныя кандыдаты складаюць толькі 4,7 % ад усіх зарэгістраваных.

Перадвыбарную сітуацыю па просьбе журналіста «МС» пракаментаваў **Пётр ПЯТРОЎСКІ, палітычны аналітык, навуковы супрацоўнік Цэнтра сацыяльна-філасофскіх і антрапалагічных даследаванняў Інстытута філасофіі НАН Беларусі.**

**— Звычайна нашы палітычныя партыі актывізуюцца толькі напярэдадні выбараў. Але гэтага, вядома, не хапае, каб выбаршчык мог правільна ацаніць іх працу. Якую адзнаку вы паставілі б ім сёлета?**

— Я стаўлю палітычным партыям нездавальняючую адзнаку, таму што больш чым на 18 тысяч месцаў у мясцовыя Саветы дэпутатаў усе разам палітычныя партыі вылучылі каля тысячы кандыдатаў. Гэта



sputnik.by

значыць, палітычныя партыі як інстытут не здолелі нават 10 % акруг закрыць уласнымі кандыдатамі. Што кажа аб глыбокім крызісе гэтага інстытута ў нашай дзяржаве і яго нездавальняючым функцыянаванні. Палітычныя партыі сёння ў цэлым неактыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці. Найбольшую колькасць кандыдатаў вылучылі Камуністычная партыя Беларусі і Ліберальна-дэмакратычная партыя. Але для 18 тысяч месцаў лічбы несур'ёзныя. І гэта нягледзячы на тое, што для палітычных партый вылучэнне кандыдатаў мае найбольш простую форму, лёгкую ў плане юрыдычнай працэдуры.

> Калі ты дэпутат пасялковага, сельскага, гар- або райсавета, то павінен удзельнічаць у грамадскім жыцці, каб пра цябе пісалі ў газетах, паказвалі па мясцовым тэлебачанні.

**— Мясцовыя выбары важныя для таго, каб электарат змог ацаніць працу дэпутата, каб вылучэнец у кантакце з грамадзянамі здолеў даказаць важнасць прыярытэтаў сваёй партыі, заваяваць давер. Пры плённай працы ў далейшым выбаршчыкі, магчыма, прагаласуюць за гэтую ж партыю на парламенцкіх выбарах. Але на практыцы атрымліваецца, што партыі ў гэтым нек не зацікаўлены?..**

— Цікава, што ў 2016 годзе Інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі Прэзідэнта рабіў апытанне напярэдадні парламенцкіх выбараў. Сярод палітычных чаканняў адно з першых месцаў у беларусаў заняло якраз павелічэнне ролі партый, узмацненне іх уплыву як інстытута. Аднак, каб партыі задаволілі гэты запыт, неабходна ўдасканальвацца.

Паступовы сацыяльны калідор, які павінен фарміравацца ад дэпутатаў пярвічнага ўзроўню і да — у перспектыве — дэпутатаў парламента, будзе існаваць толькі ў рамках моцных партыйных структур. Але многія дзеячы чамусьці лічаць: навошта турбавацца сябе мясцовымі выбарамі, калі можна адразу ісці на парламенцкія?

**— Шторaз на мясцовых выбарах назіраецца невысокая яўка. Але сёлета, напрыклад, была распрацавана мабільная праграма, накіраваная на прыцягненне моладзі на ўдзел 18 лютага. Як вы ацэніце працу з выбаршчыкамі?**

— Выкарыстанне сёння розных сродкаў для таго, каб выбаршчыкі прыйшлі на ўчасткі для галасавання, вядома, трэба вітаць. Але неабходна разумець, што рэсурс інфармацыйна-агітацыйнай кампаніі па прыцягненні людзей не павінен абапірацца толькі на Цэнтральную выбарчую камісію. Нам зноў жа неабходна гаварыць пра кандыдатаў, палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі, якія, дарэчы, і павінны стымуляваць яўку. Без актыўнасці гэтых інстытутаў ЦВК не зможа арганізаваць цікавасць да выбарчай кампаніі.

**— Летась мы праводзілі апытанне на тэму, ці ведаюць грамадзяне свайго дэпутата. У большасці выпадкаў аказалася, што не, хоць ішоў ужо чацвёрты год склікання. Як не дапусціць такой сітуацыі ў далейшым?**

— Першае — удзельнічаць у інфармацыйнай прасторы сваёй акругі. Калі ты дэпутат пасялковага, сельскага, гар- або райсавета, то павінен удзельнічаць у грамадскім жыцці, каб пра цябе пісалі ў газетах, паказвалі па мясцовым тэлебачанні. Калі гэтага не будзе, то, як той казаў, цябе не будзе. Другі фактар — тое, чаго не хапае, — грамадскія прыёмныя дэпутатаў. Дэпутата абіраюць грамадзяне, яны хочуць, каб ён быў правадніком, сувязным звяном паміж выканаўчай уладай і грамадзянамі. Калі дэпутаты не будуць гэта рабіць, пра іх ніхто не будзе ведаць. Сёння, на жаль, многія задаюцца пытаннем: навошта патрэбныя мясцовыя Саветы? А гэта звязана з тым негатыўным перажыткам, калі дэпутаты «як бы» выбіраліся, але ніхто пра іх не ведаў. Такую сітуацыю можна пераадолець толькі пры іншых формах правядзення самых абраннікаў: актыўным удзеле ў жыцці акругі, сувязі з выбаршчыкамі, пастаяннай працы грамадскіх прыёмных, інфармацыйнай і грамадскай дзейнасці.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

КАМПЕТЭНТНА

## Ала БОДАК:

# «ЗАКАНАДАЎЧЫ МЕХАНІЗМ АДПРАЦАВАНЫ ДОБРА»

### Сенатар пра выбарчае заканадаўства, ролю мясцовай улады і кампетэнцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў

**НЕМАЛАВАЖНУЮ ролю ў працэсе выбараў адыгрываюць законы, якія іх рэгулююць. Пра асаблівасці гэтай сферы «МС» напярэдадні сёлетняй кампаніі па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў расказала Ала БОДАК, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.**

**— На ваш погляд, якую ролю на сучасным этапе адыгрываюць мясцовыя Саветы і, адпаведна, выбары дэпутатаў?**

— Моцная і разам з тым дэмакратычная ўлада немагчымая без дзейснай і эфектыўнай сістэмы мясцовага самакіравання, якая дазваляе грамадзянам непасрэдна ўдзельнічаць у кіраванні грамадскімі справамі, у вырашэнні эканамічных і сацыяльных праблем на месцах.

Дзякуючы традыцыі, якая склалася за многія дзесяцігоддзі, мясцовыя Саветы дэпутатаў і сёння з'яўляюцца асноўным звяном сістэмы мясцовага самакіравання ў нашай дзяржаве, забяспечваюць сувязь народа з уладнымі структурамі, далучаюць грамадзян у актыўнае дзяржаўнае будаўніцтва, ажыццяўляюць кантроль за дзейнасцю органаў дзяржаўнай улады.

> Важнай гарантыяй працоўных правоў дэпутата Савета з'яўляецца тое, што ў перыяд ажыццяўлення сваіх паўнамоцтваў ён не можа быць звольнены па ініцыятыве наймальніка, без папярэдняй згоды Савета.

**— Хто можа вылучацца кандыдатам у дэпутаты?**

— Насамрэч любы грамадзянін, які дасягнуў 18 гадоў і жадае паспрабаваць сябе ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва, які мае канкрэтныя ініцыятывы па паляпшэнні жыцця на сваёй канкрэтнай тэрыторыі і магчымасць рэалізаваць іх. Прычым дэпутатам Савета могуць быць не толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь, але і грамадзяне Расійскай Федэрацыі, якія пастаянна пражываюць у нашай краіне.

Галоўнае, што павінна аб'ядноўваць людзей, якія на цяперашніх выбарах абяруць у мясцовыя Саветы дэпутатаў, — гэта жаданне на працягу ўсяго тэрміну сваіх паўнамоцтваў, які складае чатыры гады, дзейсна вырашаць галоўную задачу мясцовага самакіравання — забяспечваць сацыяльны камфорт кожнаму члену грамадства.

Неабходна мець на ўвазе, што ўвесь гэты перыяд дэпутат Савета ажыццяўляе свае паўнамоцтвы без адрыву ад асноўнай працоўнай (службовай) дзейнасці (за выключэннем старшыні Савета). Таму можна сказаць, што шмат у чым праца дэпутата падзвіжніцкая, альтруістычная і пры гэтым складаная і адказная.

**— Што стварае заканадаўчы падмурак для работы дэпутатаў мясцовых Саветаў?**

— Дзейнасць Саветаў і іх дэпутатаў рэгулюецца Законамі Рэспублікі Беларусь ад 27 сакавіка 1992 года «Аб статусе дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў» і ад 4 студзеня 2010 года «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь».

Важна разумець, што кампетэнцыя Савета дэпутатаў строга вызначана Законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» і датычыцца найшырэйшага спектра грамадскіх стасункаў. Пры гэтым ёсць паўнамоцтвы, якія адносяцца да выключнай кампетэнцыі Саветаў, гэта значыць тыя, якімі больш ніхто ў краіне не валодае.

**— Якія гэта паўнамоцтвы?**

— У рамках выключнай кампетэнцыі Саветы зацвярджаюць праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, мясцовы бюджэт і справаздачу аб яго выкананні; вызначаюць парадак кіравання і распараджэння ўласнасцю гэтай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі; устанаўліваюць мясцовыя падаткі і зборы; прызначаюць мясцовыя рэферэндумы.

Зацвярджаючы мясцовы бюджэт Мінска, раёна, вобласці адпаведны Савет дэпутатаў вызначае даходную і расходную часткі бюджэту, пералік дзяржаўных праграм і падпраграм, фінансаванне якіх прадугледжваецца за кошт сродкаў бюджэту, выдаткі на фінансаванне мерапрыемстваў у галіне аховы навакольнага асяроддзя, на фінансаванне інвестыцыйнай праграмы і інш.


Фота БЕЛТА.

Практыка паказала, што найбольш распаўсюджанымі прыкладамі мясцовых падаткаў і збораў з'яўляюцца падатак за валоданне сабакамі, збор з нарыхтоўшчыкаў і курортны збор. Пры гэтым калі, напрыклад, падатак за валоданне сабакамі ўстаноўлены на тэрыторыі ўсіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, то курортны збор — на тых тэрыторыях, дзе размешчаны санаторна-курортныя арганізацыі, прафілакторыі, аздараўленчыя цэнтры (комплексы) і лагеры, дамы і базы адпачынку, пансіянаты.

Саветы ў межах сваёй кампетэнцыі зацвярджаюць прагнозы сацыяльна-эканамічнага развіцця адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, рэгіянальныя комплексы мерапрыемстваў, канцэпцыі і планы мерапрыемстваў па пытаннях жыллёвага будаўніцтва, добраўпарадкавання, аховы здароўя, адукацыі і па іншых пытаннях мясцовага значэння, ажыццяўляюць кантроль за іх рэалізацыяй і зацвярджаюць справаздачы аб іх выкананні.

Досыць актыўна Саветы карыстаюцца правам вызвалення льгот па рэспубліканскіх падатках і зборах (пошлінах), якія поўнасцю выплачваюцца ў мясцовыя бюджэты, а таксама вызначэння ставак плацяжоў.

Гэта не ўсе паўнамоцтвы, якія дадзены Саветам дэпутатаў. Агульная кампетэнцыя Саветаў замацавана ў артыкуле 17 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», а асаблівасці кампетэнцыі Саветаў абласнога, базавага і пярвічнага тэрытарыяльных узроўняў — адпаведна ў артыкулах 18—20 гэтага Закона.

Акрамя таго, Саветы пярвічнага ўзроўню, напрыклад, у межах сваёй кампетэнцыі ўносяць у Савет і выканаўчы камітэт базавага ўзроўню прапановы па сацыяльнай абароне грамадзян; у Савет базавага ўзроўню — аб памерах адлічэнняў ад мясцовых падаткаў і збораў, сумах датацый у бюджэты пярвічнага ўзроўню, ажыццяўляюць кантроль за дзейнасцю органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання і інш.

**— Прывядзіце, калі ласка, прыклады.**

— Іх насамрэч нямала. Напрыклад, Гомельскі гарадскі Савет дэпутатаў вызваліў ад выплаты рэспубліканскіх падаткаў і збораў, якія цалкам выплачваюцца ў гарадскі бюджэт, навукова-тэхналагічныя паркі, цэнтры трансферу тэхналогій, рэзідэнтаў навукова-тэхналагічных паркаў.

Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў устанавіў штомесячныя даплаты да пенсій інвалідам Вялікай Айчыннай вайны ў памеры адной мінімальнай пенсіі па ўзросце, да сацыяльных пенсій дзецям-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў — 150 % мінімальнай пенсіі па ўзросце, штомесячныя выплаты дзецям з сем'яў, у якіх нарадзілася і выхоўваецца трое і больш дзяцей, — у памеры адной базавай велічыні на кожнае дзіця. Таксама Саветам устаноўлены штомесячныя даплаты да тарыфных ставак (акладаў) работнікаў устаноў адукацыі, арганізацый фізічнай культуры і спорту і арганізацый аховы здароўя.

Браслаўскі раённы Савет дэпутатаў устанавіў, што 100 % курортнага збору па аб'ектах абкладання, што знаходзяцца на тэрыторыі сельсаветаў, адлічваюцца ў бюджэты гэтых сельсаветаў.

**— Якія паўнамоцтвы мае непасрэдна сам дэпутат?**

— Дэпутат мае права прапаноўваць пытанні для разгляду Саветам і яго органамі, удзельнічаць у абмеркаванні пытанняў, задаваць іх, даваць тлумачэнні, давадзіць да ведама дэпутатаў Савета сваё меркаванне і меркаванне выбаршчыкаў, агучваць звароты грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць грамадскае значэнне, і г. д. Прапановы і заўвагі дэпутата Савета, унесеныя ім на сесіі Савета, могуць накіроўвацца Саветам або яго органамі на разгляд дзяржаўным органам, іншым арганізацыям або службовым асобам, якія не пазней чым у месячны тэрмін абавязаны разгледзець іх і паведаміць аб выніках непасрэдна дэпутату, старшыні або прэзідыуму Савета.

> Можна сказаць, што шмат у чым праца дэпутата падзвіжніцкая, альтруістычная і пры гэтым складаная і адказная.

Акрамя таго, дэпутат мае права ўдзельнічаць з правам дарадчага голасу ў рабоце сесій іншых Саветаў і пасяджэннях іх органаў пры прыняцці імі рашэнняў, якія закранаюць інтарэсы грамадзян, што пражываюць на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, у склад Савета якой ён абраны.

Вельмі важнымі асабістымі паўнамоцтвамі дэпутата з'яўляюцца яго запыт і зварот, якія накіроўваюцца дзяржаўным органам, іншым арганізацыям або службовым асобам.

Дэпутаты мясцовых Саветаў маюць права ўдзельнічаць у праверках работы дзяржаўных органаў і арганізацый, размешчаных на падведамаснай Савету тэрыторыі.

**— Гэта тое, што датычыцца стасункаў дэпутата і дзяржаўнай улады. А якая сітуацыя з выбаршчыкамі?**

— Галоўным паўнамоцтвам тут можна ўмоўна назваць разгляд дэпутатам Савета зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб, а таксама асабісты прыём грамадзян, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб, які ажыццяўляецца не радзей за адзін раз на месяц.

У мэтах інфармавання выбаршчыкаў аб сваёй дзейнасці, вывучэння грамадскай думкі, патрэб насельніцтва дэпутат Савета па сваёй ініцыятыве, ініцыятыве грамадзян або мясцовага выканаўчага і распарадчага органа праводзіць сустрэчы з грамадзянамі. Не радзей як два разы на год ён абавязаны даваць справаздачу перад выбаршчыкамі аб сваёй дзейнасці і ходзе выканання перадвыбарнай праграмы, а таксама аб рабоце Савета дэпутатаў і яго органаў.

Пры гэтым дэпутат Савета мае пераважнае права выступаць па пытаннях сваёй дзейнасці ў сродках масавай інфармацыі, заснаваных Саветам, а матэрыялы, якія прадстаўляюцца дэпутатам Савета па даручэнні Савета і яго органаў, падлягаюць абавязковаму апублікаванню.

**— Ці ёсць у дэпутата зарплата?**

— У сувязі з тым, што дэпутаты мясцовых Саветаў ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы без адрыву ад сваёй асноўнай працы, на час падрыхтоўкі і правядзення сесій Савета і пасяджэнняў яго органаў дэпутат Савета вызваляецца ад выканання працоўных (службовых) абавязкаў з захаваннем за ім сярэдняй заработнай платы (грашовага забеспячэння).

Акрамя таго, для ажыццяўлення дзейнасці ў выбарчай акрузе дэпутат Савета вызваляецца ад выканання працоўных (службовых) абавязкаў (але не больш чым на адзін дзень у месяц) па яго заяве па месцы працы (службы) з захаваннем сярэдняй заработнай платы (грашовага забеспячэння). Дадзеная гарантыя была забяспечана дэпутатам у 2014 годзе па ініцыятыве Савета Рэспублікі. У выпадку выезду дэпутата Савета для ажыццяўлення сваёй дзейнасці ў Савеце, выбарчай акрузе за межы месца жыхарства (раёна, горада) яму кампенсуюцца расходы па нормах пакрыцця расходаў пры службовых камандзіроўках.

Важнай гарантыяй працоўных правоў дэпутата Савета з'яўляецца тое, што ў перыяд ажыццяўлення сваіх паўнамоцтваў ён не можа быць звольнены па ініцыятыве наймальніка, выключаны з установы адукацыі без папярэдняй згоды Савета.

У нашай краіне створаны ўвесь заканадаўчы механізм, які вызначае паўнамоцтвы дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў і дазваляе яму іх рэалізоўваць. Праца ў органах мясцовага самакіравання можа і павінна спрыяць механізмам адбору энергічных кіраўнікоў, якія ведаюць рэальныя праблемы насельніцтва і прадэманстравалі здольнасць эфектыўна іх вырашаць.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# ЧАТЫРЫ СКЛІКАННІ — ГЭТА НЕ ЖАРТЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Некаторыя ішлі менавіта як да начальніка ўпраўлення МНС, бо ўздымалі пытанні бяспекі пражывання ў асобных дамах, паказвалі на парушэнні. І мы, вядома, неадкладна рэагавалі. Яшчэ хацелася б сказаць словы ўдзячнасці асобным пажылым выбаршчыкам, якія прыходзілі не прасіць нешта для сябе, а выказвалі заклапочанасць выхаваннем моладзі. Людзі разважалі аб тым, які ўплыў на дзяцей аказваюць сучаснае тэлебачанне ды інтэрнэт, яны прапаноўвалі ачысціць сродкі інфармацыі ад сцэн гвалту і крывапраліцця. Даводзілася тлумачыць, што абласны Савет пры ўсім жаданні не можа вырашыць гэтыя пытанні, а вось улічваць пазіцыю старэйшага пакалення, агучваць яе пры кожным зручным выпадку, каб неяк уплываць на фарміраванне грамадскай думкі, дэпутат можа.

***— Якія праблемы ў акрузе альбо горадзе ўдалося вырашыць і сёння можна запісаць гэта ў ваш дэпутацкі актыў?***

— Яшчэ падчас першага майго склікання давялося займацца аб'ектам, які пагражаў экалогіі мікрараёна. На тэрыторыі акругі быў такі сумна вядомы ўчастак, яго ў народзе называлі «Міцькі». Пра гэта мне людзі нагадвалі яшчэ ў час першай перадвыбарнай кампаніі. Там доўга размяшчаўся склад ядахімікатаў, у якіх скончыўся тэрмін захоўвання. Жыхары літаральна патрабавалі прыбраць гэты склад. У іх, у прыватным сектары, вада стала непрыгоднай для піцця. Пробы з калодзежаў і калонак паказвалі наяўнасць шкодных рэчываў. Гаспадары баяліся нават агароды паліваць такой вадой. Склад знаходзіўся ў былым ваенным капаніры з савецкіх часоў. Сцены ў пабудовы трывалыя, а падлогі там не было, вось гэтыя небяспечныя рэчывы і прасочваліся ў зямлю.

Пытанне адразу ўзнялі на сесіі, потым разгледзелі на пасяджэнні аблвыканкама. Пасля прыняцця адпаведных рашэнняў былі выдзелены сродкі, выраблена каштарысная дакументацыя. Пасля чаго за работу ўзяліся супрацоўнікі МНС. Выгружалі ўсё ўручную, бо капанір вузкі, з тэхнікай туды не ўлезеш. 390 тон ядахімікатаў выгрузілі і адправілі на перапрацоўчае прадпрыемства ў Гомельскую вобласць. Цяпер у тых Міцьках чыстая тэрыторыя. Пробы праводзілі не раз.

А рашэнні, прынятыя тады сесіяй і выканкамам, датычыліся ўсёй вобласці. Бо падобныя, але значна меншыя па памерах, пункты захоўвання гербіцыдаў знаходзіліся яшчэ ў Драгічынскім, Маларыцкім раёнах. Усе яны былі ліквідаваныя.

З абмеркавання на сесіі пачалося і вырашэнне важнага для абласнога цэнтра пытання будаўніцтва яшчэ аднаго пажарнага дэпо. Брэст імкліва расце ў паўднёва-заходнім кірунку. І ўвесь гэты гарадскі масіў з некалькіх мікрараёнаў, які неафіцыйна называюць Зарэчным раёнам, патрабуе асобнай пажарнай часці. У цяперашніх умовах інтэнсіўнага руху і затораў на дарогах становіцца цяжка, а то і немагчыма вытрымліваць нарматыўныя хвіліны ад выкліку да прыбыцця баявога разліку. А гэта датычыцца бяспекі, часам і жыцця людзей. Таму прынцыпова пытанне было вырашана даўно, гадоў пяць таму выраблена праектна-каштарысная дакументацыя, але пачатак работ адкладваўся з-за адсутнасці фінансавання. Тут варта сказаць словы ўдзячнасці і дэпутатам парламента ад нашых акруг і асабліва старшыні Савета Рэспублікі Міхаілу Мясніковічу, які паспрыяў уключэнню названага аб'екта ў план. Такім чынам, грошы з рэспубліканскага бюджэту выдзелены і ўжо ў гэтым месяцы плануецца пачаць работы па падрыхтоўцы будаўнічай пляцоўкі.

Дэпутаты ўсіх узроўняў таксама прыклалі пэўныя намаганні, каб забяспечыць Брэст самым сучасным выратавальным абсталяваннем. І сёння мы маем у горадзе аўталесвіцу вышынёй 54 метры нямецкай вытворчасці, што вельмі важна для падтрымання бяспекі ў шматлікіх будоўлях. Ды і жылыя дамы ў 20 паверхаў у горадзе ёсць.



Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

***— З прыведзеных прыкладаў можна зрабіць выснову, што на працягу ўсіх сваіх скліканняў вы лабіравалі пытанні бяспекі пражывання, працы, адпачынку.***

— Вядома. Гэтак робяць і іншыя дэпутаты. Калі хто прадстаўляе культурную галіну, значыць, і адстойвае інтарэсы культуры, дактары дбаюць пра ўзровень аховы здароўя, настаўнікі клапоцяцца пра адукацыю. Я і ў Савеце заставаўся начальнікам упраўлення МНС, і на кожнай выязной сесіі, па якіх бы праблемах яны ні праводзіліся, звяртаў увагу найперш на свае пытанні. Бо бяспека і захаванне жыцця, пагадзіцеся, важней за ўсё. Потым ужо можна вырашаць эканамічныя і сацыяльныя праблемы.

***— Выязныя сесіі сталі асноўнай формай работы дэпутатаў абласнога Савета. Якая іх эфектыўнасць, на ваш погляд? Што карыснага яны даюць народным абраннікам і гаспадарам тэрыторый, дзе праводзяцца?***

— З тым, што сесію трэба праводзіць у раёне, у сельсавеце, а не цалкам у зале пасяджэнняў, думаю, згодны кожны дэпутат. І зноў жа я за сваё, бо ёсць нагода. Адной з самых цікавых ды змястоўных сесій падчас 27-га склікання стаў разгляд пытанняў па сістэме навучання насельніцтва асновам бяспекі жыццядзейнасці. Сесія прайшла на тэрыторыі Камянюцкага сельсавета Камянецкага раёна. Вядома, пры падрыхтоўцы сесіі нашы работнікі не проста прынялі актыўны ўдзел, яны правялі асноўную работу. Таму дэпутатам і шматлікім гасцям было паказана, як праходзіць навучанне ўсіх катэгорый насельніцтва, пачынаючы з дзіцячага садка, потым — школа, працоўны калектыў прамысловага прадпрыемства, установы, далей — работа з камісіяй сельскага Савета, тут жа — роля сельскага сходу.

Потым падчас абмеркавання мы пачулі водгукі старшынь раённых, сельскіх Саветаў: яны гаварылі, што многае возьмуць для работы ў сваіх рэгіёнах. І гэта, лічу, галоўны вынік сесіі.

Можна з кожнага перыяду ці склікання згадваць памятныя, цікавыя, рэзанансныя сесіі. Скажам, у папярэднія гады ў план уключылі форум па падрыхтоўцы пляжаў на вадаёмах да купальнага сезона. Усе ведалі, што будзе праводзіцца сесія, але ніхто не ведаў, у якім раёне, у якім месцы. Значыць, рыхтаваліся ўсе. У дзень сесіі мы аб'ехалі шэраг пляжаў у Бярозаўскім, Івацэвіцкім, Баранавіцкім раёнах. Убачаным у асноўным засталіся задаволеныя. Такім чынам, сесія абласнога Савета падштурхнула раённыя ўлады больш уважліва падысці да адзначанага пытання, выправіць хібы там, дзе яны былі.

Па пытаннях добраўпарадкавання тэрыторый дэпутацкія форумы праходзяць пастаянна. Запомнілася, як мы знаёміліся з работай на прыкладзе Пінска. У горадзе вельмі многае зроблена ў гэтым кірунку, умела выкарыстоўваецца грамадская ініцыятыва. Працуюць органы дваравога, вулічнага самакіравання. Як, дарэчы, і ў Баранавічах. І там мы вывучалі вопыт. Гэта было карысна і цікава ўсім. Тым больш што людзі даволі часта звяртаюцца да дэпутата па пытаннях добраўпарадкавання.

***— Прагучалі цікавыя прыклады розных падыходаў да вырашэння задач. А што непакоіць вас як дэпутата са стажам, што застаецца і сёння нявырашаным?***

— Тое, аб чым не раз гаварылася на сесіях, на пасяджэннях прэзідыума і камісій: і ў гарадах нашых, і ў вёсках яшчэ многа людзей вядзе асацыяльны лад жыцця. Здараецца, працаздольныя сядзяць на шыі ў бацькоў ці іншых сямейнікаў, а то і ўяўляюць сабой пэўную пагрозу для навакольных. У сельсаветах і іншых структурах існуюць адпаведныя камісіі, праз іх імкнёмся выхоўваць, уздзейнічаць праз грамадскія структуры. І гэта трэба рабіць, нават калі перавыхаванню паддаецца адзін са ста. На жаль, выпраўляюцца нямногія... Дастаткова паглядзець нашы зводкі: нецвярозы грамадзянін закурыў, заснуў, справакаваў пажар. Людзі гінуць, застаюцца без жылля, маёмасці. Атрымліваецца, не ўсё мы зрабілі для выхавання суайчыннікаў і паляпшэння грамадскай маралі — значыць, трэба шукаць новыя падыходы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Отчет местного благотворительного Фонда «Возрождение Свято-Вознесенской церкви» об использовании своего имущества за 2017 год**

Местный благотворительный Фонд «Возрождение Свято-Вознесенской церкви» информирует о продолжении своей деятельности согласно Уставу по адресу: Могилевская область, Мстиславский район, аг. Мазолово, ул. Центральная, д. 12.

1. Учредители фонда: Кириленко В. П., Иванкович Т. И., Стаховская И. О., Аврамчик Н. А., Сведомская Т. Ю., Шеладубова З. И., Лапуденко В. П., Чепикова А. В., Антюхова Н. П., Куксовский В. В.

2. Информация о стоимости имущества фонда:

– имущество, переданное учредителями фонда, – 1500,00 белорусского рубля;

– доходы, полученные от добровольных взносов и пожертвований граждан и организаций, – 10 483,42 белорусского рубля;

– доходы от предпринимательской деятельности, осуществляемой в порядке, предусмотренном действующим законодательством, – нет;

– остаток денежных средств на 01.01.2018 года – 5510,02 белорусского рубля.

3. Информация об общей сумме расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе:

– расходы фонда, не запрещенные законодательством Республики Беларусь, – 13 188,73 белорусского рубля.

4. Фонд не является учредителем унитарных предприятий, хозяйственных обществ и не участвует в создании других юридических лиц.

УНП 790613142

**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении конкурса**

Лепельский районный исполнительный комитет **23 марта 2018 года** в 15.00 в здании Лепельского райисполкома (каб. 220), расположенного по адресу: г. Лепель, ул. Ленинская, 6, проводит торги в виде конкурса по предоставлению в аренду охотничьих угодий фонда запаса, расположенных на территории Лепельского района, сроком на 10 лет. Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке проведения торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий фонда запаса, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 20.01.2015 г. № 26. На торги выставляются охотничьи угодья общей площадью 40480,29 га, в том числе лесные 22625,90 га, полевые 16302,82 га, водно-болотные 1551,57 га.

Участок имеет следующие границы:

северная: от д. Черноручье по автомобильной дороге до д. Большой Полсвиж, далее по автомобильной дороге до д. Поддубье, далее от д. Поддубье по автомобильной дороге на д. Шубники до ее пересечения с ЛЭП 35 кв., далее вдоль восточной стороны ЛЭП 35 кв. до д. Залесье, далее от д. Залесье вдоль ЛЭП 35 кв. до пересечения с железной дорогой (Лепель – Орша), далее по железной дороге Лепель – Орша до д. Даниловка;

восточная: по западной стороне д. Даниловка на юг до кв.1 Волосовичского лесничества ГЛХУ «Лепельский лесхоз», далее по западной границе кв. 1 Волосовичского лесничества, далее по восточным границам выд.12, 32, 36, 41, 44, 46 кв. 2 Волосовичского лесничества, далее по восточным границам выд. 6, 28, 12, 17 кв. 9 Волосовичского лесничества, далее по западным границам выд. 7, 9 кв. 98 Волосовичского лесничества, далее по восточным границам выд. 4, 5, 3, 26, 27 кв. 98 Волосовичского лесничества, далее по восточным границам выд. 5, 34, 25, 26, 27, 28 кв. 10 Волосовичского лесничества до мелиоративного канала, далее по данному каналу до северо-восточного угла выд. 5 кв. 91 Волосовичского лесничества, на восток до д. Деревня, далее по лесной дороге до д. Деревня до северо-западного угла кв. 137 Кащинского лесничества, далее до северо-восточного угла кв. 137 Кащинского лесничества, далее по восточной границе оз. Турицкое до юго-восточного угла кв. 137 Кащинского лесничества;

южная: от юго-восточного угла кв. 137 Кащинского лесничества по административной границе района, далее по южной границе кв. 53, 52, 51 Волосовичского лесничества до д. Липки, далее по южной границе кв. 77, 76 Волосовичского лесничества, по северной стороне кв. 20 до кв. 19 Краснолукского лесничества, далее по восточной стороне кв. 19, и северо-восточной стороне кв. 14, по восточной стороне кв. 4 Краснолукского лесничества до кв. 75 Волосовичского лесничества, далее по южной границе кв. 80, 85, 84 Волосовичского лесничества до реки Байна, далее по р. Байна до юго-западного угла кв. 134 Слободского лесничества, далее на юг через кв. 5, 6, 24 Краснолукского лесничества до р. Эсса, далее на запад по административной границе района через кв. 44, 45, 39, 38, 43, 49, 42, 37, 31, 36 через кв. 47, 46 по р. Юровка Слободского лесничества до юго-западного угла кв. 46 Слободского лесничества;

западная: от юго-западного угла кв. 46 Слободского лесничества на север по западной стороне кв. 46, 40, 41, 35, 29, 22, 14, 12, 8, 4, 1 Слободского лесничества до северо-западного угла кв. 1 Слободского лесничества, далее от северо-западного угла кв. 1 Слободского лесничества по автомобильной дороге Минск – Витебск (М3) до поворота на д. Черноручье.

Сумма ежегодной арендной платы за предоставляемые в аренду охотничьи угодья составляет: **3982 рублей 17 копеек.**

**Условия конкурса:**

1. Наличие или создание в течение 2 лет после заключения договора аренды охотничьих угодий в границах охотничьих угодий материально-технической базы, включающей строительство или приобретение:

– дома охотника, обеспечивающего одновременное размещение не менее 10 человек,

– бани,

– стоянки для автомобилей,

– вольера для содержания собак,

– места разделки добытых животных, оборудованного морозильной камерой.

2. Обустройство в охотничьих угодьях в течение 3 месяцев с момента заключения договора аренды охотничьих угодий скотомогильника.

3. Обустройство в охотничьих угодьях в течение 1 года с момента заключения договора аренды охотничьих угодий:

– не менее 2 мест отдыха (беседка, кострище, место для сбора мусора),

– подкормочных площадок для охотничьих животных, кормохранилищ, в соответствии с требованиями Инструкции о порядке проведения биотехнических мероприятий, утвержденной постановлением Министерства лесного хозяйства от 16.05.2014 № 9.

4. Укомплектование в течение 2 месяцев после заключения договора аренды охотничьих угодий штата специалистов, согласно биолого-экономическому обоснованию.

5. Достижение оптимальной численности охотничьих животных нормированных видов в течение 8 лет с момента заключения договора аренды охотничьих угодий.

6. Вселение в охотничьи угодья оленя благородного в количестве не менее 20 особей в течение 2 лет после заключения договора аренды охотничьих угодий.

7. Предложения по осуществлению иных мероприятий, направленных на развитие охотничьего хозяйства, в том числе вложение инвестиций на развитие охотничьего хозяйства, которые будут использованы для развития инфраструктуры охотхозяйства.

Юридические лица для участия в торгах вносят задаток, который составляет 20 % от суммы ежегодной арендной платы в размере **796 рублей 43 копейки**. Задаток вносится на счет: ***BY68 AKBB 3604 3190 0102 5210 0000, в ЦБУ № 211 ф-ла 214 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21214 УНП300039625, ОКПО 040626632000.***

Участник, выигравший торги, в течение 5 дней с момента подписания протокола проведения торгов возмещает затраты на организацию и проведение торгов. Сумма затрат и порядок возмещения доводятся в день подписания протокола.

Для участия в торгах предоставляется заявление, в котором указываются сведения об охотничьих угодьях, которые данные участники торгов желают получить в аренду по результатам торгов.

**К заявлению прилагаются:**

биолого-экономическое обоснование охотничьих угодий;

предложения в письменной форме о выполнении условий торгов, запечатанные в отдельном конверте. Данные предложения являются окончательными и не могут уточняться в ходе торгов;

копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка;

доверенность представителя участника торгов и копия документа, подтверждающего его личность, в случае если заявление подписывается не руководителем участника торгов, либо копия документа, подтверждающего полномочия руководителя участника торгов.

Заявление и приложенные к нему документы на участие в торгах подаются заинтересованными юридическими лицами не позднее 21 марта 2018 г. в Лепельский районный исполнительный комитет по адресу: г. Лепель, ул. Ленинская, 6, каб. 220. Контактный телефон 80213267022, факс 802132 41486.

Претенденты на участие в конкурсе с объектом конкурса знакомятся самостоятельно.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

# РУЛЬ БЕЗ ПРАВА ПЕРАДАЧЫ

**ЖАНЧЫНА-КІРАЎНІК і жанчына-кіроўца — ці лёгка сумяшчаць гэтыя няпростыя функцыі? Такую тэму ўзнялі ў адным з нядаўніх выпускаў «Мясцовага самакіравання» (гл. «Звязду» ад 12 студзеня г. г.) журналісты. Праблема актуальная не першы год, патрабуе пэўнага ўрэгулявання на дзяржаўным узроўні. Значную частку сельскіх Саветаў дэпутатаў краіны ўзначальваюць жанчыны, часам увогуле ў такім калектыве мужчын няма, а штатным раскладам пасада кіроўцы не прадугледжана.**
**На Уздзеншчыне, у прыватнасці, пад жаночым кіраўніцтвам тры з шасці органаў мясцовага самакіравання. Што думаюць наконт гэтага старшыні сельскіх Саветаў дэпутатаў — Таццяна ПРАКАЦЭНЬ (Слабадскі), Тамара ЛЯСНЕЎСКАЯ (Хатлянскі) і Таццяна ВІННІК (Дзешчанскі)?**

— Пасведчанне на права кіравання легкавым аўтамабілем я атрымала 35 гадоў таму, яшчэ падчас вучобы ў Мар'інагорскім саўгасе-тэхнікуме, — прыгадвае **кіроўца з найбольшым стажам Таццяна ПРАКАЦЭНЬ.** — Пасля



і ў час вучобы ў Гродзенскім сельгасінстытуце пераканалася, што без машыны працаваць спецыялістам у сельскай гаспадарцы будзе няпроста. Але першы ўласны, дакладней — сямейны, аўтамабіль з'явіўся толькі ў пачатку 90-х. Калі ж у 2000 годзе перавялі нас з Капыльскага раёна на Уздзеншчыну (муж стаў дырэктарам саўгаса «Гарадок», я — кіраўніком сельскага Савета), на практыцы сутыкнулася з тым, як цяжка без службовай машыны. Даводзілася дабірацца ў вёскі сельсавета і пешшу, і на веласіпедзе, і на кані, а часцей — на ўласным аўто. Толькі праз тры гады райвыканкам перадаў сельскаму Савету патрыманую «Волгу».

— Пяць гадоў таму па стане здароўя я вымушана была змяніць сталічную прапіску на жыццё ў вёсцы Ячанка, — расказвае **Таццяна ВІННІК.** — Пакуль наладзілася паў-



нацэннае жыццё ў вёсцы, часта даводзілася курсіраваць туды-сюды, таму і спатрэбіліся атрыманыя пяць гадоў да таго правы кіроўцы. Зразумела, не магу ўявіць сябе на цяперашняй пасадзе без чатырохколавага памочніка.

Службовая неабходнасць вымусіла сесці за руль і Тамару Ляснеўскую — пры яе ранейшай пасадзе таксама быў аўтамабіль, ды не было ў штаце кіроўцы. Пасля давадзілася пэўны час ездзіць на работу ў Мінск, а прамых транспартных зносін паміж Хатлянамі і сталіцай не было. Узначаліла сельскі Савет у 2011 годзе.

У кожным з названых сельсаветаў па некалькі дзесяткаў населеных пунктаў, адлегласць паміж некаторымі — звыш дваццаці кіламетраў. Але ж у распараджэнні сельвыканкамаў, як правіла, службовыя «Жыгулі», праўда, нярэдка са скончаным тэрмінам эксплуатацыі. Пры ўсёй павазе да тэхнікі расійскага аўтапрама ў параўнанні з сучаснымі «замежнікамі» яны вельмі няпростыя ў эксплуатацыі. Тут і руль без гідраўзмацняльніка, і капот з цяжкасцю адчыняецца, а дзверцамі некалькі разоў трэба стукнуць, каб зачыніліся, і пастаянна неабходна кантраляваць узровень алівы, тармазной вадкасці. Як спраўляцца з такімі абставінамі жанчыне?

— Не раз і не два ў маёй практыцы даводзілася спыняцца ў дарозе, — расказвае Таццяна Віннік. — Аднойчы парваўся сярод лесу тросік ручнога тармаза. Выклікала па мабільнай сувязі дапамогу з эксперыментальнай базы імя Катоўскага, прыехалі хлопцы, узялі на буксір, потым дапамаглі адрамантаваць. Прыватнікі не раз выручалі.

— А ў мяне быў такі выпадак, — дзеліцца ўспамінам **Тамара ЛЯСНЕЎСКАЯ.** — Каля вёскі Гута мінулай зімой загарэлася лямпачка, што сігналізуе аб разрадцы акумулятара. Думаю, як дабрацца дамоў, калі машына спыніцца? Потым, спакойна ацаніўшы сітуацыю, знайшла і прычыну няспраўнасці, і магчымасць яе ліквідаваць. Але неаднойчы дарожнікі з гурбаў дапамагалі выбірацца.



— На мінулы год з раённага бюджэту на абслугоўванне аўтамабіля выдзелілі нам чатыры тысячы рублёў, — разважае Таццяна Пракацэнь. — Сродкаў павінна было хапіць і на набыццё бензіну, і на запчасткі, і на рамонтныя работы. Зразумела, гэтага недастаткова.

Хто і як рамантуе жанчынам службовыя аўто? Па-рознаму. Самы распаўсюджаны метад — звяртацца да дапамогі мужоў, сыноў і іншых родзічаў. Іншы варыянт — добразычлівыя суседзі, звычайныя вяскоўцы, умельцы-аматары, з якімі перасякаешся па службовых справах. Яшчэ гадоў дваццаць таму даводзілася карыстацца паслугамі размешчаных на тэрыторыі сельсавета сельгаспрадпрыемстваў, але цяпер нярэдка і там адчуваюць дэфіцыт запчастак і сродкаў. Так што ўсё «завязана» на асабістых кантактах. Хтосьці з кіраўнікоў дазволіць бясплатна скарыстацца рамонтнай ямай, іншы выдзеліць кваліфікаванага слесара, зрэдку і тое-сёе з дробязных ці ўжываных запчастак перападзе...

**Не хапае кіраўнікам пярвічнага звяна ўлады ліміту прабегу ў 1900 кіламетраў, які выдзяляецца на месяц. Пасада такая, што вымушае амаль кожны дзень адмерваць да сотні, а то і больш кіламетраў, не выключаючы і выхадныя. Кожная са старшынь прызнаецца, што нярэдка выкарыстоўвае для гэтых мэт і ўласны аўтамабіль.**

Каб быць у курсе ўсіх спраў, падзей, што адбываюцца на падведамаснай тэрыторыі, апярэдзіць непажаданыя вынікі, лепш на месцы ва ўсім пераканацца на ўласныя вочы, даць чарговае даручэнне, праверыць ход выканання. Нават калі б і быў у штаце кіроўца, няёмка было б затрымліваць яго ў пазарабочы час, выклікаць у выхадны ці святочны дзень.

Яшчэ адна з праблем, з якой нярэдка сутыкаюцца жанчыны — кіраўнікі сельскіх Саветаў, — выкананне чыста мужчынскіх гаспадарча-бытавых функцый. А патрэба ў іх узнікае амаль штодзень: абкасіць падворак, ачысціць дарожку ад лёду, замяніць лямпачку, што перагарэла, ці дзвярны замок, адрамантаваць ножку ў крэсле, прыбіць цвік у шыферным лісце... Толькі апошнім часам у штаце Дзешчанскага сельвыканкама з'явіўся дворнік Аляксандр Жур, у Слабадскім гэтыя абавязкі выконвае Дзмітрый Санковіч. Але часцей за ўсё жанчынам-кіраўнікам даводзіцца арганізоўваць для выпраўлення сітуацыі суботнікі і выконваць работу сваімі ж жаночымі рукамі ці зноў жа прасіць дапамогі ў родзічаў, суседзяў, не забываючы пры гэтым і пра эканомію дзяржаўных сродкаў.

Здавалася б, мінуў час, калі жанчына і «каня на скаку спыніць, і ў палаючую хату зойдзе». Але і сёння, асабліва на кіруючых пасадах, яны паказваюць прыклады незвычайнай працавітасці і вынослівасці, ініцыятыўнасці і кемлівасці, эканоміі і ашчаднасці. Ды ўсё ж варта было б нейкім чынам аблегчыць іх працу. Магчыма, выдзеліць хоць бы паўстаўкі кіроўцы (слесара, рамонтніка...), дазволіць сумяшчальніцтва, павялічыць ліміт кіламетражу прабегу аўто, больш сродкаў акумуляваць у мясцовым бюджэце на яго патрэбы. Зразумела, гэта ў маштабах краіны патрабуе немалых фінансавых затрат. Але ж і функцыі пры гэтым выконваюцца дзяржаўныя...

**Віктар САБАЛЕЎСКІ.**


**Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Сосновая, аг. Слобода, ул. Зеленая (участок № 3), дер. Малое Залужье, дер. Прилепская Усяжка (участок № 2), дер. Мостище Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | 22 марта 2018 года, в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | Продавец и его адрес | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 – площадь 0,0794 га № 624883010101000567 дер. Сосновая<br>Лот № 2 – площадь 0,1440 га № 624883009601000916 аг. Слобода, ул. Зеленая (участок № 3)<br>Лот № 3 – площадь 0,1493 га № 624883006601000138 дер. Малое Залужье<br>Лот № 4 – площадь 0,1098 га № 624883008201000112 дер. Прилепская Усяжка (участок № 2)<br>Лот № 5 – площадь 0,1500 га № 624883007101000097 дер. Мостище |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома<br>(10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) |
| 7 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 – 25 000 рублей<br>Лот № 2 – 30 000 рублей<br>Лот № 3 – 10 000 рублей<br>Лот № 4 – 12 000 рублей<br>Лот № 5 – 15 000 рублей |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории страны;<br>В) без права предоставления рассрочки |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Дер. Сосновая – подъездные пути<br>аг. Слобода, ул. Зеленая (участок № 3) – подъездные пути<br>дер. Малое Залужье – отсутствуют<br>дер. Прилепская Усяжка (участок № 2) – подъездные пути<br>дер. Мостище – электроснабжение |
| 10 | Ограничения в использовании | Лот 3 – водоохранная зона реки Бараневка (площадь 0,1493 га) |
| 11 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 12 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10 % от начальной (стартовой) цены земельного участка<br>р/с BY50AKBB36410000006146200000 БИК AKBBBY21612 в филиале 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ 621 г. Смолевичи УНП 600046563 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 13 | Порядок предварит. ознак. в натуре с зем. участками | Среда в 10.00 |
| 14 | Прием документов | В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00<br>и с 14.00 до 17.00 |
| 15 | Окончательный срок приема документов | 16 марта 2018 года в 17.00 |
| 16 | Контактные телефоны | 8 01776 44-636, 68-030 |

Расходы по организации и проведению аукциона: лот 1 – 1702,45 руб., лот 2 – 1428,03 руб., лот 3 – 1623,87 руб., лот 4 – 1724,84 руб., лот 5 – 1521,84 руб. и публикация информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечание: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) и копию паспорта покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

3. Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 8 лютага 2018 года.**